# ПАСЛЯСІНАДАЛЬНАЯ
# АПОСТАЛЬСКАЯ АДГАРТАЦЫЯ
# *VERBUM DOMINI*
# СВЯТОГА АЙЦА
# БЭНЭДЫКТА XVI
# ДА БІСКУПАЎ, ДУХАВЕНСТВА,
# КАНСЭКРАВАНЫХ АСОБ
# І СВЕЦКІХ ВЕРНІКАЎ
# ПРА БОЖАЕ СЛОВА
# Ў ЖЫЦЦІ І МІСІІ КАСЦЁЛА

## УВОДЗІНЫ

1. «СЛОВА ПАНА трывае навекі. І гэтым словам ёсць Добрая Навіна, абвешчаная вам» (1 *П* 1, 25; пар. *Іс* 40, 8). Гэтыя словы з Першага паслання св. Пятра, нагадваючы словы прарока Ісаі, адкрываюць нам таямніцу Бога, які аб'яўляецца праз дар свайго Слова. Гэтае Слова, што трывае навекі, увайшло ў час. Бог сказаў сваё спрадвечнае Слова па-чалавечы; Яго Слова «сталася целам» (*Ян* 1, 14).

Вось, Добрая Навіна. Вось вестка, якая праз стагоддзі прыходзіць сёння да нас. XII Звычайны Агульны Сход Сіноду Біскупаў, які праходзіў у Ватыкане з 5 па 26 кастрычніка 2008 г., быў прысвечаны тэме «Слова Божае ў жыцці і місіі Касцёла». Гэта было глыбокім перажываннем сустрэчы з Хрыстом, Словам Айца, які ёсць там, дзе двое або трое збіраюцца ў Яго імя (пар. *Мц* 18, 20). Паслясінадальная апостальская адгартацыя з'яўляецца маім адказам на просьбу Айцоў Сіноду наблізіць усяму Божаму народу багатыя разважанні ватыканскай сустрэчы, а таксама парады, якія з'яўляюцца плёнам супольнай працы[1]. У сувязі з гэтым хачу згадаць дакументы, выпрацаваныя Сінодам: *Lineamenta*, *Instrumentum laboris*, справаздачы *ante* і *post disceptationem,* а таксама тэксты выступленняў, прачытаных ў зале, а таксама перададзеных *in scriptis*, справаздачы з прац у малых групах і іх дыскусіі, заключны Зварот да Божага народу, а менавіта некаторыя адмысловыя прапановы (*Propositiones*), якія Айцы палічылі асабліва важнымі. Жадаю такім чынам падаць некаторыя асноўныя прынцыпы адкрыцця наноў у жыцці Касцёла Божага слова, крыніцы няспыннага абнаўлення, выказваючы адначасова жаданне, каб яно ўсё больш станавілася сэрцам кожнай эклезіяльнай дзейнасці.

### *Каб радасць нашая была поўнай*

2. Найперш хацеў бы прыпомніць усім аб прывабнай прыгажосці абноўленай сустрэчы з Панам Езусам падчас сінадальнага Сходу. Таму, адказваючы таксама на пажаданні Айцоў, звяртаюся да ўсіх вернікаў словамі св. Яна з яго Першага

[1] Пар. *Propositio* 1.

паслання: «Абвяшчаем вам гэтае вечнае жыццё, якое было ў Айца і аб’явілася нам, - тое, што мы бачылі і чулі, абвяшчаем і вам, каб і вы мелі еднасць з намі. А нашая еднасць ёсць з Айцом і Сынам Ягоным, Езусам Хрыстом» (1, 2-3). Апостал кажа нам пра *слуханне, бачанне, датыканне і сузіранне* (пар. 1, 1) Слова Жыцця, бо Жыццё аб’явілася ў Хрысце. А мы, пакліканыя да еднасці з Богам і людзьмі, павінны быць вестунамі гэтага дару. У керыгматычным сэнсе сінадальны Сход быў для Касцёла і свету сведчаннем таго, якой прыгожай з’яўляецца сустрэча з Божым словам у эклезіяльнай супольнасці. Таму заахвочваю ўсіх адкрыць нанова асабістую і супольнасную сустрэчу з Хрыстом, Словам Жыцця, якое сталася бачным, і стаць Яго вестунамі, каб дар Божага жыцця - еднасць - пашыраўся ўсё больш ва ўсім свеце. Удзел у жыцці Бога, Тройцы Любові, дае «поўную радасць» (пар. *1 Ян* 1, 4). Неад’емны дар і заданне Касцёла - дзяліцца радасцю, якая нараджаецца з сустрэчы з Асобаю Хрыста, Божым Словам, прысутным сярод нас. У свеце, які часта лічыць Бога непатрэбным або чужым, мы - як і св. Пётр - вызнаём, што толькі Ён мае «словы жыцця вечнага» (*Ян* 6, 68). Не існуе больш важнай рэчы за магчымасць нанова наблізіць сённяшняга чалавека да Бога - да Бога, які прамаўляе і перадае нам сваю любоў, каб мы мелі жыццё ў дастатку (пар. *Ян* 10, 10).

*Ад «Dei Verbum» да Сіноду, прысвечанага Божаму слову*

3. Мы разумеем, што прысвячаючы XII Звычайны Агульны Сход Біскупаў Божаму слову, мы закранулі тэму, якая ў пэўным сэнсе з’яўляецца *сэрцам* хрысціянскага жыцця, і працягвае тэму папярэдняга сінадальнага Сходу: *Эўхарыстыя, крыніца і вяршыня жыцця і місіі Касцёла.* Фундамент Касцёла - Божае слова, з яго Касцёл нараджаецца і жыве ім[2]. Божы народ на працягу сваёй шматвяковай гісторыі заўсёды знаходзіў у ім сваю сілу. Таксама і сёння эклезіяльная супольнасць узрастае праз слуханне, цэлебрацыю і вывучэнне Божага слова. Трэба згадзіцца, што ў апошнія дзесяцігоддзі існавання Касцёла ўзрасла ўвага да гэтага пытання, асабліва адносна хрысціянскага Аб’яўлення, жывой Традыцыі і Святога Пісання. Можна сказаць, што, пачынаючы ад пантыфікату папы Льва XIII, памнажаліся захады дзеля паглыблення свядомасці наколькі важным з’яўляецца Божае слова і вывучэнне Бібліі ў жыцці Касцёла[3], а кульмінацыяй гэтага стаў Другі Ватыканскі Сабор, асаблівым сведчаннем чаго было абвяшчэнне Дагматычнай канстытуцыі пра Божае Аб’яўленне *Dei Verbum.* Яна ўяўляе сабой важную веху на шляху Касцёла: «Айцы Сіноду <...> з удзячнасцю прызнаюць вялікую карысць, якую прынёс для Касцёла гэты дакумент у экзэгетычным, тэалагічным, духоўным, пастрыскім і экуменічным сэнсе»[4]. Асабліва ўзрасло ў гэтыя гады разуменне «трынітарнай і гісторыка-збаўчай перспектывы

[2] Пар. XII COETUS GENERALIS ORDINARIUS SYNODI EPISCOPORUM, *Instrumentum laboris*, 27.
[3] Пар. LEO XIII, Litt. enc. *Providentissimus Deus* (18 Novembris 1893): *ASS* 26 (1893-94), 269-292; BENEDICTUS XV, Litt. enc. *Spiritus Paraclitus* (15 Septembris 1920): *AA*S 12 (1920), 385-422; PIUS XII, Litt. enc. *Divino afflante Spiritu* (30 Septembris 1943): *AAS* 35 (1943), 297-325.
[4] *Propositio* 2.

Аб’яўлення»[5], у якой Езуса Хрыста мы прызнаём «Пасрэднікам і паўнатою ўсяго Аб’яўлення»[6]. Касцёл нястомна абвяшчае кожнаму пакаленню, што Езус «усёй сваёй прысутнасцю і аб’яўленнем, словамі і справамі, знакамі і цудамі, асабліва сваёй смерцю і слаўным уваскрасеннем, паслаўшы, нарэшце, Духа праўды, здзяйсняе канчатковае Аб’яўленне»[7].

Усім вядома, які вялікі імпульс для адкрыцця нанова Божага слова ў жыцці Касцёла, для тэалагічных разважанняў на тэму Божага Аб’яўлення, а таксама для вывучэння Святога Пісання дала Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum*. Шматлікімі былі таксама за апошнія сорак гадоў выказванні Настаўніцкага Інстытута Касцёла па гэтых пытаннях[8]. Касцёл, усведамляючы, што надалей ідзе тым самым шляхам пад кіраўніцтвам Духа Святога, склікаў гэты Сінод, адчуваючы абавязак далейшага паглыблення тэмы Божага слова, каб пераканацца, ці былі рэалізаваныя ўказанні Сабору, а таксама каб адказаць на новыя выклікі сённяшняга часу, якія стаяць перад тымі, хто верыць у Хрыста.

*Сінод Біскупаў, прысвечаны Божаму слову*

4. Падчас XII сінадальнага Сходу пастыры з розных куткоў свету сабраліся вакол Божага слова, - што сімвалізаваў змешчаны ў цэнтры Сходу тэкст Біблії, - каб нанова адкрыць тое, што ў штодзённым жыцці можа здавацца вельмі ясным: «*факт, што Бог гаворыць і што адказвае на нашыя пытанні*»[9]. Мы супольна слухалі Божае слова і цэлебравалі яго. Узаемна расказвалі сабе пра тое, што Пан здзяйсняе ў Божым народзе, дзяліліся спадзяваннямі і турботамі. Усё гэта дапамагло нам зразумець, што мы можам паглыбіць нашую сувязь з Божым словам у межах «мы» Касцёла праз слуханне і ўзаемнае прыняцце. Таму мы ўдзячны за сведчанні жыцця Касцёла ў розных кутках свету, якія мы чулі падчас многіх выступленняў у зале. З хваляваннем мы таксама слухалі дэлегатаў, якія былі запрошаны для ўдзелу ў сінадальнай сустрэчы. Асабліва хачу падкрэсліць разважанне Яго Святасці

---

[5] *Тамсама.*

[6] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 2.

[7] *Тамсама*, 4.

[8] Сярод выказванняў living рознага зместу варта ўзгадаць: PAULUS VI, Ep. ap. *Summi Dei Verbum* (4 Novembris 1963): *AAS* 55 (1963), 979-995; ён жа, Motu Proprio *Sedula cura* (27 Iunii 1971): *AAS* 63 (1971), 665-669; IOANNES PAULUS II, *Audientia Generalis* (1 Maii 1985): *L’Osservatore Romano*, 2-3 Maii 1985, p. 6; ён жа, *Allocutio de interpretatione Bibliorum in Ecclesia* (23 Aprilis 1993): *AAS* 86 (1994), 232-243; BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad Congressum Internationalem XL elapsis annis a Const. dogm.* Dei Verbum *edita* (16 Septembris 2005): *AAS* 97 (2005), 957; ён жа, *Angelus* (6 Novembris 2005): *Insegnamenti* I (2005), 759-760. Memoranda quoque sunt documenta PONTIFICIAE COMMISSIONIS BIBLICAE, *De sacra Scriptura et christologia* (1984): *Ench. Vat.* 9, n. 1208-1339; *Unita e diversita nella Chiesa* (11 Aprilis 1988): *Ench. Vat.* 11, n. 544-643; *L’interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993): *Ench. Vat.* 13, n. 2846-3150; *Il popolo ebraico e le sue sacre Scritture nelle Bibbia cristiana* (24 Maii 2001): *Ench. Vat.* 20, n. 733-1150; *Bibbia e morale. Radici bibliche dell’agire cristiano* (11 Maii 2008), Citta del Vaticano 2008.

[9] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad Romanam Curiam* (22 Decembris 2008): *AAS* 101 (2009), 49.

Барталамея I, Экуменічнага Патрыярха Канстанцінопаля, за якую Айцы Сіноду былі вельмі яму ўдзячныя[10]. Больш за тое, упершыню Сінод Біскупаў запрасіў таксама рабіна, каб ён даў каштоўнае сведчанне пра юдэйскія Святыя Пісанні, якія з'яўляюцца таксама часткай нашага Святога Пісання[11].

Так мы з радасцю і ўдзячнасцю маглі сцвердзіць, што «і сёння ў Касцёле трывае Пяцідзесятніца, гэта значыць, што гаворыць ён шматлікімі мовамі, і не толькі ў знешнім сэнсе, што ў ім прадстаўлены не толькі галоўныя мовы свету, але яшчэ больш у сэнсе глыбейшым: у ім існуе шмат формаў адчування Бога і свету, багацце культур, і толькі такім чынам выяўляецца вялікае вымярэнне чалавечага жыцця і звязаны з ім разлеглы абсяг Божага слова»[12]. Акрамя таго мы маглі таксама адчуць, што Пяцідзесятніца надалей трывае, многія народы яшчэ чакаюць, каб Божае слова абвяшчалася на іх мове і ў іх культуры.

Як жа не ўзгадаць таксама тое, што падчас усяго Сіноду спадарожнічала нам сведчанне апостала Паўла. Праз прадбачлівы збег акалічнасцяў XII Звычайны Агульны Сход адбываўся менавіта ў годзе, прысвечаным постаці вялікага Апостала Народаў і дзвюхтысячнай гадавіны яго нараджэння. Яго жыццё вызначалася бязмежнай адданасцю справе пашырэння Божага слова. Ці ж можам мы не чуць у нашых сэрцах яго хвалюючых слоў наконт сваёй місіі абвяшчэння Божага слова: «Раблю ж гэта дзеля Евангелля» (*1 Кар* 9, 23); «Я, - піша ён у Пасланні да Рымлянаў - не саромеюся Евангелля, бо гэта моц Божая, дадзеная для збаўлення кожнаму» (1, 16). Калі разважаем над Божым словам у жыцці і місіі Касцёла, не можам забываць пра св. Паўла і яго жыццё, якое ён прысвяціў абвяшчэнню ўсім народам навіны аб Хрыстовым збаўленні.

*Пралог Евангелля св. Яна, як праваднік*

5. Жадаю, каб дзякуючы гэтай апостальскай адгартацыі дасягненні Сіноду вынікова паўплывалі на жыццё Касцёла: на асабістую сувязь са Святымі Пісаннямі, на іх інтэрпрэтацыю ў літургіі і катэхезе, а таксама ў навуковых даследаваннях, каб Біблія не была словам з мінулага, але словам жывым і актуальным. Таму маю намер прадставіць і паглыбіць разважанні Сіноду, нястомна звяртаючыся да *Пралогу Евангелля св. Яна* (1, 1-18), які перадае нам тое, што з'яўляецца фундаментам: Слова, якое ад пачатку было ў Бога, сталася целам і пасялілася між намі (пар. *Ян* 1, 14). Гэты цудоўны тэкст уяўляе сінтэз усёй хрысціянскай веры. Асабісты досвед, якім была сустрэча з Хрыстом і тое, што ён пайшоў за Ім, нарадзіў у св. Яне, якога традыцыя атаясамлівае з «вучнем, якога любіў Езус» (пар. *Ян* 13, 23; 20, 2; 21, 7. 20), моцнае перакананне, што «Езус - гэта ўцелаўлёная Мудрасць Бога, Яго спрадвечнае

[10] Пар. *Propositio* 37.

[11] Пар. PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *Il popolo ebraico e le sue sacre Scritture nella Bibbia cristiana* (24 Maii 2001), *Ench. Vat.* 20, n. 733-1150.

[12] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad Romanam Curiam* (22 Decembris 2008): *AAS* 101 (2009), 50.

Слова, якое сталася смяротным чалавекам»[13]. Няхай той, хто «ўбачыў і паверыў» (*Ян* 20, 8), таксама дапаможа нам прытуліць галаву да грудзей Хрыста (пар. *Ян* 13, 25), з якіх выплыла кроў і вада (пар. *Ян* 19, 34), сімвалы сакрамэнтаў Касцёла. Беручы прыклад з апостала Яна, а таксама з іншых натхнёных аўтараў, дазволім Духу Святому дзейнічаць у нас, каб мы маглі *штораз больш любіць Божае слова.*

## Частка першая

## *VERBUM DEI*

*«На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога,*
*і Богам было Слова. <...>*
*І Слова сталася целам» (Ян* 1, 1. 14*)*

## БОГ, ЯКІ ПРАМАЎЛЯЕ

### *Бог у дыялогу*

6. Навізна біблійнага Аб'яўлення заключаецца ў тым, што Бог дазваляе пазнаць сябе ў дыялогу, які хоча весці з намі[14]. Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum* кажа, што нябачны Бог «у сваёй бязмернай любові звяртаецца да людзей, як да сяброў <...> і гаворыць з імі <...>, каб запрасіць да супольнасці з Ім і прыняць да яе»[15]. Аднак мы не зразумелі б у поўні паслання Пралогу св. Яна, калі б спыніліся на сцвярджэнні, што Бог звяртаецца да нас з поўнай любоўю. На самай жа справе, гэта само Божае Слова, праз якое «усё сталася» (*Ян* 1, 3) і якое «сталася целам» (*Ян* 1, 14), ёсць «на пачатку» (*Ян* 1, 1). Хоць і заўважаем тут навязванне да пачатку кнігі Быцця (пар. 1, 1), то на сам рэч гаворка ідзе пра *пачатак* абсалютнага характару, які апавядае нам пра ўнутранае жыццё Бога. Янавы Пралог кажа нам, што *Logos* - гэта рэчаіснасць, што была *заўсёды*, і заўсёды *ёсць Богам.* Таму ніколі не было ў Богу часу, у якім не існаваў бы *Logos*. Слова было перад стварэннем. Таму ў цэнтры Божага жыцця ёсць еднасць, ёсць абсалютны дар. «*Бог ёсць любоў*» (*1 Ян* 4, 16), - скажа ў іншым месцы той жа Апостал, указваючы гэтым на «хрысціянскі вобраз Бога, а таксама вобраз чалавецтва і яго лёсу»[16]. Бог дазваляе сябе пазнаць як таямніцу бясконцай любові, у якой Айцец выяўляе сваё спрадвечнае Слова ў Духу Святым. Таму Слова, якое ад пачатку ёсць у Богу і ёсць Богам, аб'яўляе нам самога Бога ў дыялогу любові паміж Божымі Асобамі і запрашае нас удзельнічаць у ім. Створаныя на вобраз і падабенства Бога любові, мы можам зразумець самых сябе толькі тады, калі прымаем Слова і з паслухмянасцю падпарадкоўваемся дзеянню Духа Святога. Бо

[13] Пар. BENEDICTUS XVI, *Angelus* (4 Ianuarii 2009): *Insegnamenti* V, 1 (2009), 13.
[14] Пар. *Relatio ante disceptationem*, I.
[15] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 2.
[16] BENEDICTUS XVI, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 1.

таямніца чалавечага лёсу канчаткова раскрываецца ў святле Аб’яўлення, здзейсненага праз Божае слова.

*Аналогія Божага слова*

7. У гэтых разважаннях, якія з’яўляюцца плёнам медытацыі над хрысціянскай таямніцай, прадстаўленай у Пралогу Евангелля св. Яна, трэба падкрэсліць цяпер тое, што сказалі Айцы Сіноду адносна розных спосабаў выкарыстання намі выразу «Божае слова». Слушна гаварылася пра сімфонію слова, адзінага Слова, якое выражаецца рознымі спосабамі: як «шматгалосны спеў»[17]. У сувязі з гэтым Айцы Сіноду казалі пра аналагічнае выкарыстанне мовы чалавека адносна Божага слова. Сапраўды, калі, з аднаго боку, гэты выраз адносіцца да таго, што Бог гаворыць пра сябе, то, з другога боку, яно мае розныя значэнні, якія трэба дакладна прааналізаваць у іх суаднясенні, як з тэалагічнага пункту гледжання, так і з пастырскага. Як выразна нам паказвае Пралог св. Яна, *Logos* указвае ў першую чаргу на спрадвечнае Слова, гэта значыць на Адзінароднага Сына, народжанага Айцом перад усімі вякамі і адзінасутнага з Ім: *Слова было ў Бога, і Слова было Богам*. Але тое самае Слова, як сцвярджае св. Ян, «сталася целам» (*Ян* 1, 14), таму Езус Хрыстус, народжаны з Марыі Панны, - сапраўднае Божае Слова, якое сталася адзінасутным з намі. Выраз «Божае Слова» указвае тут на асобу Езуса Хрыста, спрадвечнага Сына Айца, які стаўся чалавекам.

Больш за тое, паколькі ў цэнтры Божага Аб’яўлення знаходзіцца падзея Хрыста, то трэба прызнаць таксама, што само стварэнне, *liber naturae*, прынцыпова з’яўляецца таксама часткай гэтай шматгалоснай сімфоніі, у якой выяўляецца адзінае Слова. Мы вызнаём таксама, што Бог перадаваў сваё Слова ў гісторыі збаўлення, Яго голас быў чутны; моцаю свайго Духа ён «гаварыў праз прарокаў»[18]. Такім чынам Божае Слова выяўляецца на працягу ўсёй гісторыі збаўлення, а найпаўней у таямніцы ўцелаўлення, смерці і ўваскрасення Божага Сына. Божым словам з’яўляецца таксама прапаведаванне Апосталаў, паслухмяных наказу ўваскрослага Езуса: «Ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню» (*Мк* 16, 15). А значыць, Божае слова перадаецца ў жывой Традыцыі Касцёла. Нарэшце, Божым словам, засведчаным і натхнёным Богам, з’яўляюцца Святыя Пісанні, Стары і Новы Запавет. Усё гэта дазваляе нам зразумець, чаму ў Касцёле мы атачаем вялікай пашанай Святое Пісанне, хоць хрысціянская вера не з’яўляецца «рэлігіяй Кнігі»: хрысціянства - гэта «рэлігія Божага слова», не «слова запісанага і маўклівага, але Слова ўцелаўлёнага і жывога»[19]. Таму Святое Пісанне трэба абвяшчаць, слухаць, чытаць, прымаць яго і перажываць як Божае слова, услед за Апостальскай Традыцыяй, з якой яно непадзельнае[20].

[17] *Instrumentum laboris*, 9.

[18] *Symbolum Nicaenum-Constantinopolitanum*: *DS* 150.

[19] Пар. S. BERNARDUS CLARAVALLENSIS, *Homilia super Missus est*, IV, 11: *PL* 183, 86 B.

[20] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 10.

Як сцвердзілі Айцы Сіноду, мы сапраўды маем дачыненне з аналагічным выкарыстаннем выразу «Божае слова», пра што павінны памятаць. Таму трэба больш вучыць вернікаў адрозніваць яго розныя значэнні і адзінства яго сэнсу. Таксама з тэалагічнага пункту гледжання неабходна паглыбіць азначэнні розных значэнняў гэтага выразу, каб лепш паказаць еднасць Божага плану і цэнтральнае месца ў ім асобы Хрыста[21].

*Касмічнае вымярэнне Слова*

8. Усведамляючы галоўнае значэнне Божага слова адносна спрадвечнага *Слова* (*Logos*) Бога, якое сталася целам, адзінага Збаўцы і Пасрэдніка паміж Богам і чалавекам[22], і ўслухоўваючыся ў гэтае слова, мы дзякуючы біблійнаму Аб’яўленню прызнаём, што яно з’яўляецца фундаментам усёй рэчаіснасці. У Пралогу св. Ян сцвярджае адносна боскага *Слова* (*Logos*), што «усё праз Яго сталася, і без Яго нічога не сталася з таго, што сталася» (1, 3); таксама ў Пасланні да Каласянаў гаворыцца ў аднясенні да Хрыста, які ёсць «першародным сярод усякага стварэння» (пар. 1, 15), што «ўсё праз Яго і для Яго створана» (1, 16). І Пасланне да Габрэяў нагадвае, што «праз веру мы разумеем, што вякі былі ўладкаваныя словам Божым, так што з нябачнага ўзнікла бачнае» (11, 3).

Гэтая навіна для нас - вызваленчая. Словы Святога Пісання паказваюць, што нішто не з’яўляецца вынікам ірацыянальнага выпадку, але ўсё існуе таму, што так хацеў Бог, гэта Яго план, у цэнтры якога знаходзіцца запрашэнне ўдзельнічаць у Божым жыцці ў Хрысце. Стварэнне нараджаецца са *Слова* (*Logos*) і мае на сабе незнішчальныя сляды *ствральнага Розуму, які ўсталёўвае парадак і кіруе ім.* Пра гэтае радаснае перакананне гавораць псальмы: «Словам Пана створаны нябёсы, дыханнем Яго вуснаў – уся іхняя моц» (33 [32], 6); больш за тое: «Ён прамовіў – і сталася, Ён загадаў – і з’явілася» (33 [32], 9). Уся рэчаіснасць выражае гэтую таямніцу: «Нябёсы абвяшчаюць Божую славу, пра справу рук Яго расказвае небасхіл» (*Пс* 19 [18], 2). Таму ўжо само Святое Пісанне заахвочвае нас пазнаваць Стварыцеля гледзячы на стварэнне (пар. *Мдр* 13, 5; *Рым* 1, 19-20). Традыцыя хрысціянскай думкі здолела паглыбіць гэты асноўны элемент, якім з’яўляецца сімфонія Слова, напрыклад, калі св. Банавэнтура, які - разам з вялікай традыцыяй грэчаскіх Айцоў бачыць усялякія магчымасці стварэння ў *Слове* (*Logos*)[23] - сцвярджае, што «кожнае стварэнне ёсць Божым словам, бо абвяшчае Бога»[24]. Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum* перадала гэта ў сцвярджэнні, што «Бог, які

---

[21] Пар. *Propositio* 3.

[22] Пар. CONGREGATIO PRO DOCTRINA FIDEI, Declaratio de Iesu Christi atque Ecclesiae unicitate et universalitate salvifica *Dominus Iesus* (6 Augusti 2000), 13-15: *AAS* 92 (2000), 754-756.

[23] Пар. *In Hexaemeron*, XX,5: Opera Omnia, V, Quaracchi 1891, pp. 425-426; *Breviloquium*, I, 8: Opera Omnia, V, Quaracchi 1891, p. 216-217.

[24] *Itinerarium mentis in Deum*, II, 12; Opera Omnia, V. Quaracchi 1891, pp. 302-303; пар. *Commentarius in librum Ecclesiastes*, Cap. 1, vers. 11, *Quaestiones* II, 3: Opera Omnia, VI, V. Quaracchi 1891, p. 16.

праз Слова ўсё стварае (пар. *Ян* 1, 3) і захоўвае, дае чалавецтву вечнае сведчанне пра сябе»[25].

*Стварэнне чалавека*

9. Такім чынам рэчаіснасць нараджаецца са Слова як *creatura Verbi,* і ўсё паклікана служыць Слову. Створаны свет – гэта месца, у якім адбываецца ўся гісторыя любові Бога і Яго стварэння. Збаўленне чалавека – гэта крыніца ўсяго. Гледзячы на сусвет у перспектыве гісторыі збаўлення мы адкрываем, што пазіцыя чалавека ў створаным свеце непаўторная і асаблівая: «І стварыў Бог чалавека паводле свайго вобраза, паводле Божага вобраза стварыў яго, стварыў мужчыну і жанчыну» (*Быц* 1, 27). Гэта дазваляе нам цалкам прызнаць, наколькі каштоўнымі з'яўляюцца дары, атрыманыя намі ад Стварыцеля: каштоўнасць уласнага цела, дар розуму, свабоды і сумлення. Мы знаходзім тут таксама тое, што традыцыя філасофіі называе «натуральным законам»[26]. Фактычна, «кожны чалавек, адораны сумленнем і пачуццём адказнасці, ён адчувае ўнутраны імпульс да чынення дабра»[27], а значыць пазбягання зла. Як нагадвае св. Тамаш Аквінскі, на гэтым прынцыпе грунтуюцца таксама ўсе іншыя наказы натуральнага закону[28]. Слуханне Божага слова вядзе перадусім да прызнання неабходнасці жыць згодна з законам, «запісаным у сэрцы» (пар. *Рым* 2, 15; 7, 23)[29]. Езус Хрыстус таксама дае людзям новы Закон, Закон Евангелля, у якім змяшчаецца і дасканала ажыццяўляецца натуральны закон, што вызваляе нас ад закону граху, з прычыны якога, як кажа св. Павел, «жаданне ёсць ува мне, але зрабіць добрае не знаходжу як» (*Рым* 7, 18), і дае людзям магчымасць дзякуючы ласцы ўдзельнічаць у Божым жыцці і перамагаць эгаізм[30].

*Рэалізм Слова*

10. Хто ведае Божае слова, ведае таксама цалкам значэнне кожнага стварэння. Бо калі ўсё «існуе» у тым, хто ёсць «раней за ўсё» (пар. *Клс* 1, 17), то чалавек, які будуе сваё жыццё на Яго слове, будуе сапраўды салідна і трывала. Божае слова фактычна схіляе нас змяніць нашую канцэпцыю рэалізму: «Рэалістам з'яўляецца той, хто ў Божым слове распазнае фундамент усяго»[31]. Гэта неабходна асабліва ў наш час, калі бачнай становіцца нетрываласць многіх рэчаў, на якіх мы будуем жыццё, на якія мы

---

[25] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 3; пар. CONC. OECUM. VAT. I, Cons. dogm. de fide catholica *Dei Filius*, cap. 2, De revelatione: *DS* 3004.

[26] Пар. *Propositio* 13.

[27] COMMISSIO THEOLOGICA INTERNATIONALIS, *Alla ricerca di un'etica universale: nuovo sguardo sulla legge naturale*, Citta del Vaticano 2009, n. 39.

[28] Пар. *Summa Theologiae*, Ia-IIae, q. 94, a. 2.

[29] Пар. PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *Bibbia e morale. Radici bibliche dell'agire cristiano* (11 Maii 2008), Citta del Vaticano 2008, n. 13, 32, 109.

[30] COMMISSIO THEOLOGICA INTERNATIONALIS, *Alla ricerca di un'etica universale: nuovo sguardo sulla legge naturale*, Citta del Vaticano 2009, n. 102.

[31] BENEDICTUS XVI, *Homilia ad celebrationem Horae Tertiae, prima ineunte Generali Congregatione Synodi Episcoporum* (6 Octobris 2008): *AAS* 100 (2008), 758-761.

схільныя спадзявацца. Раней ці пазней аказваецца, што валоданне імі, задавальненне і ўлада не могуць заспакоіць самыя глыбокія жаданні чалавечага сэрца. Бо для таго, каб будаваць уласнае жыццё чалавек патрабуе моцных фундаментаў, якія вытрываюць нават тады, калі знікне чалавечая ўпэўненасць. Сапраўды, «навекі, Пане, устаноўлена Тваё слова ў нябёсах», а вернасць Пана трывае «з пакалення ў пакаленне» (*Пс* 119 [118], 89-90), і пагэтаму чалавек, які будуе на гэтым слове, будуе дом свайго жыцця на скале (пар. *Мц* 7, 24). Хочацца, каб нашае сэрца магло штодзённа казаць Богу: «Ты мая абарона і мой шчыт, я давяраю Тваім словам» (*Пс* 119 [118], 114), і каб мы, як св. Пётр, маглі кожны дзень давяраць сябе Пану Езусу: «На Тваё слова закіну сеткі» (*Лк* 5, 5).

*Хрысталогія Слова*

11. Гледзячы на рэчаіснасць як на справу Найсвяцейшай Тройцы, праз пасрэдніцтва Божага слова можам зразумець словы аўтара Паслання да Габрэяў: «Шмат разоў і па-рознаму прамаўляў калісьці Бог да айцоў нашых праз прарокаў, у гэтыя апошнія дні прамовіў да нас праз Сына, якога ўстанавіў спадкаемцам усяго, праз якога і стварыў сусвет» (1, 1-2). Гэта цудоўна, калі мы сцвярджаем, што ўжо ўвесь Стары Запавет паўстае перад намі як гісторыя, у якой Бог перадае сваё слова, бо праз «запавет з Абрагамам (пар. *Быц* 15, 18) і праз Майсея — з народам Ізраэля (пар. *Зых* 24, 8) Ён словамі і справамі адкрыўся набытаму народу як адзіны, праўдзівы і жывы Бог, каб Ізраэль спазнаў Божыя шляхі адносна людзей і каб дзякуючы самому Богу, які гаварыў праз вусны прарокаў, з кожным днём глыбей і выразней разумеў гэтыя шляхі і пашыраў іх сярод народаў (пар. *Пс* 22 [21], 28-29; 96 [95], 1-3; *Іс* 2, 1-4; *Ер* 3, 17)»[32].

Гэтая дабрадушнасць Бога рэалізуецца непаўторным чынам ва ўцелаўленні Слова. Срадвечнае Слова, якое выяўляецца ў стварэнні і прамаўляе ў гісторыі збаўлення, сталася ў Хрысце чалавекам, народжаным ад жанчыны (пар. *Гал* 4, 4). Слова не выражаецца тут перадусім моўна, праз паняцці або правілы. Мы размаўляем тут з Асобай самога Езуса. Яго адзіная і адмысловая гісторыя – гэта канчатковае слова, якое Бог скіроўвае да чалавецтва. У гэтай перспектыве можна зразумець, чаму «імкненне быць хрысціянінам не з'яўляецца вынікам этычнага выбару або нейкай вялікай ідэі, але вынікам спаткання з падзеяй, з Асобай, якая надае жыццю новую перспектыву і тым самым выразны накірунак»[33]. Паўтарэнне гэтай сустрэчы, а таксама абнаўленне такой свядомасці абуджае ў сэрцах веруючых захапленне Божым намерам, якога ніколі не маглі б нарадзіць разумовыя здольнасці і ўяўленні чалавека. Гэта нечуваная навізна і па-чалавечы неймаверная: «Слова сталася целам і пасялілася між нас» (*Ян* 1, 14 а). Гэта не рытарычная фігура, але жывы досвед! Расказвае пра яго св. Ян, відавочца: «І ўбачылі мы славу Ягоную, славу, якую мае ад Айца Адзінародны, поўны ласкі і праўды» (*Ян* 1, 14b).

[32] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 14.
[33] BENEDICTUS XVI, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 1.

Апостальская вера сведчыць, што спрадвечнае Слова сталася адным з нас. *Слова Божае* сапраўды выражаецца *людскімі словамі*.

12. Сузіраючы гэтую «хрысталогію Слова», патрыстычная і сярэднявечная традыцыя стварыла вымоўны выраз: *Слова сталася кароткім*[34]. «Айцы Касцёла ў сваім грэчаскім перакладзе Старога Запавету знайшлі словы прарока Ісаі, якія св. Павел таксама цытуе, каб паказаць, якім чынам новыя Божыя шляхі прадказваліся ўжо ў Старым Запавеце. Там было напісана: “Бог учыніў сваё слова кароткім, скараціў яго” (пар. *Іс* 10, 23; *Рым* 9, 28). <...> Сам Сын ёсць Словам, *Logos*. Спрадвечнае Слова сталася малым – настолькі малым, што змясцілася ў яслях. Сталася дзіцем, каб Слова было для нас зразумелым»[35]. Цяпер Слова не толькі чутнае, не толькі мае *голас*, цяпер Слова мае бачнае аблічча Езуса з Назарэта[36].

Спасцігаючы тое, пра што кажуць Евангеллі, мы заўважаем, што асаблівы характар чалавечнасці Езуса ў поўні выяўляецца ў аднясенні да Божага слова. Ён у кожную хвіліну рэалізуе ў сваёй дасканалай чалавечнасці волю Айца; Езус чуе Яго голас і бязмежна паслухмяны Яму. Ён ведае Айца і захоўвае Яго слова (пар. *Ян* 8, 55). Кажа нам пра справы Айца (пар. *Ян* 12, 50); «словы, якія Ты даў Мне, Я даў ім» (*Ян* 17, 8). Так Езус паказвае, што з’яўляецца боскім *Словам* (*Logos*), якое адорвае нас сабою, а таксама новым Адамам, праўдзівым чалавекам, тым, хто ў кожную хвіліну выконвае не сваю волю, але волю Айца. Ён «*узрастаў* у мудрасці, у гадах і *ў ласцы ў Бога і ў людзей*» (*Лк* 2, 52). Ён дасканала слухае, рэалізуе ў сабе і перадае нам Божае слова (пар. *Лк* 5, 1).

Місія Езуса, нарэшце, спаўняецца ў Пасхальнай таямніцы: тут мы сустракаемся са «слова крыжа» (пар. *1 Кар* 1, 18). Слова заціхае, становіцца смяротнай цішай, бо гаварыла, пакуль не змоўкла, не абмінуўшы нічога, што мела нам перадаць. Айцы Касцёла, якія сузіралі гэтую таямніцу, укладваюць у вусны Маці Божай гэты знамянальны выраз: «не мае слоў Слова Айца, якое ўчыніла ўсялякае стварэнне, што размаўляе; не маюць жыцця пагаслыя вочы таго, чые словы і жэсты ўзварушваюць усё, што мае жыццё»[37]. Тут сапраўды размова ідзе пра тую «большую» любоў, якая аддае жыццё за сяброў сваіх (пар. *Ян* 15, 13).

У гэтай вялікай таямніцы Езус аб’яўляецца як *Слова Новага і Вечнага Запавету*: Божая свабода і чалавечая свабода канчаткова сустрэліся ў Яго ўкрыжаваным целе, у непарушнай дамове, што абавязвае назаўсёды. Устанаўліваючы Эўхарыстыю падчас Апошняй Вячэры, Езус гаварыў пра «новы і вечны Запавет», заключаны у Яго

[34] «*Ho Logos pachynetai* (або *brachynetai*)». Пар. ORYGENES, *Peri Archon*, I, 2, 8: *SC* 252, pp. 127-129.

[35] BENEDICTUS XVI, *Homilia in sollemnitate Nativitatis Domini* (24 Decembris 2006): *AAS* 99 (2007), 12.

[36] Пар. *Nuntius conclusivus*, II,4-6.

[37] MAXIMUS CONFESSOR, *Vita Mariae*, n. 89: *Testi mariani del primo millennio*, 2, Roma 1989, p. 253.

пралітай Крыві (пар. *Мц* 26, 28; *Мк* 14, 24; *Лк* 22, 20), аб’яўляючы сябе як праўдзівага Баранка, прынесенага ў ахвяру, у якім здзяйсняецца канчатковае вызваленне[38].

У светлай таямніцы ўваскрасення адкрываецца сапраўднае і канчатковае значэнне маўчання Слова. Хрыстус, уцелаўлёнае, укрыжаванае і ўваскрослае Слова Бога, з’яўляецца Панам уясяго. Ён Пераможца, *Pantokrator,* і ў Ім усё з’яднана назаўсёды (пар. *Эф* 1, 10). Хрыстус ёсць «святлом свету» (*Ян* 8, 12), тым святлом, якое «свеціць у цемры» (*Ян* 1, 5) і якое цемра не перамагла (пар. *тамсама*). Праз гэта цалкам разумеем значэнне псальму 119 [118]: «Слова Тваё – светач для маёй нагі і святло на маёй сцежцы» (в. 105). Слова, якое ўваскрасае, з’яўляецца канчатковым святлом на нашым шляху. Хрысціяне ад пачатку ведалі, што ў Хрысце прысутнічае Божае Слова як Асоба. Божае Слова – гэта праўдзівае святло, якога патрабуе чалавек. Так, Сын Божы ўваскрос як Святло свету. Сёння, жывучы з Ім і для Яго, мы можам жыць у святле.

13. Цяпер, калі мы, так бы мовіць, - у сэрцы «хрысталогіі Слова», неабходна падкрэсліць адзінства Божага намеру ва ўцелаўлёным Слове: таму Новы Запавет паказвае нам згоднасць Пасхальнай таямніцы са Святымі Пісаннямі, як іх дасканалае спаўненне. Св. Павел у *Першым пасланні да Карынцянаў* кажа, што Езус Хрыстус памёр за нашыя грахі «паводле Пісання» (15, 3) і што ўваскрос на трэці дзень «паводле Пісання» (15, 4). Гэтым Апостал звязвае падзеі смерці і ўваскрасення Пана з гісторыяй Старога Запавету Бога са сваім народам. Больш за тое, дае нам зразумець, што менавіта гэта надае гісторыі логіку і сапраўднае значэнне. У Пасхальнай таямніцы спаўняюцца «словы Пісання, гэта значыць тая смерць, якая мае месца “паводле Пісання”, з’яўляецца падзеяй, што змяшчае ў сабе пэўнае слова (*logos*), пэўную логіку: смерць Хрыста сведчыць аб тым, што Божае Слова ўпоўні сталася “целам”, “гісторыяй” чалавека»[39]. Таксама ўваскрасенне Езуса адбываецца «на трэці дзень паводле Пісання»; улічваючы, што – паводле пераканання юдэяў – тленне пачынаецца пасля трох дзён, слова Пісання спаўняецца ў Езусе, які ўваскрос, пакуль не пачалося тленне. Гэтым св. Павел, верна пераказваючы вучэнне Апосталаў (пар. *1 Кар* 15, 3), падкрэслівае, што перамога Хрыста над смерцю адбываецца дзякуючы стваральнай моцы Божага слова. Гэтая Божая моц напаўняе надзеяй і радасцю: такім у канчатковым значэнні ёсць вызваленчы змест пасхальнага Аб’яўлення. Праз Пасху Бог аб’яўляе самога сябе, а таксама моц трынітарнай Любові, якая скасоўвае знішчальную сілу зла і смерці.

Згадваючы гэтыя істотныя элементы нашай веры, мы можам сузіраць глыбокую еднасць стварэння, новага стварэння, а таксама ўсёй гісторыі збаўлення ў Хрысце. Карыстаючыся метафарай, можам параўнаць «космас з “кнігай” – пра гэта кажа

[38] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 9-10.
[39] BENEDICTUS XVI, *Audientia Generalis* (15 Aprilis 2009): *L’Osservatore Romano*, 16 Aprilis 2009, p. 1.

таксама Галілей, – прызнаючы яго справай Аўтара, які выяўляе сябе праз “сімфонію” стварэння. У гэтай сімфоніі ў пэўны момант з’яўляецца, кажучы музычнай тэрміналогіяй, “сольны матыў”, гэта значыць матыў, напісаны для асобнага музычнага інструмента ці голаса, вельмі важнага, бо ён надае сэнс усяму твору. Гэтым “матывам” з’яўляецца Езус <...>. Сын Чалавечы яднае ў сабе неба і зямлю, стварэнне і Стварыцеля, цела і Дух. Ён – цэнтр космасу і гісторыі, бо ў Ім яднаюцца, без змяшэння, Айтар і Яго справа»[40].

*Эсхаталагічнае вымярэнне Божага слова*

14. Усё гэта выражае свядомасць Касцёла, што Езус Хрыстус – гэта канчатковае Слова Бога; Ён «першы і апошні» (*Ап* 1, 17). Ён надаў стварэнню і гісторыі канчатковы сэнс. А значыць нашае пакліканне – жыць у часе, жыць у Божым святле, створаным у гэтым эсхаталагічным рытме Слова. «Таму хрысціянская эканомія як новы і канчатковы запавет ніколі не праміне і перад слаўным прыйсцем нашага Пана Езуса Хрыста ўжо не трэба чакаць ніякага новага публічнага Аб’яўлення (пар. 1 *Цім* 6, 14 і *Ціт* 2, 13)»[41]. Як нагадалі айцы падчас Сіноду, «адмысловы характар хрысціянства выяўляецца ў падзеі, якой ёсць Езус Хрыстус - вяршыня Аб’яўлення, спаўненне Божых абяцанняў і пасрэднік у сустрэчы чалавека і Бога. Езус, “які аб’явіў нам Бога” (пар. *Ян* 1, 18), - гэта адзінае і канчатковае Слова, перададзенае чалавецтву»[42]. Св. Ян ад Крыжа цудоўна выказаў гэтую праўду: «Ад моманту, калі Бог даў нам свайго Сына, які з’яўляецца Яго адзіным Словам, Ён усё сказаў адразу ў гэтым адным сваім Слове і не мае больш нічога сказаць <...>. Бо тое, пра што часткова казаў раней праз прарокаў, сказаў ужо цалкам, даючы нам усё, а менавіта свайго Сына. <...> Таму той, хто сёння хацеў бы спытацца ў Бога або хацеў бы мець ад Яго нейкія бачанні ці аб’яўленні, учыніў бы не толькі глупства, але таксама абразіў бы Бога, не маючы вачэй, што ўглядаюцца цалкам у Хрыста, і жадаючы нейкай іншай навізны»[43].

Таму Сінод параіў «дапамагчы вернікам адпаведна адрозніваць Божае слова і прыватныя аб’яўленні»[44], роля якіх заключаецца «не ў <...> „дапаўненні” канчатковага Аб’яўлення Хрыста, але ў дапамозе больш поўна перажыць яго ў пэўнай гістарычнай эпосе»[45]. Значэнне прыватных аб’яўленняў прынцыпова адрозніваецца ад адзінага публічнага Аб’яўлення: гэтае апошняе патрабуе нашай веры; у ім чалавечымі словамі і праз пасрэдніцтва жывой супольнасці Касцёла прамаўляе да нас сам Бог. Крытэрыем сапраўднасці прыватнага аб’яўлення з’яўляецца яго скіраванасць на самога Хрыста. Калі яно аддаляе нас ад Яго, то гэтае

[40] Ён жа. *Homilia in sollemnitate Epiphaniae Domini* (6 Ianuarii 2009): *L’Osservatore Romano*, 7-8 Ianuarii 2009, p. 8.
[41] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 4.
[42] *Propositio* 4.
[43] S. IOANNES A CRUCE, *De Ascensu Montis Carmeli*, II, 22.
[44] *Propositio* 47.
[45] *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 67.

аб’яўленне напэўна не паходзіць ад Духа Святога, які з’яўляецца нашым правадыром па Евангеллі, але не па-за ёй. Прыватнае аб’яўленне падтрымлівае веру і з’яўляецца верагодным менавіта тады, калі адсылае да адзінага публічнага Аб’яўлення. Таму касцёльнае прызнанне прыватнага аб’яўлення прынцыпова сцвярджае, што дадзенае пасланне не мае супярэчнасцяў з верай і добрымі звычаямі; яго можна абвясціць, а вернікі могуць разважліва прыняць яго. Прыватнае Аб’яўленне можа ўнесці новыя аспекты, прычыніцца да ўзнікнення новых формаў пабожнасці або паглыблення ўжо існуючых. Яно можа мець пэўны прароцкі характар (пар. *1 Тэс* 5, 19-21) і плённа дапамагаць у лепшым разуменні і перажыванні Евангелля ў дадзенай эпосе; таму не варта грэбаваць ім . Гэта дапамога, якую мы атрымліваем, але не маем абавязку карыстацца ім. У любым выпадку яно павінна быць ежаю для веры, надзеі і любові, якія для кожнага з’яўляюцца нязменным шляхам да збаўлення[46].

*Божае слова і Дух Святы*

15. Пасля разважанняў на тэму апошняга і канчатковага Слова Бога да свету трэба звярнуць увагу на місію Духа Святога ў сувязі з Божым словам. Сапраўды, няма ніякага праўдзівага разумення хрысціянскага Аб’яўлення без дзеяння Суцяшыцеля. Гэта звязана з тым, што паведамленне Бога пра сябе самога прадбачыць заўсёды адносіны паміж Сынам і Духам Святым, якіх Ірынэй Ліонскі назваў «дзвюма рукамі Айца»[47]. Святое Пісанне ўказвае нам на прысутнасць Духа Святога ў гісторыі збаўлення, а асабліва ў жыцці Езуса, які быў зачаты ад Духа Святога з Дзевы Марыі (пар. *Мц* 1, 18; *Лк* 1, 35); на пачатку сваёй публічнай дзейнасці, на берагах Ярдана, ён бачыць, як Дух сыходзіць на Яго ў постаці голуба (пар. *Мц* 3, 16); Езус дзейнічае ў гэтым жа Духу, прамаўляе і радуецца (пар. *Лк* 10, 21); у Духу таксама ахвяруе самога сябе (пар. *Гбр* 9, 14). У канцы сваёй місіі, згодна з апавяданнем Яна Евангеліста, Езус выразна паказвае сувязь дару свайго жыцця з пасланнем Духа да вучняў (пар. *Ян* 16, 7). Затым уваскрослы Езус, маючы на сваім целе знакі мукі, тхне Духа (пар. *Ян* 20, 22), і вучні становяцца ўдзельнікамі Яго місіі (пар. *Ян* 20, 21). Дух Святы навучыць вучняў пра ўсё і нагадае ім усё, што сказаў Хрыстус (пар. *Ян* 14, 26), бо гэта Ён, Дух Праўды (пар. *Ян* 15, 26), прывядзе вучняў да ўсёй праўды (пар. *Ян* 16, 13). Нарэшце, як чытаем у Дзеях Апосталаў, Дух сыходзіць на Дванаццаць сабраных на малітве разам з Марыяй у дзень Пяцідзесятніцы (пар. 2, 1-4) і заахвочвае іх да місіі абвяшчэння ўсім людзям Добрай Навіны»[48].

Так Божае слова выражаецца чалавечымі словамі дзякуючы дзеянню Духа Святога. Місія Сына, а таксама місія Духа Святога непадзельныя і ствараюць адну эканомію збаўлення. Дух, які дзейнічае ва ўцелаўленні Слова ва ўлонні Дзевы Марыі, ёсць тым самым Духам, які кіруе таксама Езусам падчас Яго місіі і якога Ён

[46] Пар. CONGREGATIO PRO DOCTRINA FIDEI, *Il messaggio di Fatima* (26 Iunii 2000): *Ench. Vat.* 19, n. 974-1021.
[47] *Adversus haereses*, IV, 7, 4: *PG* 7, 992-993; V, 1, 3: *PG* 7, 1123; V, 6, 1: *PG* 7, 1200.
[48] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 12.

абяцаў вучням. Гэта той самы Дух, які прамаўляў праз прарокаў, падтрымлівае і натхняе Касцёл у справе абвяшчэння Божага слова і ў прапаведаванні Апосталаў; нарэшце, гэта той самы Дух, які натхніў аўтараў Святых Пісанняў.

16. Усведамляючы існаванне гэтай пнеўматалагічнай перспектывы, сінадальныя Айцы хацелі звярнуць увагу на значэнне дзеяння Духа Святога ў жыцці Касцёла, а таксама ў сэрцы вернікаў у сувязі са Святым Пісаннем[49]. Без плённага дзеяння «Духа Праўды» (*Ян* 14, 16) нельга зразумець слоў Пана. Як нагадвае св. Ірынэй: «Тыя, хто не ўдзельнічае ў Духу, не кормяцца спажыткам сваёй маці (Касцёла), нічога не атрымліваюць з найчысцейшай крыніцы, што выцякае з цела Хрыста»[50]. Як Божае Слова прыходзіць да нас у целе Хрыста, у эўхарыстычным Целе, а таксама ў Пісаннях дзякуючы дзеянню Духа, так можа яно быць прынятым і сапраўды зразумелым толькі дзякуючы таму самаму Духу.

Вялікія пісьменнікі хрысціянскай традыцыі адзінадушныя ў разважаннях на тэму ролі Духа Святога ў сувязі, якую вернікі павінны ўтрымліваць з Пісаннямі. Св. Ян Хрызастом сцвярджае, што Пісанне «патрабуе аб'яўлення Духа, каб мы, адкрываючы праўдзівы сэнс змешчаных у ім рэчаў, чэрпалі з яго вялікую карысць»[51]. Таксама св. Геранім глыбока перакананы, што «нельга зразумець Пісання без дапамогі Духа Святога, які іх натхніў»[52]. Таксама св. Грыгорый Вялікі выразна падкрэслівае, што ўзнікненне і інтэрпрэтацыя Бібліі - гэта справа таго ж Духа: «Ён сам стварыў словы святых Запаветаў, і Ён сам іх адкрыў»[53]. Рычард з Сан-Віктора нагадвае, што трэба мець «вочы галубкі», асветленыя і навучаныя Духам, каб зразумець святы тэкст[54].

Хацеў бы таксама падкрэсліць, што вымоўнае сведчанне на тэму адносін паміж Духам Святым і Пісаннем, знаходзім у літургічных тэкстах, у якіх Божае слова абвяшчаецца, чуецца і тлумачыцца вернікам. Да іх належаць старажытныя малітвы, якія ў форме эпіклезы просяць аб Духу перад чытаннямі: «Спашлі Твайго Духа Святога Суцяшыцеля ў нашыя душы і ўчыні, каб мы зразумелі натхнёныя Ім Пісанні; дазволь, каб я годна прачытаў іх, і каб сабраныя тут вернікі мелі з гэтага карысць». Знаходзім таксама малітвы, у якіх на заканчэнне гаміліі зноў просіцца Бога аб дары Духа для вернікаў: «Божа, Збаўца, <...> молімся да Цябе за гэты народ:

---

[49] Пар. *Propositio* 5.
[50] *Adversus haereses,* III, 24, 1: *PG* 7, 966.
[51] *Homiliae in Genesim*, XXII 1: *PG* 53, 175.
[52] *Epistula* 120, 10: *CSEL* 55, p. 500-506.
[53] *Homiliae in Ezechielem*, I, VII, 17: *CC* 142, p. 94.
[54] «Oculi ergo devotae animae sunt columbarum quia sensus eius per Spiritum Sanctum sunt illuminati et edocti, spiritalia sapientes... Nunc quidem aperitur animae talis sensus, ut intellegat Scripturas»: RICHARDUS A SANCTO VICTORE, *Explicatio in Cantica canticorum*, 15: *PL* 196, 450 B. D.

Спашлі на яго Духа Святога; няхай наведае яго Пан Езус, няхай прамовіць да розуму ўсіх і адкрые сэрцы на веру, і прывядзе да Цябе нашыя душы, Божа Міласэрнасці»[55].

Дзякуючы гэтаму становіцца ясным, чаму нельга зразумець сэнс Слова без увагі на дзеянне Суцяшыцеля ў Касцёле, а таксама ў сэрцах вернікаў.

*Традыцыя і Пісанне*

17. Пацвярджэнне глыбокай сувязі, якая існуе паміж Духам Святым і Божым словам, дапамагае нам зразумець сэнс, а таксама галоўнае значэнне жывой Традыцыі і Святых Пісанняў у Касцёле. Паколькі «так палюбіў Бог свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага» (*Ян* 3, 16), то сказанае ў часе Божае слова было дадзена і «перададзена» канчаткова Касцёлу, каб заклік збаўлення мог плённа перадавацца ў кожны час і ў кожным месцы. Як нагадвае Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum*, Езус Хрыстус «наказаў Апосталам перадаваць боскія дары і прапаведаваць усім Евангелле, абяцанае раней праз прарокаў, споўненае Ім і абвешчанае Ягонымі вуснамі як крыніца ўсякай збаўчай праўды і дысцыпліны звычаяў. Гэты загад верна выканалі як Апосталы, якія вуснай пропаведдзю, прыкладам і настаўленнямі перадавалі тое, што атрымалі з вуснаў, гутарак і спраў Хрыста і пра што даведаліся навучаныя Духам Святым, так і іншыя Апосталы і апостальскія мужы, якія пад натхненнем Духа Святога запісалі збаўчую навіну»[56].

Акрамя таго Другі Ватыканскі Сабор нагадвае, што гэтая Традыцыя, распачатая Апосталамі, з'яўляецца жывой і дынамічнай рэчаіснасцю: яна «развіваецца ў Касцёле з дапамогай Духа Святога»; не ў тым сэнсе, што падлягае зменам у сваёй праўдзе, якая з'яўляецца вечнай. Перадусім «расце ўспрыманне як перададзеных спраў, так і слоў», дзякуючы кантэмпляцыі і вывучэнню, дзякуючы лепшаму разуменню, якое нараджаецца з больш глыбокага духоўнага досведу і «пропаведзі тых, хто разам з біскупскай сукцэсіяй атрымаў неад'емны дар праўды»[57].

Жывая Традыцыя мае прынцыповае значэнне для паглыблення з цягам часу разумення Касцёлам аб'яўленай у Пісаннях праўды; бо «дзякуючы гэтай Традыцыі Касцёл мае ўвесь канон Святых Кніг, а само Святое Пісанне ў ёй глыбей разумеецца і няспынна становіцца дзейсным»[58]. Канчаткова гэтая жывая Традыцыя Касцёла дазваляе нам адпаведна зразумець Святое Пісанне як Божае слова. Хоць Божае слова апярэджвае і перавышае Святое Пісанне, аднак, як натхнёнае Богам, Пісанне ўтрымлівае Божае слова (пар. *2 Цім* 3, 16) «абсалютна выключным чынам»[59].

18. З гэтага вынікае, што важным з'яўляецца адпаведнае выхаванне і фармацыя Божага народу, каб ён падыходзіў да Святых Пісанняў у сувязі з жывой Традыцыяй

---

[55] *Sacramentum Serapionis* II (XX), *Didascalia et Constitutiones apostolorum*, ed. F. X. FUNK, Paderbornae 1906, p. 161.

[56] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 7.

[57] *Тамсама*, 8.

[58] *Тамсама*.

[59] Пар. *Propositio* 3.

Касцёла, прызнаючы іх Божым словам. Фарміраванне ў вернікаў такога падыходу вельмі важнае з увагі на духоўнае жыццё. Тут можа дапамагчы зварот да ўжыванай Айцамі Касцёла аналогіі паміж Божым Словам, «якое сталася целам», і словам, якое становіцца «кнігай»[60]. Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum*, узгадваючы старажытную традыцыю, паводле якой, як сцвярджае св. Амброзій[61] «праз цела Сына нам пераказана Пісанне», кажа: «Божыя словы, выражаныя чалавечай мовай, прыпадобніліся да чалавечай мовы, як калісьці Слова Спрадвечнага Айца, прыняўшы слабасць людскога цела, прыпадобнілася да чалавека»[62]. Так зразуметае Святое Пісанне паўстае перад намі, нягледзячы на разнастайнасць формаў і зместу, як адналітая рэчаіснасць. «Праз усе словы Святога Пісання Бог вымаўляе толькі адно Слова, сваё адзінае Слова, у якім увесь выказваецца (пар. *Гбр* 1, 1-3)»[63], як выразна сцвярджае ўжо св. Аўгустын: «Памятайце, што тое самае Божае Слова распаўсюджваецца на ўсе кнігі, што тое самае Слова гучыць з вуснаў усіх святых аўтараў»[64].

А значыць праз Духа Святога і пад кіраўніцтвам Настаўніцкага Інстытута Касцёл пераказвае ўсім пакаленням тое, што было аб'яўлена ў Хрысце. Касцёл жыве перакананнем, што яго Пан, які гаварыў у мінулым, няспынна перадае сёння свае слова ў жывой Традыцыі Касцёла, а таксама ў Святым Пісанні. Слова Божае прамаўляе да нас у Святым Пісанні як натхнёнае сведчанне Аб'яўлення, якое разам ж жывой Традыцыяй Касцёла з'яўляецца найвышэйшым правілам веры[65].

*Святое Пісанне, натхненне і праўда*

19. У разуменні святога тэксту як Божага слова ў чалавечых словах, асноўнае значэнне мае без сумнення паняцце *натхнення*. Тут таксама можна выкарыстаць аналогію: падобна як Божае Слова сталася целам ад Духа Святога ва ўлонні Дзевы Марыі, так і Святое Пісанне нараджаецца з улоння Касцёла ад таго ж Духа. Святое Пісанне – гэта «мова Бога, паколькі яно засведчана на пісьме пад натхненнем Божага Духа»[66]. Такім чынам поўнасцю прызнаецца роля чалавечага аўтара, які напісаў натхнёны тэкст, і адначасова самога Бога як сапраўднага Аўтара.

Як сцвердзілі сінадальныя Айцы, тут выразна бачна, што тэма натхнення мае галоўнае значэнне для адпаведнага падыходу да Пісанняў, а таксама для іх правільнай герменеўтыкі[67], якая ў сваю чаргу павінна адлюстроўваць дух, у якім

---

[60] Пар. *Nuntius conclusivus*, II,5.

[61] *Expositio Evangelii secundum Lucam* 6, 33: *PL* 15, 1677.

[62] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 13.

[63] *Catechismus Catholicae Ecclesiae* 102. Пар. *таксама* RUPERTUS TUITIENSIS, *De operibus Spiritus Sancti*, I, 6: *SC* 131, 72-74.

[64] *Enarrationes in Psalmos*, 103, IV, 1: *PL* 37, 1378. Аналагічныя сцвярджэнні ў: ORYGENES, *In Johannem* V, 5-6: *SC* 120, pp. 380-384.

[65] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 21.

[66] *Тамсама*, 9.

[67] Пар. *Propositiones* 5. 12.

была напісана[68]. Слабае разуменне натхнення нараджае небяспеку, што Святое Пісанне будзе чытацца як аб'ект гістарычнай цікаўнасці, а не як справа Духа Святога, у якой можам пачуць голас Пана і пазнаць Яго прысутнасць у гісторыі.

Айцы Сіноду слушна заўважылі, што з тэмай натхнення спалучана таксама тэма *праўды Пісанняў*[69]. Таму паглыбленне дынамікі натхнення несумненна прывядзе таксама да лепшага зразумення праўды, змешчанай у Святых Кнігах. Як вучыць Сабор, натхнёныя Кнігі вучаць праўдзе: «Паколькі ўсё, што сцвярджаюць натхнёныя аўтары, або агіёграфы, павінна лічыцца сцвярджэннем Духа Святога, таму неабходна вызнаваць, што кнігі Пісання трывала, верна і беспамылкова вучаць праўдзе, якую Бог дзеля нашага збаўлення пажадаў замацаваць у Святым Пісанні. Такім чынам, "усякае Пісанне натхнёна Богам і карысна для навучання, для пераконвання, для настаўлення, для выхавання ў праведнасці, каб Божы чалавек быў дасканалы, да ўсякай добрай справы гатовы" (2 *Цім* 3, 16-17)»[70].

Несумненна ў тэалагічным разважанні натхненне і праўда заўсёды лічыліся двума асноўнымі паняццямі касцёльнай герменеўтыкі святых Пісанняў. Аднак трэба прызнаць, што сёння неабходна адпаведна паглыбіць гэтую рэчаіснасць, каб лепш выканаць патрабаванні, якія датычаць інтэрпрэтацыі святых тэкстаў згодна з іх натурай. У сувязі з гэтым спадзяюся, што даследаванні ў гэтай сферы будуць развівацца з карысцю для біблійных дысцыплін, а таксама для духоўнага жыцця вернікаў.

*Бог Айцец, крыніца і пачатак Слова*

20. Эканомія Аб'яўлення мае свой пачатак і сваю крыніцу ў Богу Айцу. Яго словам «створаны нябёсы, дыханнем Яго вуснаў – уся іхняя моц» (*Пс* 33 [32], 6). Гэта Ён асвятляе нас «пазнаннем славы Божай у абліччы Езуса Хрыста» (*2 Кар* 4, 6; пар. *Мц* 16, 17; *Лк* 9, 29).

У Сыне, «*Слове* (*Logos*), якое сталася целам» (пар. *Ян* 1, 14) і які прыйшоў споўніць волю таго, хто Яго паслаў (пар. *Ян* 4, 34), Бог, крыніца Аб'яўлення з'яўляецца як Айцец і вядзе да поўні Божае выхаванне чалавека, якое ўжо мела месца дзякуючы словам прарокаў і вялікім справам, здзейсненым у стварэнні і ў гісторыі Яго народу і ўсіх людзей. Вяршыняй аб'яўлення Бога Айца з'яўляецца ахвяраваны праз Сына дар Параклета (пар. *Ян* 14, 16), Духа Айца і Сына, які нас «навучыць <…> усёй праўдзе» (*Ян* 16, 13).

Такім чынам усе Божыя абяцанні становяцца «так» у Езусе Хрысце (пар. *2 Кар* 1, 20), а чалавек атрымлівае магчымасць стаць на шлях, які вядзе да Айца (пар. *Ян* 14, 6), каб напрыканцы «Бог быў усё ва ўсім» (*1 Кар* 15, 28).

---

[68] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 12.

[69] Пар. *Propositio* 12.

[70] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 11.

21. Як паказвае крыж Хрыста, Бог прамаўляе таксама праз маўчанне. Маўчанне Бога, адчуванне аддалення Усемагутнага і Айца становіцца вырашальным этапам зямнога шляху Божага Сына, уцелаўлёнага Слова. Прыбіты да дрэва крыжа, Ён цярпеў з-за гэтага маўчання: «Божа Мой, Божа Мой, чаму Ты Мяне пакінуў?» (*Мк* 15, 34; *Мц* 27, 46). Трываючы ў паслухмянасці аж да апошняга дыхання жыцця, у змроку смерці, Езус заклікае Айца. Яму аддае сябе ў момант пераходу – праз смерць – да вечнага жыцця: «Ойча, у рукі Твае аддаю дух Мой» (*Лк* 23, 46).

Гэты досвед Езуса можна аднесці да сітуацыі чалавека, які пачуў і пазнаў Слова Бога, а затым павінен праверыць сябе Яго маўчаннем. Гэты досвед мелі многія святыя і містыкі, і сёння таксама адчуваюць гэта многія вернікі на сваім шляху. Маўчанне Бога – працяг Яго папярэдніх слоў. У гэтыя змрочныя хвіліны прамаўляе Ён у таямніцы свайго маўчання. Таму ў дынаміцы хрысціянскага Аб’яўлення маўчанне становіцца як бы важным выражэннем Божага Слова.

## АДКАЗ ЧАЛАВЕКА БОГУ, ЯКІ ПРАМАЎЛЯЕ

### *Пакліканыя да Запавету з Богам*

22. Падкрэсліваючы розныя формы слова, мы маглі ўбачыць, якімі рознымі спосабамі прамаўляе Бог і выходзіць насустрач чалавеку, даючы пазнаць сябе ў дыялогу. Канешне, як слушна заўважылі Айцы Сіноду, «дыялог, калі датычыць Аб’яўлення, прадугледжвае *першынство* Божага слова, скіраванага да чалавека»[71]. Таямніца запавету выражае гэтыя адносіны паміж Богам, які кліча сваім словам, і чалавекам, які адказвае, з поўным разуменнем, што не маецца на ўвазе сустрэча двух раўнапраўных партнёраў; тое, што мы называем Старым і Новым Запаветам, не з’яўляецца актам дамовы паміж двума аднолькавымі бакамі, але выключным Божым дарам. Бог праз гэты дар сваёй любові, перамагаючы ўсялякую адлегласць, сапраўды робіць нас сваімі «партнёрамі», каб магла ажыццявіцца абранніцкая таямніца любові паміж Хрыстом і Касцёлам. У гэтым бачанні кожны чалавек - адрасат слова, заахвочаны і пакліканы весці гэты дыялог любові, даючы свабодны адказ. Так Бог учыніў кожнага з нас здольным *слухаць* Божае слова і *адказваць* на яго. Чалавек створаны ў Слове і ў Ім жыве; ён не можа зразумець самога сябе, калі не адкрыецца на гэты дыялог. Божае Слова паказвае сыноўскую і камунікатыўную натуру нашага жыцця. Сапраўды, моцаю ласкі мы пакліканы прыпадобніцца да Хрыста, Сына Айца, і ў Ім быць пераменены mi.

### *Бог слухае чалавека і адказвае на яго пытанні*

23. У гэтым дыялогу з Богам мы разумеем сябе і знаходзім адказ на самыя хвалюючыя пытанні, схаваныя ў нашым сэрцы. Божае слова не супрацьстаіць чалавеку, не знішчае яго праўдзівых жаданняў, больш за тое, асвячае іх, ачышчае і вядзе да спаўнення. Як жа важна ў наш час адкрыць, што *толькі Бог адказвае на*

[71] *Propositio* 4.

*жаданні сэрца кожнага чалавека*! На жаль, у нашу эпоху, асабліва на Захадзе, распаўсюдзілася перакананне, што Бог не займаецца жыццём і праблемамі чалавека і што Яго прысутнасць можа пагражаць незалежнасці чалавека. На самой справе ўся эканомія збаўлення паказвае нам, што Бог прамаўляе, а таксама дзейнічае ў гісторыі дзеля дабра чалавека і дзеля яго поўнага збаўлення. Таму з пастырскіх меркаванняў прынцыповае значэнне мае паказванне здольнасці Божага слова да дыялогу наконт праблем, з якімі змагацца чалавек у штодзённым жыцці. Менавіта Езус становіцца перад намі як той, хто прыйшоў, каб мы мелі жыццё ў поўні (пар. *Ян* 10, 10). Таму мы павінны прыкладваць розныя намаганні, каб паказваць, што Божае слова адкрытае на нашыя праблемы, што яно дае адказ на нашыя пытанні, што яно больш адкрытае на нашыя ўласныя каштоўнасці і адначасова заспакойвае нашыя ўласныя памкненні. Пастырская дзейнасць Касцёла павінна адпаведна паказваць, што Бог услухоўваецца ў патрэбы чалавека і ў яго заклік. Св. Банавэнтура напісаў у *Breviloquium*: «Плёнам Святога Пісання не з'яўляецца штосьці, але *паўната вечнага шчасця.* Святое Пісанне – гэта кніга, у якой запісаныя словы вечнага жыцця, каб мы не толькі верылі, але таксама мелі вечнае жыццё, у якім будзем бачыць, будзем любіць і ў якім будуць рэалізаваныя ўсе нашыя жаданні»[72].

*Дыялог з Богам Яго словамі*

24. Божае слова рыхтуе кожнага з нас да размовы з Панам: Бог, які прамаўляе, вучыць нас, як мы можам з Ім размаўляць. Узгадваецца тут кніга *Псальмаў*, дзе Ён кажа нам словы, праз якія мы можам звяртацца да Яго, прадстаўляць Яму ў размове нашае жыццё, перамяняючы яго так, каб яно стала дарогай да Бога[73]. У Псальмах паказана ўся гама пачуццяў, якія можа спазнаць чалавек у сваім жыцці і якія ён мудра прадстаўляе Богу; ёсць тут радасць і боль, пакуты і надзея, страх і трывога. Побач з Псальмамі маем тут на ўвазе шмат іншых тэкстаў Святога Пісання, у якіх чалавек звяртаецца да Бога ў форме малітвы-заступніцтва (пар. *Зых* 33, 12-16), песні радасці з прычыны перамогі (пар. *Зых* 15) або скаргі падчас выканання місіі (пар. *Ер* 20, 7-18). Такім чынам слова, якое чалавек скіроўвае да Бога, становіцца Божым словам, што пацвярджае характар дыялогу ўсяго хрысціянскага Аб'яўлення[74], а ўсё існаванне чалавека становіцца дыялогам з Богам, які прамаўляе і слухае, які кліча і абуджае нашае жыццё. Божае слова паказвае, што ўсё жыццё чалавека праходзіць пад знакам Божага паклікання[75].

*Божае слова і вера*

25. «Перад Богам, які аб'яўляецца, трэба захоўваць паслухмянасць веры (пар. *Рым* 16, 26; пар. *Рым* 1, 5; *2 Кар* 10, 5-6), праз якую чалавек цалкам дабравольна даручае

[72] *Prol.*, *Opera Omnia*, V. Quaracchi 1891, pp. 201-202.

[73] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio Lutetiae Parisiorum ad viros culturae deditos apud Collegium a Bernardinis* (12 Septembris 2008): *AAS* 100 (2008), 721-730.

[74] Пар. *Propositio* 4.

[75] Пар. *Relatio post disceptationem*, 12.

сябе Яму, выказваючы “поўнае падпарадкаванне розуму і волі Богу, які аб’яўляецца”, і добраахвотна прымае дадзенае Ім Аб’яўленне»[76]. У гэтых словах Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum* апісала дакладна паставу чалавека адносна Бога. *Адпаведным адказам чалавека Богу, які прамаўляе, з’яўляецца вера.* Тут становіцца зразумелым тое, што «каб прыняць Аб’яўленне, чалавек павінен адкрыць розум і сэрца на дзеянне Духа Святога, які дазваляе яму зразумець Божае слова, прысутнае ў Святых Пісаннях»[77]. Сапраўды, дзякуючы абвяшчэнню Божага слова нараджаецца вера, з якой мы ўсім сэрцам прымаем аб’яўленую нам праўду і даручаем усіх сябе Хрысту: «Вера [залежыць] ад пачутага, а пачутае [здзяйсняецца] праз слова Хрыстовае» (*Рым* 10, 17). Уся гісторыя збаўлення паступова паказвае нам гэтую цесную сувязь паміж Божым словам і верай, якая ажыццяўляецца ў сустрэчы з Хрыстом. Дзякуючы Яму вера набывае форму сустрэчы з Асобай, якой мы даручаем сваё жыццё. Езус Хрыстус сёння надалей прысутнічае ў гісторыі ў сваім целе, якім ёсць Касцёл, таму акт нашай веры з’яўляецца адначасова асабістым і эклезіяльным актам.

*Грэх, як няслуханне Божага слова*

26. Божае слова непазбежна выяўляе таксама драматычную магчымасць таго, што чалавек ў сваёй свабодзе не ўстановіць гэтага дыялогу запавету з Богам, для якога мы былі створаныя. Божае слова кажа таксама пра грэх, які жыве ў сэрцы чалавека. Вельмі часта, як у Старым, так і ў Новым Запавеце, мы сустракаем апісанне граху як *няслуханне слова*, як *парушэнне Запавету*, а значыць як закрытасць на Бога, які запрашае да еднасці з Ім[78]. Святое Пісанне істотна паказвае нам, што грэх чалавека – гэта па сутнасці непаслухмянаць і «няслуханне». Менавіта радыкальная паслухмянасць Езуса аж да крыжовай смерці (пар. *Флп* 2, 8) цалкам адкрывае гэты грэх. Дзякуючы Яго паслухмянасці спаўняецца Новы Запавет паміж Богам і чалавекам, а таксама даецца магчымасць паяднання. Езус быў пасланы Айцом як ахвяра ўміласціўлення за нашыя грахі і за грахі ўсяго свету (пар. *1 Ян* 2, 2; 4, 10; *Гбр* 7, 27). Так міласэрна ахвяруецца нам магчымасць адкуплення і пачатак новага жыцця ў Хрысце. Таму важна, каб вернікі ўмелі распазнаваць корань граху ў няслуханні слова Пана і прымаць у Езусе, Божым Слове, прабачэнне, што адкрывае нас на збаўленне.

*Марыя «Mater Verbi Dei» і «Mater fidei»*

27. Айцы Сіноду абвясцілі, што асноўнай мэтай XII Сходу з’яўляецца «абнаўленне веры Касцёла ў Божае слова». Таму трэба глядзець на тую, у якой дасканала выявілася сувязь паміж Божым словам і верай, гэта значыць на Дзеву Марыю, «якая

[76] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 5.
[77] *Propositio* 4.
[78] Напрыклад, *Дрг* 28, 1-2. 15. 45; 32, 1; сярод прарокаў пар. *Ер* 7, 22-28; *Эзх* 2, 8; 3, 10; 6, 3; 13, 2; аж да апошніх: *Зах* 3, 8. У св. Паўла пар. *Рым* 10, 14-18; *1 Тэс* 2, 13.

праз сваё “так” адносна слова Запавету і сваёй місіі дасканала споўніла Божае пакліканне чалавецтва»[79]. Чалавечая рэчаіснасць, створаная Словам, мае свой дасканалы вобраз менавіта ў паслухмянай веры Марыі. Гэта Яна ад звеставання аж да спаслання Духа Святога паўстае перад намі як жанчына, цалкам гатовая выконваць Божую волю. Беззаганным Зачаццем з'яўляецца тая, якую Бог напоўніў ласкай (пар. *Лк* 1, 28), цалкам паслухмяная Божаму слову (пар. *Лк* 1, 38). Яе паслухмяная вера фарміруе кожную хвіліну Яе жыццё адносна ініцыятывы Бога. Дзева, якая ўважліва слухае, жыве ў поўнай гармоніі з Божым словам; захоўвае ў сваім сэрцы падзеі з жыцця свайго Сына, нібы выкладваючы з іх адну мазаіку (пар. *Лк* 2, 19. 51)[80].

У наш час трэба дапамагчы вернікам лепш пазнаць сувязь паміж Марыяй з Назарэта і поўным веры слуханнем Божага слова. Заахвочваю таксама навукоўцаў да далейшага паглыблення адносін паміж *марыялогіяй і тэалогіяй слова.* Гэта можа прынесці вялікую карысць як для духоўнага жыцця, так і для тэалагічных і біблійных дысцыплін. Тое, што разуменню веры ўдалося адкрыць на тэму Марыі, змяшчаецца ў цэнтры хрысціянскай праўды. На самай справе нельга думаць пра ўцелаўленне Слова, забываючы пра свабоду гэтай маладой жанчыны, якая сваёй згодай прычыняецца да таго, што Спрадвечны ўваходзіць у час. Яна з’яўляецца вобразам Касцёла, што ўслухоўваецца ў Божае Слова, якое ў Ёй становіцца целам. Марыя з’яўляецца таксама сімвалам адкрытасці на Бога і на іншых; сімвалам актыўнага слухання, якое вядзе да глыбокага прыняцця, засваення, у якім Слова становіцца формай жыцця.

28. У гэтым кантэксце хачу звярнуць увагу на сувязь Марыі з Божым словам. Асабліва гэта бачна ў *Magnificat.* Тут у пэўным сэнсе бачна, як Яна атаясамлівае сябе са словам, паглыбляе яго; у гэтым цудоўным спеве веры Дзева праслаўляе Пана Яго словамі: «*Magnificat,* так бы мовіць, партрэт Яе душы, цалкам сатканы з ніцяў Святога Пісання, з ніцяў Божага слова. Такім чынам аб’яўляецца, што ў Божым слове Яна адчувае сябе як дома, натуральна выходзіць і зноў уваходзіць. Яна кажа і думае паводле Божага слова, яно становіцца Яе словам, а Яе слова нараджаецца з Божага слова. Больш за тое, тут аб’яўляецца таксама, што Яе думкі сугучныя Божым, што Яе воля ідзе разам з Божай воляй. Яна, напоўненая Божым словам, можа стаць Маці Уцелаўлёнага Слова»[81].

Акрамя таго, прыклад Маці Божай паказвае нам, што дзеянне Бога ў свеце заўсёды мае сувязь з нашай свабодай, бо ў веры Божае слова нас перамяняе. Таксама нашая апостальская дзейнасць ніколі не будзе плённай, калі мы не навучымся ад Марыі згаджацца на тое, каб нас фарміравала Божае дзеянне: «пабожнае і поўнае любові сузіранне постаці Марыі, як узору і архетыпу веры Касцёла, мае вялікае

[79] *Propositio* 55.
[80] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 33.
[81] Ён жа, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 41.

значэнне для таго, каб таксама сёння дайшло да сапраўднай змены мадэлі адносін Касцёла да Слова, як ў малітоўным слуханні, так і ў ахвярным удзеле ў місіі і абвяшчэнні Слова»[82].

Сузіраючы ў Маці Божай жыццё, цалкам сфарміраванае Словам, мы разумеем, што і нашым пакліканнем з'яўляецца спасціжэнне таямніцы веры, дзякуючы якой Хрыстус прысутнічае ў нашым жыцці. Як нагадвае нам св. Амброзій, кожны веруючы хрысціянін у пэўным сэнсе зачынае і нараджае ў сабе Божае слова: аднак Яна – Маці Хрыста паводле цела, але паводле веры Хрыстус – плод усіх[83]. Таму тое, што здарылася з Марыяй, штодзённа можа нанова адбывацца з кожным з нас, калі мы слухаем Божае слова і цэлебруем сакрамэнты.

## ГЕРМЕНЕЎТЫКА СВЯТОГА ПІСАННЯ Ў КАСЦЁЛЕ

### *Касцёл – адпаведнае месца біблійнай герменеўтыкі*

29. Іншай вялікай тэмай, якая абмяркоўвалася падчас Сіноду і на якой цяпер хачу затрымаць увагу, - гэта *інтэрпрэтацыя Святога Пісання ў Касцёле.* Менавіта цесная сувязь паміж словам і верай указвае, што сапраўдная герменеўтыка Бібліі магчыма толькі ў веры Касцёла, прыкладам якой з'яўляецца «так» Марыі. Св. Банавэнтура сцвярджае, што без веры няма ключа, які б зрабіў магчымым доступ да святога тэксту: «Гэта пазнанне Езуса Хрыста, з якога бярэ пачатак, як з крыніцы, верагоднасць і разуменне ўсяго Святога Пісання. Таму немагчыма, каб хтосьці мог яго спасцігнуць, не маючы найперш веры ў Хрыста, які з'яўляецца лямпай, брамай і фундаментам усяго Святога Пісання»[84]. Св. Тамаш Аквінскі, узгадваючы св. Аўгустына, моцна падкрэслівае: «Літара Евангелля забівала б, калі б у ім не існавала аздараўляльная ласка веры»[85].

Гэта дазваляе нам прыгадаць асноўныя крытэрыі біблійнай герменеўтыкі: *адпаведным месцам інтэрпрэтацыі Бібліі з'яўляецца Касцёл*. Гэтае сцвярджэнне не ўказвае на тое, што Касцёл з'яўляецца знешнім крытэрыем, якому павінны падпарадкоўвацца экзэгеты, але што гэта вынікае з самой натуры Пісанняў і з таго, як яны фарміраваліся ў часе. Сапраўды, «традыцыі веры фарміравалі асяродак жыцця, часткай якога стала пісьменніцкая дзейнасць аўтараў Святога Пісання. Яна была звязана таксама з удзелам у літургічным жыцці і ў знешняй дзейнасці супольнасцяў, у іх духоўным свеце, у іх культуры, а таксама ў іх складаных гістарычных падзеях. Таму інтэрпрэтацыя Святога Пісання таксама патрабуе ад экзэгетаў поўнага разумення жыцця і веры супольнасці веруючых тых часоў»[86]. «Паколькі Святое Пісанне трэба чытаць і інтэрпрэтаваць у тым жа Духу, у якім яно

---

[82] *Propositio* 55.

[83] Пар. *Expositio Evangelii secundum Lucam* 2, 19: *PL* 15, 1559-1560.

[84] *Breviloquium*, *Prol.*, Opera Omnia, V. Quaracchi 1891, pp. 201-202.

[85] *Summa Theologiae*, Ia-IIae, q. 106, art. 2.

[86] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L'interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), III, A, 3: *Ench. Vat.* 13, n. 3035.

было напісана»[87], то неабходна, каб экзэгеты, тэолагі і ўвесь Божы народ ставіліся да яго згодна з тым, чым яно з’яўляецца - Божым Словам, якое аб’яўляецца нам праз пасрэдніцтва чалавечых слоў (пар. *1 Тэс* 2, 13). Гэта - нязменная праўда, якая змешчана таксама ў самой Бібліі: «ніводнае прароцтва ў Пісанні не належыць да прыватнага тлумачэння. Бо прароцтва ніколі не паходзіла з волі чалавека, але ад [імя] Бога абвяшчалі яго людзі, кіраваныя Духам Святым» (*2 П* 1, 20-21). Дарэчы, менавіта вера Касцёла прызнае Біблію Божым словам. Як цудоўна кажа св. Аўгустын, «не верыў бы Евангеллю, каб не схіляў мяне да гэтага аўтарытэт каталіцкага Касцёла»[88]. Дух Святы, які ажыўляе жыццё Касцёла, робіць нас здольнымі да аўтэнтычнай інтэрпрэтацыі Пісанняў. Біблія – гэта кніга Касцёла, а з яе іманэнтнасці ў эклезіяльным жыцці нараджаецца таксама яе сапраўдная герменеўтыка.

30. Св. Геранім нагадвае, што «мы ніколі не можам самі чытаць Святога Пісання. Бо сустракаем зашмат замкнёных дзвярэй і хутка блукаем. Біблія напісана Божым народам і для Божага народу пад натхненнем Духа Святога. Толькі ў гэтай еднасці з Божым народам можам сапраўды дайсці з нашым «мы» да сутнасці праўды, якую Бог хоча нам перадаць»[89]. Вялікі вучоны, для якога «няведанне Пісання – гэта няведанне Хрыста»[90], сцвярджае, што эклезіяльнасць біблійнай інтэрпрэтацыі не з’яўляецца патрабаваннем, прадыктаваным звонку; Кніга – гэта голас пілігрымуючага Божага народу, і толькі ў веры гэтага народу мы можам, калі так можна сказаць, адпаведна «настроіцца», каб зразумець Святое Пісанне. Сапраўдная інтэрпрэтацыя Бібліі павінна гарманічна гучаць разам з верай каталіцкага Касцёла. Св. Геранім такімі словамі звяртаецца да аднаго прэзбітэра: «Моцна трымайся традыцыйнага вучэння, якое табе было перададзена, каб ты мог настаўляць згодна са здаровым вучэннем і абвяргаць аргументы тых, хто яму супрацьстаіць»[91].

Вывучэнне святога тэксту, якое абстрагіруецца ад веры і засяроджвае сваю ўвагу на структуры тэксту і яго формах, можа заўважыць цікавыя элементы, аднак, такія спробы могуць быць толькі ўступнымі і структуральна няпоўнымі. Бо як сцвярджае Папская Біблійная Камісія, навязваючы да прынцыпу, прынятага ў сучаснай герменеўтыцы, «біблійны тэкст можа адпаведна зразумець толькі той, хто сам перажыў тое, пра што кажа тэкст»[92]. Усё гэта падкрэслівае сувязь паміж духоўным жыццём і герменеўтыкай Пісання. Сапраўды, «наколькі ўмацоўваецца Духам Святым жыццё тых, хто чытае натхнёныя тэксты, настолькі паглыбляецца таксама

---

[87] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 12.
[88] *Contra epistulam Manichaei quam vocant fundamenti*, V, 6: *PL* 42, 176.
[89] Пар. BENEDICTUS XVI, *Audientia Generalis* (14 Novembris 2007): *Insegnamenti* III, 2 (2007), 586-591.
[90] *Commentariorum in Isaiam libri*, *Prol.*: *PL* 24, 17.
[91] *Epistula* 52, 7: *CSEL* 54, p. 426.
[92] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L’interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), II, A, 2: *Ench. Vat.* 13, n. 2988.

разуменне рэчаіснасці, пра якую кажуць гэтыя тэксты»[93]. Глыбіня сапраўднага эклезіяльнага досведу спрыяе лепшаму разуменню праўдзівай веры ў святле Божага слова, і наадварот, чытанне ў веры Пісанняў вядзе да ўзрастання эклезіяльнага жыцця. Мы можам тут па-новаму ўсвядоміць славутае сцвярджэнне св. Грыгорыя Вялікага: «Божыя словы ўзрастаюць разам з тым, хто іх чытае»[94]. Такім чынам слуханне Божага слова ўводзіць у эклезіяльную еднасць з пілігрымуючымі ў веры і паглыбляе яе.

*«Душа святой тэалогіі»*

31. «Вывучэнне Святога Пісання ўяўляе як бы душу святой тэалогіі»[95]. Гэты выраз з Дагматычнай канстытуцыі *Dei Verbum* стаў для нас у гэтыя гады больш блізкім. Можам сказаць, што ў час пасля Другога Ватыканскага Сабору ў тэалагічных і экзэгетычных даследаваннях часта згадваліся гэтыя словы як знак новай зацікаўленасці Святым Пісаннем. Таксама XII Сінадальны Сход Біскупаў неаднойчы звяртаўся да гэтага вядомага выразу, каб паказаць сувязь паміж гістарычнымі даследаваннямі і герменеўтыкай веры адносна святога тэксту. У гэтай перспектыве Айцы з радасцю сцвердзілі, што за апошнія дзесяцігоддзі значна паглыбілася вывучэнне Божага слова ў Касцёле, і выказалі з перакананнем вялікую ўдзячнасць многім экзэгетам і тэолагам, якія ахвярна, актыўна і з кампетэнцыяй зрабілі і надалей робяць істотны ўклад у паглыбленне сэнсу Пісанняў, займаючыся складанымі праблемамі, якія наш час ставіць перад біблійнымі даследаваннямі[96]. *Шчырая ўдзячнасць была выказана таксама членам Папскай Біблійнай Камісіі,* якія працавалі ў гэтыя гады і якія, утрымліваючы цесны кантакт з Кангрэгацыяй Веравучэння, надалей уносяць свой кампетэнтны ўклад у вырашэнне канкрэтных пытанняў, звязаных з вывучэннем Святога Пісання. Больш за тое, Сінод выказаў неабходнасць прааналізаваць стан актуальных біблійных даследаванняў і іх значэнне для тэалогіі. Таму што ад плённых сувязяў паміж экзэгезай і тэалогіяй залежыць у значнай ступені эфектыўнасць пастырскай дзейнасці Касцёла, а таксама духоўнага жыцця вернікаў. Таму лічу, што неабходна прыгадаць некаторыя разважанні на гэтую тэму падчас працы Сіноду.

*Развіццё біблійных даследаванняў і Настаўніцкі Інстытут Касцёла*

32. Найперш трэба прызнаць, што гісторыка-крытычная экзэгеза, а таксама іншыя метады аналізу тэксту, якія развіліся ў апошні час, мелі станоўчы ўплыў на жыццё

[93] *Тамсама*, II, A, 2: *Ench. Vat.*, 13, n. 2991.
[94] *Homiliae in Ezechielem* I, VII, 8: *PL* 76, 843 D.
[95] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 24; пар. LEO XIII, Litt. enc. *Providentissimus Deus* (18 Novembris 1893), *Pars II, sub fine*: *ASS* 26 (1893-94), 269-292; BENEDICTUS XV, Litt. enc. *Spiritus Paraclitus* (15 Septembris 1920), *Pars III*: *AAS* 12 (1920), 385-422.
[96] Пар. *Propositio* 26.

Касцёла[97] Для каталіцкага бачання Святога Пісання выкарыстанне гэтых метадаў неабходна і звязана з рэалізмам уцелаўлення: «Гэтая неабходнасць – вынік хрысціянскай праўды, сфармуліраванай у Евангеллі паводле св. Яна 1, 14: *Verbum caro factum est*. Гістарычны факт з'яўляецца асноўным вымярэннем хрысціянскай веры. Гісторыя збаўлення - гэта не міфалогія, але праўдзівая гісторыя, і таму пры яе даследаванні трэба выкарыстоўваць сур'ёзныя метады гістарычных дысцыплін»[98]. Таму вывучэнне Біблii патрабуе ведаў і належнага выкарыстання гэтых даследчых метадаў. Гэта праўда, што адчуванне гэтага ў навуковым свеце інтэнсіўна вырасла ў сучасную эпоху, хоць не ўсюды ў той самай ступені, аднак, да здаровай касцёльнай традыцыі заўсёды належала ўмілаванне вывучэння «літары». Дастаткова згадаць манаскую культуру, дзякуючы якой мы маем фундамент еўрапейскай культуры і ў аснове якой знахозіцца захапленне словам. «У прагненні Бога ёсць любоў да літаратурнай культуры, умілаванне слова <…> у кожным вымярэнні. У біблійным слове Бог ідзе да нас, а мы да Яго, і таму трэба спазнаваць таямніцы мовы, яе структуру і выкарыстанне. Менавіта таму, з увагі хоць бы нават на пошукі Бога, свецкія навукі, якія ўказваюць шлях да мовы, сталі неабходнымі»[99].

33. Жывы Настаўнікі Інстытут Касцёла, якому быў даручаны «абавязак праўдзівай інтэрпрэтацыі пісьмовага ці перададзенага Божага слова»[100], мудра і стрымана выказаўся на тэму належнага стаўлення да ўвядзення новых метадаў гістарычнага аналізу. Асабліва маю на ўвазе энцыклікі *Providentissimus Deus* папы Льва XIII, а таксама *Divino afflante Spiritu* папы Пія XII. Мой шаноўны папярэднік Ян Павел II нагадаў значэнне гэтых дакументаў для экзэгезы і тэалогіі з нагоды святкавання сотай гадавіны апублікавання першага дакумента і пяцідзесятай - другога[101]. Заслуга выступлення папы Льва XIII заключаецца ў абароне каталіцкай інтэрпрэтацыі Біблii ад нападаў рацыяналізму, але не было гэта ўцёкамі ў духоўны сэнс, адарваны ад гісторыі. Не адмаўляючыся ад навуковый крытыкі, ён асцерагаў толькі перад «стэрэатыпамі, якія быццам бы абапіраюцца на навуковых падставах, а на самай справе падступна выводзяць навуку па-за ўласцівыя ёй межы»[102]. У сваю чаргу папа Пій XII адбіваў атакі прыхільнікаў гэтак званай містычнай экзэгезы, што адкідае ўсялякі навуковы падыход. Энцыкліка *Divino afflante Spiritu* з вялікай далікатнасцю

[97] Пар. PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L'interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), A-B: *Ench. Vat.* 13, n. 2846-3150.
[98] BENEDICTUS XVI, *Allocutio in XIV Congregatione Generali Synodi Episcoporum* (14 Octobris 2008): *Insegnamenti* IV, 2 (2008), 492; пар. *Propositio* 25.
[99] Ён жа, *Allocutio Lutetiae Parisiorum ad viros culturae deditos apud Collegium a Bernardinis* (12 Septembris 2008): *AAS* 100 (2008), 722-723.
[100] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 10.
[101] Пар. IOANNES PAULUS II, *Allocutio habita I expleto saeculo a Litteris encyclicis* Providentissimus Deus *necnon L exeunte anno a Litteris encyclicis* Divino afflante Spiritu *foras datis* (23 Aprilis 1993): *AAS* 86 (1994), 232-243.
[102] *Тамасама,* n. 4: *AAS* 86 (1994), 235.

прадухіліла ўзнікненне ідэі, што існуе дыхатомія паміж «навуковай экзэгезай» на карысць апалагетыкі і «духоўнай інтэрпрэтацыяй, прызначанай для ўнутранага карыстання», але пацвердзіла «тэалагічную каштоўнасць метадычна акрэсленага даслоўнага сэнсу», як і прыналежнасць да «экзэгетычных навук вызначэння духоўнага сэнсу <...> »[103]. Такім чынам абодва дакументы адкідваюць «падзел паміж тым, што людское, і тым, што Божае, паміж навуковымі даследаваннямі і позіркам веры, паміж даслоўным сэнсам і духоўным»[104]. Пра гэтую раўнавагу ідзе гаворка таксама ў пазнейшым дакуменце Папскай Біблійнай Камісіі ад 1993 года: «У сваёй інтэрпрэтацыйнай працы каталіцкія экзэгеты ніколі не павінны забываць, што тое, што яны інтэрпрэтуюць, - гэта Божае слова. Іх заданне не заканчваецца разам з адрозненнем крыніц, акрэсліваннем формаў або тлумачэннем літаратурных прыёмаў. Мэта іх працы дасягаецца толькі тады, калі тлумачыць сэнс біблійнага тэксту як актуальнага Божага слова»[105].

*Саборная біблійная герменеўтыка: указанне, якое трэба прыняць*

34. У гэтай перспектыве можна лепш ацаніць уласцівыя каталіцкай экзэгезе вялікія прынцыпы інтэрпрэтацыі, выражаныя Другім Ватыканскім Саборам, асабліва ў Дагматычнай канстытуцы *Dei Verbum*: «У Святым Пісанні Бог гаворыць праз людзей і па-чалавечы, таму, каб выразна ўбачыць, чым Бог хацеў падзяліцца з намі, інтэрпрэтатар Святога Пісання павінен уважліва даследаваць, што сапраўды намерваліся сказаць агіёграфы і што Богу спадабалася паказаць нам праз іх словы»[106]. З аднаго боку як асноўныя элементы, якія дазваляюць адкрыць значэнне, задуманае агіографам, Сабор падкрэслівае даследаванне літаратурных жанраў і кантэксту. З другога боку, паколькі Святое Пісанне трэба інтэрпрэтаваць у тым жа Духу, у якім яно было напісана, Дагматычная канстытуцыя ўказвае тры асноўныя крытэрыі, якія ўлічваюць Боскае вымярэнне Бібліі: 1) трэба інтэрпрэтаваць тэкст, памятаючы, што *Святое Пісанне стварае адно цэлае*; сёння мы называем гэта кананічнай экзэгезай; 2) трэба зважаць на жывую Традыцыю ўсяго Касцёла і, нарэшце, 3) браць пад увагу *аналогію веры*. «Толькі тады, калі суіснуюць гэтыя дзве метадалагічныя, гісторыка-крытычныя і тэалагічныя плыні, можна гаварыць пра тэалагічную экзэгезу, пра адпаведную экзэгезу гэтай Кнігі»[107].

Айцы Сіноду слушна сцвердзілі, што станоўчыя эфекты выкарыстання сучасных гісторыка-крытычных метадаў з'яўляюцца бяспрэчнымі. Але ў той жа час, калі акадэмічная экзэгеза, у тым ліку каталіцкая, вядзецца сёння на высокім узроўні ў сферы гісторыка-крытычнай метадалогіі, таксама дзякуючы самым новым дадзеным,

---

[103] *Тамасама,* n. 5: *AAS* 86 (1994), 235.
[104] *Тамасама,* n. 5: *AAS* 86 (1994), 236.
[105] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L'interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), III, C, 1: *Ench. Vat.* 13, n. 3065.
[106] N. 12.
[107] BENEDICTUS XVI, *Allocutio in XIV Congregatione Generali Synodi Episcoporum* (14 Octobris 2008): *Insegnamenti* IV, 2 (2008), 493; пар. *Propositio* 25.

неабходна аналагічнае вывучэнне тэалагічнага вымярэння біблійных тэкстаў, каб мелі месца тры элементы, указаныя ў Дагматычнай канстытуцыі *Dei Verbum*[108].

*Небяспека дуалізму і секулярызаваная герменеўтыка*

35. У гэтым сэнсе трэба адзначыць, што сёння існуе сур'ёзная небяспека ўзнікнення дуалізму ў падыходзе да святых Пісанняў. Адрозненне двух узроўняў вывучэння Бібліі не мае на мэце ні іх аддзялення, ні супрацьпастаўлення, ні проста параўнання. Яны выступаюць толькі ва ўзаемнай сувязі. На жаль, іх непатрэбнае раздзяленне часта нараджае разыходжанне экзэгезы і тэалогіі, што «здараецца таксама на найвышэйшым акадэмічным узроўні»[109]. Хацеў бы тут адзначыць найбольш непакоячыя вынікі, якіх трэба пазбягаць.

*а*) Перадусім, калі экзэгетычныя даследаванні зводзяцца толькі да першага ўзроўню, тады Пісанне становіцца *толькі тэкстам з мінулага*: «Можна з яго рабіць маральныя высновы, можна вучыцца гісторыі, але Кніга сама па сабе гаворыць толькі пра мінулае, экзэгеза сапраўды перастае быць тэалагічнай, а становіцца толькі гісторыяграфіяй, гісторыяй літаратуры»[110]. Зразумела, што пры такім абмежаванні нельга зразумець падзей Аб'яўлення Бога праз пасрэдніцтва Яго слова, якое перададзена нам у жывой Традыцыі і ў Святым Пісанні.

*б*) Адсутнасць герменеўтыкі веры адносна Святога Пісання не азначае, што яна зусім не выкарыстоўваецца; яе месца непазбежна займае іншая герменеўтыка, секулярызаваная, пазітывісцкая, якая грунтуецца на перакананні, што Божы пачатак не выступае ў людской гісторыі. Згодна з гэтай герменеўтыкай Боскі элемент, калі здаецца, што ён існуе, трэба растлумачыць іншым спосабам і звесці ўсё да чалавечага элементу. Так «узнікаюць інтэрпрэтацыі, якія адмаўляюць гістарычнасць Боскіх элементаў»[111].

*в*) Такая пазіцыя можа толькі пашкодзіць жыццю Касцёла, бо ставіць пад сумненне асноўныя таямніцы хрысціянства і іх гістарычныя каштоўнасці, такія напрыклад, як устанаўленне Эўхарыстыі і ўваскрасенне Хрыста. Такім чынам навязваецца герменеўтыка філасофская, якая адмаўляе магчымасць уваходу Боскага элементу ў гісторыю і прысутнасць у ёй. Прыняцце такога тыпу герменеўтыкі ў межах тэалагічных даследаванняў непазбежна ўводзіць выразны дуалізм паміж экзэгезай, якая канцэнтруецца толькі на першым узроўні, і тэалогіяй, якая прымае плынь, што надае Пісанню значэнне духоўнага характару без уліку гістарычнага характару Аб'яўлення. Гэта ўсё несумненна мае негатыўны ўплыў на духоўнае жыццё і пастырскую дзейнасць. «Вынікам адсутнасці другой метадалагічнай плыні ёсць узнікненне глыбокага падзелу паміж навуковай экзэгезай і *lectio divina*. Менавіта гэта часам нараджае пэўную няўпэўненасць, таксама ў падрыхтоўцы

108 Пар. *Propositio 26.*

109 *Propositio* 27.

110 BENEDICTUS XVI, *Allocutio in XIV Congregatione Generali Synodi Episcoporum* (14 Octobris 2008): *Insegnamenti* IV, 2 (2008), 493; пар. *Propositio* 26.

111 Пар. *тамсама*.

гаміліі»[112]. Трэба таксама адзначыць, што гэты дуалізм з'яўляецца часам прычынай няўпэўненасці і недастаткова глыбокай інтэлектуальнай фармацыі таксама некаторых кандыдатаў да касцёльных паслуг[113]. Урэшце, «там, дзе экзэгеза не з'яўляецца тэалогіяй, Святое Пісанне не можа быць душой тэалогіі, і наадварот, там, дзе тэалогія не з'яўляецца інтэрпрэтацыяй Святога Пісання ў Касцёле, тэалогія пазбаўлена фундаменту»[114]. Таму трэба рашуча і больш уважліва нанова прааналізаваць указанні на гэтую тэму, змешчаныя ў *Dei Verbum.*

*Вера і розум у падыходзе да Святога Пісання*

36. Лічу, што для больш поўнага зразумення экзэгезы, а значыць адносін з усёй тэалогіяй, можа прычыніцца тое, што напісаў Ян Павел II у энцыкліцы *Fides et ratio*. Ён сцвярджае, што «не трэба таксама ігнараваць небяспеку, якая падсцерагае таго, хто спрабуе спасцігнуць праўду Святога Пісання пры дапамозе толькі аднае метадалогіі, забываючы пра неабходнасць больш поўнай экзэгезы, якая дазволіла б яму разам з усім Касцёлам цалкам адкрыць поўны сэнс тэкстаў. Той, хто займаецца вывучэннем Святога Пісання, павінен заўсёды памятаць, што розныя герменеўтычныя метадалогіі таксама заснаваны на пэўных філасофскіх канцэпцыях, таму іх трэба ўважліва вывучыць, перш чым прымяняць для аналізу святых тэкстаў»[115].

Гэтае дальнабачнае разважанне дазваляе нам заўважыць, што ад герменеўтычнага падыходу да Святога Пісання непазбежна залежаць правільныя адносіны паміж верай і розумам. Секулярызаваная герменеўтыка Святога Пісання выкарыстоўваецца розумам, які структуральна не дапускае магчымасці, каб Бог увайшоў у жыццё людзей і прамаўляў да іх людскімі словамі. Таму таксама ў гэтым выпадку трэба заахвочваць да «*пашырэння ўласнай прасторы рацыянальнасці»*[116]. Таксама пры выкарыстанні метадаў гістарычнага аналізу трэба пазбягаць прыняцця, калі такія ўзнікаюць, крытэрыяў, якія папярэдне адкідваюць Божае Аб'яўленне ў жыцці людзей. Злучэнне двух узроўняў працы над інтэрпрэтацыяй Святога Пісання канчаткова прадугледжвае *гармонію паміж верай і розумам*. З аднаго боку, патрэбна вера, якая захоўвае адпаведныя адносіны з правільным розумам, яна ніколі не ператворыцца ў фідэізм, які спрыяў бы фундаментальнаму чытанню Святога Пісання. З другога боку, неабходны розум, які, даследуючы гістарычныя элементы, прысутныя ў Бібліі, будзе адкрыты і не адкіне *a priori* ўсяго, што яго пераўзыходзіць. Зрэшты, рэлігія ўцелаўлёнага *Слова* (*Logos*) павінна быць для глыбока разумнай

[112] *Тамсама*.

[113] Пар. *Propositio* 27.

[114] BENEDICTUS XVI, *Allocutio in XIV Congregatione Generali Synodi Episcoporum* (14 Octobris 2008): *Insegnamenti* IV, 2 (2008), 493-494.

[115] IOANNES PAULUS II, Litt. enc. *Fides et ratio* (14 Septembris 1998), 55.

[116] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad IV Conventum Nationalem Ecclesiae in Italia* (19 Octobris 2006): *AAS* 98 (2006), 804-815.

чалавека, які шчыра шукае праўды, а таксама канчатковага сэнсу свайго жыцця і гісторыі.

*Даслоўны і духоўны сэнс*

37. Як было сцверджана падчас сінадальнага Сходу, у абнаўленні адпаведнай герменеўтыкі Святога Пісання ў значнай ступені дапамагае таксама ўслухоўванне нанова ў Айцоў Касцёла і ўгляданне ў іх экзэгетычны падыход[117]. Тэалогія Айцоў Касцёла і сёння мае вялікую каштоўнасць, бо ў цэнтры яе знаходзіцца цэласнае вывучэнне Святога Пісання. Сапраўды, яны з'яўляюцца перадусім і ў асноўным «каментатарамі Святога Пісання»[118]. Іх прыклад можа «павучыць сучасных экзэгезтаў сапраўды рэлігійнаму падыходу да Святога Пісання і да інтэрпрэтацыі, якая заўсёды з'яўляецца крытэрыем еднасці з досведам Касцёла, які пілігрымуе праз гісторыю пад кіраўніцтвам Духа Святога»[119].

Патрыстычная і сярэднявечная традыцыя, хоць не ведала філасофскіх і гістарычных дасягненняў, якія мае ў распараджэнні сучасная экзэгеза, умела распазнаваць розныя сэнсы Пісання, пачынаючы ад даслоўнага, гэта значыць таго, які «акрэслены словамі Святога Пісання і адкрыты экзэгезай, што абапіраецца на прынцыпах правільнай інтэрпрэтацыі»[120]. Напрыклад св. Тамаш Аквінскі казаў: «Усе віды сэнсу Святога Пісання павінны абапірацца на даслоўным сэнсе»[121]. Аднак трэба памятаць, што ў часы Айцоў Касцёла і сярэднявечча кожная форма экзэгезы, у тым ліку і даслоўная, грунтаваліся на веры і неабавязкова адрознівалі *сэнс даслоўны і сэнс духоўны*. Нагадаем у сувязі з гэтым класічны двуверш, які прадстаўляе сувязь розных сэнсаў Пісання:

«*Littera gesta docet, quid credas allegoria,*
*Moralis quid agas, quo tendas anagogia*.

(Даслоўны сэнс пераказвае падзеі, алегорыя вядзе да веры, сэнс маральны кажа, што трэба рабіць, анагогія – куды імкнуцца)»[122].

Мы заўважаем тут еднасць і сувязь даслоўнага і духоўнага сэнсу, у якім у сваю чаргу вылучаюцца тры сэнсы, якія служаць апісанню пытання веры, маральнасці і эсхаталагічнай мэты.

Так, нарэшце, прызнаючы каштоўнасць і неабходнасць – нягледзячы на яго абмежаванасць – гісторыка-крытычнага метаду, мы вучымся ад патрыстычнай экзэгезы, што «застаёмся вернымі інтэнцыям, змешчаным у біблійных тэкстах, толькі ў такой ступені, у якой стараемся адкрыць у іх фармуліроўках рэчаіснасць

[117] Пар. *Propositio* 6.
[118] Пар. S. AUGUSTINUS, *De libero arbitrio*, III, XXI, 59: *PL* 32, 1300; *De Trinitate*, II, I, 2: *PL* 42, 845.
[119] CONGREGATIO DE INSTITUTIONE CATHOLICA, Instr. *Inspectis dierum* (10 Novembris 1989), 26: *AAS* 82 (1990), 618.
[120] *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 116.
[121] *Summa Theologiae*, I, q. 1, art. 10, ad 1.
[122] *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 118.

веры, якую яны выражаюць, і калі спалучаем гэтую рэчаіснасць з досведам веруючых людзей нашага часу»[123]. Толькі ў гэтай перспектыве можна прызнаць, што Божае слова жывое і прамаўляе да кожнага ў сучаснасці нашага жыцця. У гэтым сэнсе цалкам захоўвае важнасць сцвярджэнне Папскай Біблійнай Камісіі, якая дае азначэнне духоўнаму сэнсу паводле хрысціянскай веры як сэнсу, «выражанаму біблійнымі тэкстамі, зразуметымі пад натхненнем Духа Святога ў кантэксце Пасхальнай таямніцы Хрыста і новага жыцця, якому гэтая таямніца дае пачатак. Такі кантэкст сапраўды існуе. Новы Запавет менавіта ў ім бачыць выкананне Пісання. Таму натуральным з'яўляецца чытанне Святога Пісання ў святле гэтага новага кантэксту, якім ёсць жыццё ў Духу Святым»[124].

*Неабходнасць узнясення над «літарай»*

38. Ва ўзнаўленні сувязяў паміж рознымі сэнсамі Пісання вырашальнае значэнне мае разуменне *пераходу ад літары да духу*. Гэта не аўтаматычны і не спантанны пераход; больш неабходнае ўзнясенне па-над літарай: «Божае слова ніколі не можа проста атаясамлівацца з літаратурным тэкстам. Каб дасягнуць яго, патрэбна ўзнясенне і працэс разумення, кіраваны ўнутранай дынамікай усяго збору тэкстаў, і ў дадатак гэты працэс павінен быць жывым»[125]. І так мы адкрываем, чаму аўтэнтычны працэс інтэрпрэтацыі ніколі не з'яўляецца толькі інтэлектуальным працэсам, але таксама жыццёвым, у якім патрабуецца поўны ўдзел у касцёльным жыцці, як жыцці «паводле духа» (*Гал* 5, 16). Так становяцца больш яснымі крытэрыі, указаныя ў №12 Дагматычнай канстытуцыі *Dei Verbum*: гэтае ўзнясенне не можа датычыць канкрэтнага літаратурнага фрагменту, але павінна адбывацца ў аднясенні да ўсяго Пісання. Бо адно ёсць Слова, да якога мы павінны ўзносіцца. У гэтым працэсе ўзнясення ёсць глыбокі драматызм, бо пераход, які ў моцы Духа адбываецца ў ім, непазбежна звязаны таксама са свабодай кожнага. Св. Павел у поўні дасведчыў у сваім жыцці, чым ёсць гэты пераход. Што азначае ўзнясенне над літарай і разуменне яе толькі з улікам усяго, выразіў ён радыкальным чынам ў выразе: «літара забівае, а дух ажыўляе» (*2 Кар* 3, 6). Св. Павел робіць адкрыццё, што «вызваляючы Дух мае імя, а значыць, што свабода мае глыбокую меру: "Пан ёсць Духам, а дзе Дух Пана, там свабода" (*2 Кар* 3, 17). Вызваляючы Дух – гэта не проста ідэя, гэта асабістае бачанне таго, хто інтэрпрэтуе. Дух – гэта Хрыстус, а Хрыстус ёсць Панам, які паказвае нам шлях»[126]. Ведаем, што таксама для св. Аўгустына гэты пераход быў адначасова драматычным і вызвальным; ён паверыў у Пісанні, якія напачатаку здаваліся яму вельмі неаднастайнымі, а часам поўнымі недарэчнасцяў, менавіта дзякуючы ўзнясенню на іншы ўзровень праз тыпалагічную інтэрпрэтацыю, якой

[123] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L'interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), II, A, 2: *Ench. Vat.* 13, n. 2987.
[124] *Тамсама*, II, B, 2: *Ench. Vat.*, 13, n. 3003.
[125] BENEDICTUS XVI, *Allocutio Lutetiae Parisiorum ad viros culturae deditos apud Collegium a Bernardinis* (12 Septembris 2008): *AAS* 100 (2008), 726.
[126] *Тамсама*.

навучыўся ад св. Амброзія, паводле якога ўвесь Стары Запавет – гэта дарога да Езуса Хрыста. У выпадку св. Аўгустына ўзнясенне над літарай зрабіла верагоднай саму літару і дазволіла яму нарэшце знайсці адказ на глыбокі неспакой яго душы, якая прагнула праўды праўды[127].

*Унутраная еднасць Біблii*

39. Вялікая Традыцыя Касцёла вучыць нас заўважаць у пераходзе ад літары да духу таксама еднасць усяго Святога Пісання, бо адно ёсць Слова Божае, скіраванае да нашага жыцця, якое няспынна заклікае нас да навяртання[128]. Бяспечным праваднікам для нас у гэтым з'яўляюцца словы Хугона з Сан-Віктора: «Усё Святое Пісанне для нас - адна кніга, а гэтай адной кнігай ёсць для нас Хрыстус, бо ўсё Святое Пісанне гаворыць пра Хрыста і спаўняецца ў Хрысце»[129]. Канешне, Біблія, якая разглядаецца з выключна гістарычнага або літаратурнага пункту гледжання, - гэта не проста кніга, але збор літаратурных тэкстаў, рэдакцыя якіх трывала больш за тысяча гадоў, і паасобныя кнігі якой не так лёгка распазнаць як частку цэлага; але існуюць бачныя сувязі паміж імі. Гэта ўжо датычыць зместу Біблii Ізраэля, якую мы, хрысціяне, называем Старым Запаветам. І менавіта так ёсць, калі мы, хрысціяне, злучаем Новы Запавет і яго кнігі – быццам герменеўтычны ключ – з Бібліяй Ізраэля, інтэрпрэтуючы яе як дарогу да Хрыста. У Новым Запавеце ўвогуле не выкарыстоўваецца азначэнне «Пісанне» (пар. *Рым* 4, 3; *1 П* 2, 6), але «Пісанні» (пар. *Мц* 21, 43; *Ян* 5, 39; *Рым* 1, 2; *2 П* 3, 16), «якія аднолькава як цэласнасць будуць затым лічыць адзіным словам Бога, скіраваным да нас»[130]. Гэта выразна паказвае, што менавіта асоба Хрыста надае еднасць усім «Пісанням» у сувязі з адзіным «Словам». Такім чынам можам зразумець, што кажа Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum* у № 12, калі ўказвае на ўнутраную еднасць усёй Біблii як на галоўны крытэрый для правільнай герменеўтыкі веры.

*Сувязь паміж Старым і Новым Запаветам*

40. Што датычыць еднасці Пісанняў у Хрысце неабходна, каб таксама як тэолагі, так і пастыры ўсведамлялі сувязь паміж Старым і Новым Запаветам. Перадусім відавочна, што сам *Новы Запавет прызнае Стары Запавет Божым словам* і таму прымае аўтарытэт Пісанняў габрэйскага народу[131]. Прызнае іх *implicite,* карыстаючыся той самай мовай і звяртаецца часта да фрагментаў гэтых Пісанняў. Прызнае іх выразна, бо цытуе шмат яго фрагментаў і выкарыстоўвае іх у аргументацыі. Такім чынам аргументацыя, якая абапіраецца на тэкстах Старога

---

[127] Пар. ён жа, *Audientia Generalis* (9 Ianuarii 2008): *Insegnamenti* IV, 1 (2008), 41-45.
[128] Пар. *Propositio* 29.
[129] *De arca Noe*, 2, 8: *PL* 176, 642 C-D.
[130] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio Lutetiae Parisiorum ad viros culturae deditos apud Collegium a Bernardinis* (12 Septembris 2008): *AAS* 100 (2008), 725.
[131] Пар. *Propositio* 10; PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *Il popolo ebraico e le sue sacre Scritture nella Bibbia cristiana* (24 Maii 2001), 3-5: *Ench. Vat.* 20, n. 748-755.

Запавету з’яўляецца ў Новым Запавеце галоўнай каштоўнасцю, якая пераўзыходзіць чыста людское разуменне. У чацвёртым Евангеллі Езус сцвярджае, што «Пісання нельга адхіліць» (*Ян* 10, 35), а св. Павел удакладняе ў прыватнасці, што Аб’яўленне Старога Запавету надалей актуальнае для нас, хрысціянаў (пар. *Рым* 15, 4; *1 Кар* 10, 11)[132]. Больш за тое сцвярджаем, што «Езус з Назарэта быў габрэем, а Святая Зямля – гэта родная зямля Касцёла»[133]; карані хрысціянства знаходзяцца ў Старым Запавеце і хрысціянства заўсёды жывіцца з гэтых каранёў. Таму здаровае хрысціянскае вучэнне заўсёды адкідвала ўсялякія новыя формы маркіянізму, які рознымі спосабамі супрацьпастаўляе Стары Запавет Новаму[134].

Акрамя таго сам Новы Запавет кажа пра сваю згоднасць са Старым і абвяшчае, што ў таямніцы жыцця, смерці і ўваскрасення Хрыста святыя Пісанні габрэйскага народу знайшлі сваё дасканалае спаўненне. Аднак трэба заўважыць, што паняцце спаўнення Пісанняў складанае, бо змяшчае тры вымярэнні: асноўны аспект *працягласці* Аб’яўлення Старога Запавету, аспект *парушэння працягласці,* а таксама аспект *спаўнення і трансцэндэнтнасці*. У сэнсе намеру таямніца Хрыста – гэта працяг ахвярнага культу Старога Запавету; аднак яна здзяйснялася вельмі незвычайным чынам, што адпавядае прадказанням многіх прарокаў, і такім чынам дасягнула дасканаласці, якая ніколі раней не была дасягнута. У Старым Завеце існуюць шматлікія напружанні паміж аспектамі інстытуцыянальнымі і прароцкімім. Пасхальная таямніца Хрыста цалкам згодная – аднак непрадказальным чынам – з прароцтвамі і прататыпамі Пісанняў; але змяшчае выразныя аспекты адсутнасці працягласці з увагі на інстытуцыі Старога Запавету.

41. Дадзеныя разважанні паказваюць неад’емную каштоўнасць Старога Запавету для хрысціянаў і адначасова падкрэсліваюць *арыгінальнасць хрысталагічнага чытання.* Касцёл ужо ў апостальскія часы, а пазней у жывой Традыцыі выразна ўказваў на еднасць Божага плану ў абодвух Запаветах праз пасрэдніцтва тыпалогіі, якая не мае арбітральнага характару, але ўпісана ў падзеі, якія прадстаўляе святы тэкст, а значыць адносіцца да ўсяго Пісання. Тыпалогія «распазнае ў Божых справах Старога Запавету прататыпы таго, што Бог здзейсніў у поўні часоў у Асобе свайго ўцелаўлёнага Сына»[135]. Таму хрысціяне чытаюць Стары Запавет у святле Хрыста, які памёр і ўваскрос. Тыпалагічнае чытанне адкрывае глыбокі змест Старога Запавету адносна Новага, аднак нельга забываць, што ён захоўвае сваю каштоўнасць Аб’яўлення, пацверджанага самім нашым Панам (пар. *Мк* 12, 29-31). Таму «таксама Новы Запавет патрабуе, каб ён чытаўся ў святле Старога. Гэта пастаянна рабіла

---

[132] Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 121-122.
[133] *Propositio* 52.
[134] Пар. PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *Il popolo ebraico e le sue sacre Scritture nella Bibbia cristiana* (24 Maii 2001), 19: *Ench. Vat.* 20, n. 799-801; ORIGENES, *Homilia in Numeros* 9, 4: *SC* 415, 238-242.
[135] *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 128.

старажытная хрысціянская катэхеза (пар. *1 Кар* 5, 6-8; 10, 1-11)»[136]. Таму сінадальныя Айцы сцвердзілі, што «габрэйскае разуменне Бібліі можа дапамагчы хрысціянам у разуменні і вывучэнні Пісанняў»[137].

«Новы Запавет схаваны ў Старым, а Стары адкрываецца ў Новым»[138] – так казаў пра гэта з вялікай мудрасцю св. Аўгустын. Таму важна, каб таксама ў пастырстве, як і ў акадэмічных кругах, адпаведна паказваць глыбокія адносіны паміж двума Запаветамі, згадваючы ўслед за св. Грыгорыем, што «тое, што абяцаў Стары Запавет, Новы Запавет паказаў; што той абвяшчае ўкрыта, той адкрыта вызнае як ужо рэальнае. Таму Стары Запавет – гэта прароцтва Новага Запавету; а найлепшым каментарыем да Старога Запавету ёсць Новы Запавет»[139].

*«Змрочныя» старонкі Бібліі*

42. У кантэксце адносін паміж Старым і Новым Запаветам Сінод разгледзеў таксама пытанне змрочных і цяжкіх, з увагі на апісанае ў іх насілле і немаральнасць, старонак Бібліі. У сувязі з гэтым трэба найперш памятаць, што *біблійнае Аб'яўленне мае глыбокія карані ў гісторыі.* Божы намер адкрываецца ў ёй *паступова* і рэалізуецца паволі на *чарговых этапах* нягледзячы на супраціў людзе. Бог выбірае народ і цярпліва яго выхоўвае. Аб'яўленне дастасавана да культурнага і маральнага ўзроўню аддаленых эпох, а значыць расказвае пра такія факты і звычаі, як напрыклад падступнаць, насілле, знішчэнне людзей, не кажучы выразна, што яны з'яўляюцца амаральнымі; тлумачыць гэта гістарычны кантэкст, але такія рэчы могуць уражваць сённяшняга чытача, асабліва, калі забываецца пра многія «змрочныя» паводзіны людзей, якіх заўсёды хапала на працягу стагоддзяў і хапае таксама ў наш час. У Старым Запавеце прадказанне прарокаў скіравана супраць усялякага віду несправядлівасці і насілля, групавога ці індывідуальнага, і такім чынам становіцца прыладаю выхавання, якую Бог дае свайму народу як падрыхтоўку да Евангелля. Таму было б памылкай не зважаць на тыя фрагменты Пісання, якія здаюцца нам праблематычнымі. Наадварот трэба разумець, што чытанне гэтых старонак патрабуе здабывання адпаведных ведаў праз фармацыю, чытаючы тэксты ў іх гісторыка-літаратурным кантэксце і ў хрысціянскай перспектыве, для якой канчатковым герменеўтычным ключом з'яўляецца «Евангелле, а таксама новая запаведзь Езуса Хрыста, рэалізаваная ў Пасхальнай таямніцы»[140]. Таму заахвочваю навукоўцаў і пастыраў дапамагаць усім вернікам пазнаваць і гэтыя старонкі, што дазволіць адкрыць іх значэнне ў святле таямніцы Хрыста.

*Хрысціяне і юдэі адносна святых Пісанняў*

---

136 *Тамсама*, 129.
137 *Propositio* 52.
138 *Quaestiones in Heptateuchum*, 2, 73: *PL* 34, 623.
139 *Homiliae in Ezechielem*, I, VI, 15: *PL* 76, 836 B.
140 *Propositio* 29.

43. Разважаючы пра цесную сувязь Новага Запавету са Старым, натуральна ўвага скіроўваецца на асаблівую сувязь, якая з гэтага нараджаецца, сувязь паміж хрысціянамі і юдэямі, пра якую ніколі нельга забываць. Ян Павел II сказаў юдэям, што яны - «нашыя „умілаваныя браты" ў веры Абрагама, нашага патрыярха»[141]. Канешне, гэтае сцвярджэнне не азначае абыякавасці да парушэння працягласці, пацверджанай у Новым Запавеце, да інстытуцый Старога Запавету, а тым больш да спаўнення Пісанняў у таямніцы Езуса Хрыста, прызнанага Месіяй і Сынам Божым. Аднак гэтая глыбокая і радыкальная розніца не павінна выклікаць узаемнай варожасці. Прыклад св. Паўла (пар. *Рым* 9-11) паказвае, што наадварот пастава прыняцця, павагі і любові да габрэйскага народу - гэта адзіная сапраўды хрысціянская пастава ў гэтай сітуацыі, якая таямнічым чынам з'яўляецца часткай цалкам станоўчага Божага плану[142]. Св. Павел сцвярджае, што габрэі адносна «выбрання – ўмілаваныя дзеля айцоў. Бо дары і пакліканне Божае нязменныя» (*Рым* 11, 28-29).

Больш за тое, св. Павел апісвае вельмі сцісла адносіны паміж хрысціянамі і юдэямі, карыстаючыся прыгожым вобразам аліўкавага дрэва: параўноўвае Касцёл язычнікаў да дзікай аліўкі, прышчэпленай да шляхетнага аліўкавага дрэва, якім ёсць народ Запавету (пар. *Рым* 11, 17-24). Таму мы жывімся з тых самых духоўных каранёў. Сустракаемся як браты – браты, адносіны якіх у пэўныя перыяды гісторыі былі напружаныя, але цяпер актыўна ўдзельнічаюць у будаванні мастоў трывалага сяброўства[143]. Папа Ян Павел II сказаў: «Нас многае яднае. Вельмі шмат можам разам зрабіць для спакою і справядлівасці, каб пабудаваць больш людскі і братэрскі свет »[144].

Хачу яшчэ раз пацвердзіць, што вельмі каштоўным для Касцёла з'яўляецца *дыялог з юдэямі*. Было б добра, каб там, дзе ёсць нагода, ствараць магчымасць, таксама публічна, для сустрэчы і канфрантацыі, што спрыяла б паглыбленню ўзаемнага пазнання, узаемнай павагі, а таксама супрацоўніцтву, уключна з даследаваннем Святога Пісання.

*Фундаментальная інтэрпрэтацыя Святога Пісання*

44. Разважанні на тэму біблійнай герменеўтыкі ў яе розных аспектах, якія мы вялі дагэтуль, дазваляюць нам разгледзець праблему фундаментальнай інтэрпрэтацыі Святога Пісання[145], якая шматразова закраналася падчас сінадальных дэбатаў.

---

[141] IOANNES PAULUS II, *Nuntius ad Rabbinum Principem Romae* (22 Maii 2004): *Insegnamenti,* XXVII,1 (2004), 655.

[142] Пар. PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *Il popolo ebraico e le sue sacre Scritture nella Bibbia cristiana* (24 Maii 2001), 87: *Ench. Vat.*, 20, n. 1150.

[143] Пар. BENEDICTUS XVI, *Salutatio in Aeroportu internationali Ben Gurion in Tel Aviv* (15 Maii 2009): *Insegnamenti* V,1 (2009), 847-849.

[144] IOANNES PAULUS II, *Allocutio ad Rabbinos Principes Israelis* (23 Martii 2000): *Insegnamenti,* XXIII, 1 (2000), 434.

[145] Пар. *Propositiones* 46. 47.

Папская Біблійная Камісія ў дакуменце *Інтэрпрэтацыя Бібліі ў Касцёле* сфармуліравала адносна гэтага важныя ўказанні. У сувязі з гэтым хацеў бы звярнуць асаблівую ўвагу на тыя спосабы чытання, якія не шануюць аўтэнтычнай натуры святога тэксту, даючы пачатак *суб'ектыўным і арбітральным інтэрпрэтацыям*. «Літаральнасць», якую абараняе фундаментальнае чытанне, на самой справе з'яўляецца здрадай як даслоўнага сэнсу, так і духоўнага, адкрываючы дарогу рознага тыпу інструменталізацыі, напрыклад, пашыраючы антыкасцёльную інтэрпрэтацыю Пісанняў. Праблематычны аспект фундаментальнага чытання заключаецца ў тым, што «адмаўленне разглядаць гістарычны характар біблійнага Аб'яўлення выклікае няздольнасць цалкам прыняць праўду пра Уцелаўленне. Фундаменталізм не зважае на цесную сувязь таго, што Божае, з тым, што чалавечае ў адносінах з Богам. <...> З гэтай прычыны ён схільны лічыць біблійны тэкст як бы прадыктаваным Духам, слова за словам, і не прызнае, што Божае слова было сфармуліравана ў мове і фразеалогіі, абумоўленых дадзенай эпохай»[146]. Наадварот, хрысціянства бачыць *у* словах *адзінае* Слова, сам *Logos*, які адкрывае сваю таямніцу праз гэтую разнастайнасць і рэальнасць чалавечай гісторыі[147]. Сапраўдным адказам на фундаментальную інтэрпрэтацыю з'яўляецца «чытанне Святога Пісання, прасякнутае верай». Практыкаванае са старажытных часоў у Традыцыі Касцёла, яно шукае збаўчай праўды для жыцця кожнага верніка і для Касцёла. Такое чытанне прызнае гістарычную каштоўнасць біблійнай традыцыі. Менавіта з увагі на гэтую каштоўнасць гістарычнага сведчання яно прагне нанова адкрыць жывое значэнне святых Пісанняў для жыцця сённяшняга верніка»[148], не забываючы пра чалавечае вымярэнне натхнёнага тэксту і пра яго літаратурныя жанры.

*Дыялог паміж пастырамі, тэолагамі і экзэгетамі*

45. Аўтэнтычная герменеўтыка веры мае пэўныя важныя вынікі ў сферы пастырскай дзейнасці Касцёла. Менавіта ў гэтай сферы сінадальныя Айцы парэкамендавалі, напрыклад, больш частыя кантакты паміж пастырамі, экзэгетамі і тэолагамі. Было выказана пажаданне, каб Канферэнцыі Біскупаў паспрыялі гэтым сустрэчам «з мэтаю паглыблення еднасці ў служэнні Божаму слову»[149]. Такога тыпу супрацоўніцтва дапаможа ўсім лепш выконваць сваю працу дзеля дабра ўсяго Касцёла. Па сутнасці, калі глядзець з перспектывы пастырскай працы, гэта азначае, таксама для навукоўцаў, падыход да святога тэксту як да таго, які мае характар навіны, з якой Пан звяртаецца да людзей дзеля іх збаўлення. Таму, як кажа Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum*, «экзэгеты і іншыя рупліўцы святой тэалогіі павінны цесна аб'ядноўваць свае сілы і прыкладаць намаганні, каб пад кіраўніцтвам

---

[146] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L'interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), I, F: *Ench. Vat.*, 13, n. 2974.
[147] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio Lutetiae Parisiorum ad viros culturae deditos apud Collegium a Bernardinis* (12 Septembris 2008): *AAS* 100 (2008), 726.
[148] *Propositio* 46.
[149] *Propositio* 28.

святога Настаўніцкага Інстытута Касцёла і з выкарыстаннем адпаведных дапаможных сродкаў Святое Пісанне так даследавалася і выкладалася, каб усе шматлікія слугі Божага слова маглі забяспечыць Божаму народу плённы спажытак Пісання, які б асвятляў дух, умацоўваў волю і запальваў у людскіх сэрцах любоў да Бога»[150].

*Біблія і экуменізм*

46. Сінод, усведамляючы тое, што падмуркам Касцёла ёсць Хрыстус, Божае Слова, якое сталася целам, звярнуў увагу на прынцыповую ролю біблійных даследаванняў у экуменічным дыялогу, які мае на мэце поўнае выражэнне еднасці ўсіх веруючых ў Хрыста[151]. У самім Святым Пісанні знаходзім гарачую малітву Езуса да Айца, каб Яго вучні былі адно, каб свет паверыў (пар. *Ян* 17, 21). Усё гэта ўмацоўвае нас у перакананні, што сумеснае слуханне і разважанне Пісанняў дазваляе нам жыць у сапраўднай еднасці, хоць яшчэ яна няпоўная[152]; «таму супольнае слуханне Пісанняў заахвочвае да дыялогу любові і прычыняецца да паглыблення дыялогу праўды»[153]. Супольнае слуханне Божага слова, практыкаванне *lectio divina* Біблії, захапленне навізной Божага слова, якое ніколі не старэе і не заканчваецца, перамаганне нашай глухаты на гэтыя словы, якія не згаджаюцца з нашымі меркаваннямі або прадузятасцю, слуханне і даследаванне яго ў супольнасці веруючых усіх часоў – усё гэта з’яўляецца дарогай, якую трэба прайсці, каб дасягнуць адзінства веры як адказу на слуханне Слова[154]. З гэтага пункту гледжання сапраўды знамянальным было выказванне Другога Ватыканскага Сабору: «Святыя Словы з’яўляюцца ў гэтым дыялогу [экуменічным] надзвычайным сродкам у магутных Божых руках для дасягнення той еднасці, якую Збаўца прапануе ўсім людзям»[155]. Таму прысвячэнне больш часу на вывучэнне, абмен думкамі і экуменічныя набажэнствы Божага слова, з ушанаваннем існуючых правіл і розных традыцый, гэта добрая справа[156]. Такія набажэнствы служаць экуменізму, а калі перажываюцца згодна з іх праўдзівым значэннем, з’яўляюцца важнымі хвілінамі аўтэнтычнай малітвы, у якой можна прасіць Бога прыспешыць надыход жаданага дня, у якім усе зможам прыступіць да таго самага стала і піць з аднаго келіха. Хоць арганізаванне такіх сустрэч слушная справа і годная пахвалы, аднак трэба зважаць, каб яны не прапаноўваліся вернікам замест удзелу ў св. Імшы ў абавязковыя святочныя дні.

---

[150] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 23.

[151] Аднак нагадваем, калі гаворка ідзе пра гэтак званыя Дэутэракананічныя кнігі Старога Запавету, а таксама пра іх натхненне, то каталікі і праваслаўныя не маюць дакладна такога самага біблійнага канону, як англікане і пратэстанты.

[152] Пар. *Relatio post disceptationem*, 36.

[153] *Propositio* 36.

[154] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad XI Ordinarium Consilium Secretariae Generalis Synodi Episcoporum* (25 Ianuarii 2007): *AAS* 99 (2007), 85-86.

[155] CONC. OECUM. VAT. II, Decr. de Oecumenismo *Unitatis redintegratio*, 21.

[156] Пар. *Propositio* 36.

У даследаванні і малітве выразна заўважаем аспекты, якія трэба паглыбіць і якія нас яшчэ аддаляюць, як напрыклад, зразуменне аўтарытарнага суб'екту інтэрпрэтацыі ў Касцёле, а таксама галоўную ролю Настаўніцкага Інстытута Касцёла[157].

Акрамя таго, хацеў бы падкрэсліць тое, што сказалі Айцы Сіноду пра значэнне *перакладаў Бібліі на розныя мовы* ў гэтай экуменічнай справе. Ведаем, што пераклад тэксту не з'яўляецца чыста механічнай справай, але ў пэўным сэнсе гэта частка працэсу інтэрпрэтацыі. Наконт гэтага шаноўны Ян Павел ІІ сказаў: «Хто памятае, што дыскусіі вакол Святога Пісання значна прычыніліся да падзелаў, асабліва на Захадзе, зможа зразумець, якім важным крокам наперад з'яўляюцца такія сумесныя пераклады»[158]. Таму падтрымка сумесных перакладаў Бібліі адносіцца да экуменічнай дзейнасці. Хачу падзякаваць усім, хто ўдзельнічае ў гэтай важнай дзейнасці і заахвочваю іх працягваць гэтую справу.

*Наступствы для вывучэння тэалогіі*

47. Іншым вынікам адпаведнай герменеўтыкі веры ёсць неабходнасць паказаць яе вынікі ў сферы экзэгетычнай і тэалагічнай фармацыі, асабліва тых, хто з'яўляецца кандыдатамі да святарства. Трэба паклапаціцца аб тым, каб вывучэнне Святога Пісання было сапраўды душой тэалогіі, бо ў ім пазнаецца Божае слова, якое сёння прамаўляе да свету, да Касцёла і да кожнага асабіста. Важна, каб указаныя ў № 12 Дагматычнай канстытуцыі *Dei Verbum* крытэрыі сапраўды браліся пад увагу і паглыбляліся. Трэба асцерагацца канцэпцый навуковых даследаванняў, якія лічацца нейтральнымі адносна Святога Пісання. Таму акрамя вывучэння моў, на якіх была напісана Біблія, а таксама адпаведных метадаў інтэрпрэтацыі, студэнты павінны развіваць глыбокае духоўнае жыццё, што дазволіць ім зразумець сябе, і што Пісанне можна зразумець толькі тады, калі ім жывеш.

У гэтай перспектыве рэкамендую, каб вывучэнне Божага слова, пераказанага і напісанага, заўсёды адбывалася ў глыбокім касцёльным духу, належным чынам улічваючы ў акадэмічнай фармацыі выказванні на гэтую тэму Настаўніцкага Інстытута, які «не вышэйшы за Божае слова, але служыць яму, навучаючы толькі таму, што было перададзена. З Божага наказу і з дапамогай Духа Святога ён пабожна слухае Божае слова, свята захоўвае, верна тлумачыць яго»[159]. Таму трэба клапаціцца аб тым, каб даследаванню спадарожнічала ўсведамленне таго, што «Святая Традыцыя, Святое Пісанне і Настаўніцкі Інстытут Касцёла паводле наймудрэйшай задумы Божай настолькі звязаны і злучаны паміж сабой, што без аднаго няма і другога»[160]. Таму выказваю пажаданне, каб згодна з вучэннем Другога Ватыканскага

[157] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 10.
[158] Enc. *Ut unum sint* (25 maja 1995), 44: *AAS* 87 (1995), 947.
[159] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 10.
[160] *Тамсама*.

Сабору вывучэнне Святога Пісання, чытанага ў еднасці паўсюднага Касцёла, сапраўды стала як бы душой тэалагічнага даследавання[161].

*Святыя і інтэрпрэтацыя Пісання*

48. Інтэрпрэтацыя Святога Пісання не была б поўнай, калі б мы не выслухалі таксама тых, *хто сапраўды жыў Божым словам, гэта значыць святых*[162]. Сапраўды, «*viva lectio est vita bonorum*»[163]. Найглыбейшая інтэрпрэтацыя Пісання паходзіць ад тых, хто дазволіў Божаму слову фарміраваць сябе праз яго слуханне, чытанне і глыбокае разважанне.

Несумненна, невыпадкова вялікія духоўнасці, якімі адзначаецца гісторыя Касцёла, нарадзіліся дзякуючы выразнаму аднясенню да Пісання. Я думаю, напрыклад, пра св. Антонія абата, якога ўзрушылі словы Хрыста: «Калі хочаш быць дасканалым, ідзі, прадай маёмасць сваю і раздай убогім, і будзеш мець скарб у нябёсах; пасля прыходзь і ідзі за Мною» (*Мц* 19, 21)[164]. Не менш пераканаўчы і св. Базыль Вялікі, які ў творы *Moralia* задае пытанне: «Што з’яўляецца ўласцівасцю веры? Поўная і цвёрдая ўпэўненасць у праўдзе слоў, натхнёных Богам. <...> Што з’яўляецца ўласцівасцю верніка? Выхаванне сябе з той выключнай упэўненасцю паводле слоў Пісання, каб не адважыцца штосьці адняць або дадаць»[165]. Св. Бэнэдыкт у сваёй *Рэгуле* паказвае Святое Пісанне як «найпрацейшую норму жыцця чалавека»[166]. Св. Францішак Асізскі, як піша Тамаш з Чэлана, «чуючы, што вучні Хрыста не павінны мець ні золата, ні срэбра, ні грошай, не браць у дарогу торбы, хлеба і кія, і не мець сандалей, ні двух вопраткак <...> адразу ж закрычаў, радуючыся ў Духу Святым: Гэтага хачу, аб гэтым прашу, гэта жадаю чыніць усім сэрцам!»[167] Св. Клара з Асізі дакладна наследуе жыццё Францішка: «Вось рэгула закону ўбогіх сясцёр: захоўваць святое Евангелле Пана нашага Езуса Хрыста»[168]. А св. Дамінік Гусман «усюды ў словах і чынах быў евангельскім мужам»[169] і хацеў, каб такімі былі таксама яго браты-казнадзеі - «евангельскімім людзьмі»[170]. Св. Тэрэза ад Езуса, кармэлітанка, якая ў сваіх творах няспынна звяртаецца да біблійных вобразаў, каб растлумачыць свой містычны досвед, успамінае, што сам Езус ёй аб’яўляе, што «усё зло свету нараджаецца з адсутнасці выразнага пазнання праўды Святога Пісання[171]. Св. Тэрэза ад Дзіцятка Езус адкрывае ў Любові сваё асабістае пакліканне падчас

---

[161] Пар. *тамсама*, 24.
[162] Пар. *Propositio* 22.
[163] S. GREGORIUS MAGNUS, *Moralia in Iob* XXIV, VIII, 16: *PL* 76, 295.
[164] S. ATHANASIUS, *Vita Antonii*, 2, 4: *PL* 73, 127.
[165] *Moralia, Regula* LXXX, XXII: *PG* 31, 867.
[166] *Regula*, 73.3: *SC* 182, 672.
[167] *Vita prima Sancti Francisci*, IX.22: *FF* 670. 672.
[168] *Regula*, I, 1-2: *FF* 2750.
[169] B. IORDANUS DE SAXONIA, *Libellus de principiis Ordinis Praedicatorum*, 104: *Monumenta Fratrum Praedicatorum Historica*, Romae 1935, 16, p. 75.
[170] ORDO FRATRUM PRAEDICATORUM, *Primae Constitutiones seu Consuetudines*, II, XXXI.
[171] *Vita* 40, 1.

разважання Пісанняў, асабліва раздзелаў 12 і 13 Першага паслання да Карынцянаў[172]. Гэтая святая кармэлітанка апісвае захапленне Святым Пісаннем: «Ледзь скірую позірк на святое Евангелле, адразу ж дыхаю водарам жыцця Езуса і ведаю, у які бок бегчы»[173]. Кожны святы ёсць як бы промнем святла, які выходзіць з Божага слова. Тут маем на ўвазе таксама св. Ігнацыя Лаёлу і яго пошук праўды, а таксама духоўнае распазнанне; св. Ян Боска і яго захапленне выхаваннем моладзі; св. Ян Марыя Віянэй і яго разуменне велічы святарства як дару і задання; св. Пій з П'етральчына, які быў прыладаю Божай міласэрнасці; св. Юзаф Марыя Эскрыва і яго прапаведаванне пра паўсюднае пакліканне да святасці; бл. Тэрэза з Калькуты, місіянерка Божай любові да самых малых; а таксама мучанікаў нацызму і камунізму, прадстаўленых, з аднаго боку, св. Тэрэзай Бэнэдыктай ад Крыжа (Эдытай Штайн), кармэлітанскай манашкай, а з другога – бл. Алаізіем Стэпінакам, кардыналам, арцыбіскупам Загрэба.

49. Пэўным чынам святасць, звязаная з Божым словам, упісваецца так у прароцкую традыцыю, у якой Божае слова карыстаецца жыццём прарока. У гэтым сэнсе святасць у Касцёле – гэта герменеўтыка Пісання, ад якой ніхто не можа адмовіцца. Той самы Дух Святы, які натхніў святых аўтараў, пабуджае святых аддаць жыццё дзеля Евангелля. Вучыцца ў іх – надзейны шлях да жывой і плённай герменеўтыкі Божага слова.

Непасрэднае сведчанне гэтай сувязі паміж Божым словам і святасцю мы мелі падчас XII Сінадальнага Сходу, калі 12 кастрычніка 2008 года на плошчы св. Пятра адбывалася кананізацыя чатырох новых святых: прэзбітэра Каетана Эрыка, заснавальніка манаскай супольнасці Місіянераў Найсвяцейшага Сэрца Езуса і Марыі; маці Марыіі Бэрнарды Бютлер, якая нарадзілася ў Швейцарыі, місіянеркі Эквадора і Калумбіі; сястры Альфонсы ад Беззаганнага Зачацця, першай кананізаванай святой, народжанай у Індыі; маладой свецкай эквадоркі Нарцызы ад Езуса Марсіліі Моран. Сваім жыццём яны далі свету і Касцёлу сведчанне няспыннай пlённасці Евангелля Хрыста. Просім Пана, каб праз заступніцтва гэтых святых, кананізаваных менавіта ў дні сінадальнага Сходу, прысвечанага Божаму слову, нашае жыццё стала той «ураджайнай глебай», на якой Боскі Сейбіт можа сеяць слова, каб яно прынесла ў нас плён святасці у трыццаць, у шэсцьдзесят, у сто разоў (пар. *Мк* 4, 20).

[172] Пар. Historia animae, Ms B, 3r°.
[173] *Тамсама*, Ms C 35v°.

Частка другая

*VERBUM IN ECCLESIA*
*«А тым, хто прыняў Яго,*
*дало ўладу стаць Божымі дзецьмі» (Ян* 1, 12*)*

## БОЖАЕ СЛОВА І КАСЦЁЛ

*Касцёл прымае Слова*
50. Пан вымаўляе сваё Слова, каб Яго прынялі тыя, хто быў створаны менавіта «праз» тое самае Слова. «Да свайго прыйшло» (*Ян* 1, 11); ад пачатку Слова не чужое нам, а стварэнне і Божае жыццё павінны былі быць у цесных адносінах. Пралог чацвёртага Евангелля кажа пра адкідванне Божага Слова «сваімі», якія «Яго не прынялі» (*Ян* 1, 11). Не прыняць Яго - значыць не слухаць Яго голасу, не падпарадкавацца *Слову* (*Logos*). Але там, дзе чалавек, хоць слабы і грэшны, шчыра адкрываецца на сустрэчу з Хрыстом, распачынаецца радыкальная перамена: «А тым, хто прыняў Яго, дало ўладу стаць Божымі дзецьмі» (*Ян* 1, 12). Прыняць Слова значыць дазволіць, каб Яно нас фарміравала, каб мы моцаю Духа Святога прыпадобніліся да Хрыста, Адзінароднага Сына, які прыходзіць ад Айца (пар. *Ян* 1, 14). Гэта пачатак новага стварэння, нараджэнне новага стварэння, новага народу. Тыя, хто верыць, гэта значыць тыя, хто паслухмяны веры, хто «ад Бога нарадзіўся» (*Ян* 1, 13), становяцца ўдзельнікамі Божага жыцця: «сынамі ў Сыне» (пар. *Гал* 4, 5-6; *Рым* 8, 14-17). Св. Аўгустын, каменціруючы гэты ўрывак Евангелля паводле Яна, вобразна кажа: «Ты быў створаны праз Слова, але неабходна, каб праз Слова адрадзіўся»[174]. Вымалёўваецца тут аблічча Касцёла як рэчаіснасці, акрэсленай прыняццем Божага Слова, якое становіцца целам, якое прыйшло і *пасялілася між нас* (пар. *Ян* 1, 14). Гэтае прабыванне Бога сярод людзей, гэтае *shekinah*, прадказанае ў Старым Запавеце (пар. *Зых* 26, 1), адбываецца цяпер праз канчатковае прабыванне Бога з людзьмі ў Хрысце.

*Пастаянная прысутнасць Хрыста ў жыцці Касцёла*
51. Адносін паміж Хрыстом, Словам Айца, і Касцёлам нельга разумець у катэгорыях звычайнай падзеі мінулага, бо гэта жывыя адносіны, да ўстанаўлення якіх пакліканы кожны вернік. Мы кажам пра прысутнасць Божага Слова сярод нас сёння: «Я з вамі ва ўсе дні аж да сканчэння веку» (*Мц* 28, 20). Папа Ян Павел II казаў: «Пастаянная прысутнасць Хрыста каля чалавека кожнай эпохі ажыццяўляецца ў Яго целе, якім ёсць Касцёл. Таму Хрыстус абяцаў сваім вучням Духа Святога, які павінен быў ім «нагадаць» і растлумачыць Яго запаведзі (пар. *Ян* 14, 26) і стаць крыніцай новага жыцця ў свеце (пар. *Ян* 3, 5-8; *Рым* 8, 1-13)»[175]. Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum* выяўляе гэтую таямніцу, карыстаючыся біблійным вобразам абранніцкага

---

[174] *In Iohannis Evangelium Tractatus,* I, 12: *PL* 35, 1385.
[175] Litt. enc. *Veritatis splendor* (6 Augusti 1993), 25: *AAS* 85 (1993), 1153.

дыялогу: «Бог, які калісьці прамовіў, няспынна размаўляе з абранніцай свайго ўмілаванага Сына. І Дух Святы, праз якога ў Касцёле, а праз яго і ва ўсім свеце гучыць жывы голас Евангелля, прыводзіць вернікаў да паўнаты праўды і шчодра пасяляе ў іх слова Хрыста (пар. Клс 3, 16)»[176].

Абранніца Хрыста, настаўніца слухання, з верай паўтарае і сёння: «Кажы, Пане, Твой Касцёл Цябе слухае»[177]. Таму Дагматычная канстытуцыя *Dei Verbum* пачынаецца словамі: «Пабожна слухаючы і верна абвяшчаючы Божае слова, Святы Сабор <...> »[178]. Фактычна гэта дынамічнае азначэнне жыцця Касцёла: «Гэтымі словамі Сабор паказвае тое, што адрознівае Касцёл: ён з’яўляецца супольнасцю, якая слухае Божае слова і абвяшчае яго. Касцёл не жыве самім сабою, але Евангеллем, з якога заўсёды і пастаянна нанова чэрпае ўказанні на далейшую дарогу. Толькі той, хто найперш слухае Божае слова, можа стаць пазней яго вестуном. Гэтыя словы павінен узяць сабе да сэрца і аднесці да сябе кожны хрысціянін»[179]. У Божым слове, абвешчаным і слуханым, а таксама ў сакрамэнтах Езус кажа сёння, цяпер і тут, кожнаму з нас: «Я - твой, аддаюся табе», каб чалавек мог Яго прыняць і адказаць: «Я - твой»[180]. Так Касцёл паўстае як асяродак, у якім дзякуючы ласцы мы можам адчуць тое, пра што кажа Пралог св. Яна: «А тым, хто прыняў Яго, дало ўладу стаць Божымі дзецьмі» (*Ян* 1, 12).

## ЛІТУРГІЯ – ПРЫВІЛЕЯВАНАЕ МЕСЦА БОЖАГА СЛОВА

### *Божае слова ў святой Літургіі*

52. Гледзячы на Касцёл як на «дом Слова»[181], трэба найперш сканцэнтраваць увагу на святой Літургіі. Бо гэта прывілеяваны асяродак, у якім Бог прамаўляе да нас у рэчаіснасці нашага жыцця, прамаўляе сёння да свайго народу, які слухае і адказвае. Кожнае літургічнае дзеянне па сваёй натуры насычана Святым Пісаннем. Як сцвярджае канстытуцыя *Sacrosanctum Concilium*, «Святое Пісанне мае найвялікшае значэнне ў цэлебрацыі Літургіі, бо з яго бяруцца чытанні, якія тлумачацца ў гаміліі, і псальмы, якія спяваюцца. З яго чэрпаюць сваё натхненне і свой дух просьбы, малітвы і літургічныя песні. У ім таксама трэба шукаць значэнне дзеянняў і знакаў»[182]. Больш за тое, трэба сказаць, што сам Хрыстус «прысутнічае ў сваім слове, бо калі ў Касцёле чытаюць Святое Пісанне, гаворыць Ён сам»[183]. Сапраўды, «літургічная цэлебрацыя становіцца няспынным, поўным і дзейсным абвяшчэннем

---

[176] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 8.
[177] *Relatio post disceptationem*, 11.
[178] N. 1.
[179] BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad Conventum internationalem* «La sacra Scrittura nella vita della Chiesa» (16 Septembris 2005): *AAS* 97 (2005), 956.
[180] Пар. *Relatio post disceptationem*, 10.
[181] *Nuntius conclusivus*, III,6.
[182] CONC. OECUM. VAT. II, Const. de sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 24.
[183] *Тамсама*, 7.

Божага слова. Такім чынам, Божае слова, якое абвяшчаецца ў Літургіі, заўсёды з'яўляецца жывым і дзейсным праз моц Духа Святога і выяўляе чынную і невычэрпную ў сваёй плённасці любоў Айца да людзей»[184]. Касцёл заўсёды даваў сведчанне разумення, што ў літургічнай дзейнасці Божае слова лучыцца з унутраным дзеяннем Духа Святога, праз якога яно дзейнічае ў сэрцы вернікаў. На самай справе гэта дзякуючы Параклету «Божае слова становіцца падмуркам літургічнага дзеяння, нормай і падтрымкай усяго жыцця. Дзеянне Святога Духа <...> падказвае сэрцу кожнага ўсё тое, што пры абвяшчэнні Божага слова гаворыцца для ўсёй супольнасці вернікаў. Умацоўваючы адзінства ўсіх, Дух Святы ажыўляе розныя дары і спрыяе іх разнастайнаму праяўленню»[185].

Таму трэба зразумець і выкарыстаць асноўнае значэнне, якое літургічнае дзеянне мае для зразумення Божага слова. У пэўным сэнсе *пунктам аднясення герменеўтыкі веры, якая датычыць Святога Пісання, павінна быць заўсёды Літургія*, у якой Божае слова цэлебруецца як актуальнае і жывое слова: «У Літургіі Касцёл верна трымаецца спосабу чытання і тлумачэння Святога Пісання, які выкарыстоўваў сам Хрыстус, калі ад пачатку сваёй місіі заахвочваў даследаваць усё Пісанне»[186].

Гэта бачна таксама ў мудрай педагогіцы Касцёла, які абвяшчае Святое Пісанне і слухае яго ў рытме літургічнага года. Гэтае абвяшчэнне і слуханне Божага слова ў часе мае месца асабліва ў Эўхарыстыі, а таксама ў Літургіі гадзінаў. У цэнтры ўсяго ззяе Пасхальная таямніца, з якой звязаны ўсе таямніцы Хрыста і гісторыя збаўлення, якія сакрамэнтальна ажыццяўляюцца. «Такім чынам святкуючы таямніцы Адкуплення, Касцёл адкрывае вернікам багацце збаўчых цнот і заслуг свайго Пана так, што яны выяўляюцца ўвесь час, каб вернікі сустрэліся з імі і напоўніліся ласкай збаўлення»[187]. Таму заклікаю пастыраў Касцёла і супрацоўнікаў пастыраў да такой фармацыі ўсіх вернікаў, каб яны адчулі смак глыбокага сэнсу Божага слова, прадстаўленага ў Літургіі падчас усяго года, паказваючы асноўныя таямніцы нашай веры. Ад гэтага залежыць таксама адпаведны падыход да Святога Пісання.

*Святое Пісанне і сакрамэнты*

53. Разглядаючы тэму значэння Літургіі ў разуменні Божага слова, Сінод Біскупаў хацеў таксама падкрэсліць сувязь паміж Святым Пісаннем і сакрамэнтальным дзеяннем. Надзвычай адпаедным з'яўляецца зразуменне сувязі паміж словам і сакрамэнтам, як ў пастырскай дзейнасці Касцёла, так і ў тэалагічных даследаваннях[188]. Канешне «літургія слова – гэта важны элемент у справаванні

---

[184] *Ordo Lectionum Missae*, 4.

[185] *Тамсама*, 9.

[186] *Тамсама*, 3; пар. *Лк* 4, 16-21; 24, 25-35. 44-49.

[187] CONC. OECUM. VAT. II, Const. de sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 102.

[188] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 44-45.

кожнага сакрамэнту Касцёла»[189]; аднак у пастырскай практыцы вернікі не заўсёды разумеюць гэтую сувязь, а таксама не заўважаюць еднасць жэсту і слова. Гэта «заданне святароў і дыяканаў, асабліва калі яны цэлебруюць сакрамэнты, паказваючы еднасць, якую ствараюць слова і сакрамэнты ў місіі Касцёла»[190]. У адносінах паміж словам і сакрамэнтальным жэстам выяўляецца ў літургічнай форме дзеянне Бога ў гісторыі праз *дзейсны характар* самога слова. У гісторыі збаўлення няма падзелу паміж тым, што *кажа* Бог, і тым, што Ён *здзяйсняе*; Яго слова жывое і дзейснае (пар. *Гбр* 4, 12), на што дарэчы ўказвае значэнне габрэйскага выразу *dabar*.

Таксама ў літургічнай дзейнасці маем дачыненне з Яго словам, якое ажыццяўляе тое, пра што кажа. Выхаванне Божага народу да адкрыцця дзейснага характару Божага слова ў Літургіі дапамагае таксама зразумець дзеянне Бога ў гісторыі збаўлення і ў асабістай гісторыі кожнага, хто да яго належыць.

*Божае слова і Эўхарыстыя*

54. Тое, што агульна кажам пра адносіны паміж словам і сакрмэнтамі, мае больш глыбокае значэнне адносна эўхарыстычнай цэлебрацыі. Унутраная еднасць Божага слова і Эўхарыстыі ўкаранёная зрэшты ў сведчанні Святога Пісання (пар. *Ян* 6; *Лк* 24), засведчаная Айцамі Касцёла і пацверджаная Другім Ватыканскім Саборам[191]. Прыгадаем вялікую мову Езуса пра хлеб жыцця, якая была абвешчана ў сінагозе ў Кафарнауме (пар. *Ян* 6, 22-69) і якая змяшчае ў сабе параўнанне Майсея з Езусам – таго, які размаўляў тварам ў твар з Богам (пар. *Зых* 3, 11), з тым, які аб'явіў Бога (пар. *Ян* 1, 18). У мове пра хлеб згадваецца Божы дар, які Майсей атрымаў для свайго народу ў постаці манны на пустыні і якім на самай справе з'яўляецца *Torah* – Божае слова, якое дае жыццё (пар. *Пс* 119 [118]; *Прып* 9, 5). Езус ажыццяўляе ў сабе даўні правобраз: «хлеб Божы – гэта той, хто сыходзіць з неба і дае жыццё свету <…> Я – хлеб жыцця» (*Ян* 6, 33-35). Тут «Закон стаўся Асобай. У сустрэчы з Езусам мы кормімся Езусам, можна сказаць самім жывым Богам, сапраўды спажываем „хлеб з неба"»[192]. У мове ў Кафарнауме Янаў Пралог набывае больш глыбокае значэнне: калі

[189] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L'interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), IV, C, 1: *Ench. Vat.*, 13, n. 3123.

[190] *Тамсама*, III, B, 3: *Ench. Vat.*, 13, n. 3056.

[191] Пар. Const. de sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 48. 51. 56; Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 21. 26; Decr. de activitate missionali Ecclesiae *Ad gentes*, 6. 15; Decr. de presbyterorum ministerio et vita *Presbyterorum ordinis*, 18; Decr. de accommodata renovatione vitae religiosae *Perfectae caritatis*, 6. У вялікай Традыцыі Касцёла знаходзім вельмі выразныя выказванні, напр.: «*Corpus Christi intelligitur etiam <...> Scriptura Dei* (Таксама Божае Пісанне лічыцца Целам Хрыста)»: WALTRAMUS, *De unitate Ecclesiae conservanda*: 1, 14, ed. W. Schwenkenbecher, Hannoverae 1883, p. 33; «Цела Пана – гэта праўдзівы спажытак, і Яго Кроў – праўдзівы напой; вось сапраўднае дабро, гарантаванае нам у гэтым жыцці, пасіляцца Яго Целам і піць Яго Кроў, не толькі ў Эўхарыстыі, але таксама ў чытанні Святога Пісання. Сапраўды, праўдзівым спажыткам і праўдзівым напоем ёсць Божае слова, якое чэрпаецца з пазнання Пісанняў»: S. HIERONYMUS, *Commentarius in Ecclesiasten*, III: *PL* 23, 1092 A.

[192] J. RATZINGER (BENEDICTUS XVI), *Gesu di Nazaret*, Milano 2007, 311.

ў ім Божае *Слова* (*Logos*) становіцца целам, тут гэтае цела становіцца «хлебам» дадзеным для жыцця свету (пар. *Ян* 6, 51), што з'яўляецца алюзіяй дару, які Езус учыніў з сябе ў таямніцы крыжа і што пацвярджаюць словы пра Яго Кроў, дадзеную для «піцця» (пар. *Ян* 6, 53). І так у таямніцы Эўхарыстыі паказана, што такое праўдзівая манна, праўдзівы хлеб з неба: гэта Божае *Слова* (*Logos*), якое сталася целам, якое аддало сябе за нас у Пасхальнай таямніцы.

Апавяданне св. Лукі пра вучняў з Эмаус дазваляе нам пайсці яшчэ далей у разважаннях на тэму сувязі паміж слуханнем слова і ламаннем хлеба (пар. *Лк* 24, 13-35). Езус падышоў да іх назаўтра пасля шабату, слухаў як гаварылі пра свае няспоўненыя спадзяванні; ідучы з імі, Ён «растлумачыў ім тое, што ва ўсім Пісанні датычыла Яго» (*Лк* 24, 27). Абодва вучні пачынаюць глядзець па новаму на Пісанні разам з Падарожным, які паказвае незвычайнае веданне іх жыцця. Тое, што здарылася ў тыя дні, не з'яўляецца ўжо паражэннем, але спаўненнем і новым пачаткам. Аднак нават гэтыя словы не здаюцца яшчэ дастатковымі для двух вучняў. Евангелле Лукі кажа нам, што «адкрыліся іхнія вочы, і яны пазналі Яго» (*Лк* 24, 31) толькі тады, калі Езус узяў хлеб, прамовіў благаслаўленне, паламаў яго і даў ім, раней жа «вочы іх былі стрыманыя, таму не пазналі Яго» (*Лк* 24, 16). Прысутнасць Езуса, найперш Яго слова, а затым жэст ламання хлеба дазволілі вучням распазнаць Яго; яны могуць яшчэ раз і наноў адчуць тое, што ўжо раней перажылі з Ім: «Ці ж не палала ў нас сэрца нашае, калі Ён размаўляў з намі ў дарозе і тлумачыў нам Пісанне?» (*Лк* 24, 32).

55. З вышэйсказанага бачна, што само Пісанне дае нам падказкі, якія дазваляюць заўважыць яго непарыўную сувязь з Эўхарыстыяй. «Таму трэба заўсёды памятаць, што Божае слова, якое Касцёл чытае і абвяшчае падчас Літургіі, вядзе да ахвяры запавету і да гасціны ласкі, гэта значыць, да Эўхарыстыі»[193]. Слова і Эўхарыстыя так цесна звязаны з сабой, што нельга зразумець першага без другога: Божае слова становіцца сакрамэнтальным целам у эўхарыстычнай падзеі. Эўхарыстыя адкрывае нас на разуменне Святога Пісання, так як Святое Пісанне асвятляе і тлумачыць эўхарыстычную таямніцу. Фактычна, калі не прызнаецца, што Пан рэальна прысутнічае ў Эўхарыстыі, разуменне Пісання застаецца няпоўным. Таму «Касцёл заўсёды і ўсюды з аднолькавай руплівасцю, хоць і ў розных формах культу, ушаноўваў і хоча ўшаноўваць Божае слова і эўхарыстычную таямніцу. Натхнёны прыкладам свайго Заснавальніка, Касцёл ніколі не пераставаў святкаваць Яго Пасхальную таямніцу, збіраючыся разам, каб чытаць "тое, што ва ўсім Пісанні датычыла Яго" (Лк 24, 27) і здзяйсняць справу збаўлення праз успамін Пана і сакрамэнты»[194].

---

[193] *Ordo Lectionum Missae*, 10.
[194] *Тамсама*.

*Сакрамэнтальнасць слова*

56. Паўторнае адкрыццё дзейснага характару Божага слова ў сакрамэнтальным дзеянні і паглыбленне сувязі Слова з Эўхарыстыяй вядзе нас да вельмі важнай тэмы, якая нарадзілася падчас Сінадальнага Сходу, а датычыць яна *сакрамэнтальнасці слова*[195]. *Варта ў гэтым кантэксце нагадаць, што папа Ян Павел ІІ казаў пра* «*сакрамэнтальны* аспект Аб'яўлення і асабліва эўхарыстычнага знаку, у якім непарыўная еднасць паміж самой рэччу і яе значэннем дазваляе ўсвядоміць глыбіню таямніцы»[196]. Так разумеем, што крыніцай сакрамэнтальнасці Божага слова з'яўляецца менавіта таямніца ўцелаўлення: «Слова сталася целам» (*Ян*, 1, 14), рэчаіснасць аб'яўленай таямніцы становіцца для нас даступнай у «целе» Сына. Такім чынам Божае слова можа заўважацца ў веры праз пасрэдніцтва «знаку», якім з'яўляюцца словы і чалавечыя жэсты. Вера распазнае Божае слова, прымаючы жэсты і словы, у якіх Ён сам нам паказваецца. Сакрамэнтальны гарызонт Аб'яўлення ўказвае на гісторыка-збаўчыя акалічнасці, у якіх Божае Слова ўваходзіць у час і прастору, становіцца суразмоўцам чалавека, пакліканага прыняць у веры Яго дар.

Сакрамэнтальнасць слова становіцца зразумелай праз аналогію з сапраўднай прысутнасцю Хрыста ў кансэкраваных постацях хлеба і віна[197]. Прыступаючы да алтара і ўдзельнічаючы ў эўхарыстычнай гасціне, сапраўды прымаем у Камуніі Цела і Кроў Хрыста. Абвяшчэнне Божага слова падчас цэлебрацыі вядзе да прызнання, што прысутнічае сам Хрыстус, які прамаўляе да нас[198], каб мы прынялі Яго. Наконт таго, як трэба адносіцца да Эўхарыстыі і да Божага слова, св. Геранім піша: «Мы чытаем Святое Пісанне. Думаю, што Евангелле – гэта цела Хрыста; думаю, што Святое Пісанне – гэта Яго вучэнне. А калі Ён гаворыць: „Калі не будзеце спажываць Цела Сына Чалавечага і піць Крыві Ягонай” (*Ян* 6, 53), то хоць гэтыя словы можна разумець у аднясенні да [эўхарыстычнай] таямніцы, не менш аднак цела Хрыста і Яго Кроў сапраўды з'яўляюцца словам Пісання, Божым вучэннем. Калі маем дачыненне з [эўхарыстычнай] таямніцай, і падае крошка, адчуваем сябе загубленымі. Калі ж слухаем Божае слова, і яно пранікае ў нашыя вушы, а таксама цела Хрыста і Яго кроў, а мы думаем пра штосьці іншае, якая ж вялікая небяспека нам пагражае?»[199] Хрыстус, сапраўды прысутны ў постацях хлеба і віна, аналагічна прысутнічае ў Слове, якое абвяшчаецца ў Літургіі. Паглыбленне сэнсу сакрамэнтальнасці Божага слова можа спрыяць лепшаму зразуменню цэласнасці таямніцы Аб'яўлення ў «справах і словах, знітаваных цеснай унутранай сувяззю»[200], прыносячы карысць духоўнаму жыццю верных і пастырскай дзейнасці Касцёла.

---

[195] Пар. *Propositio* 7.
[196] Litt. enc. *Fides et ratio* (14 Septembris 1998), 13.
[197] Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1373-1374.
[198] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. de sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 7.
[199] *In Psalmum* 147: *CCL* 78, 337-338.
[200] CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 2.

*Святое Пісанне і Лекцыянарый*

57. Падкрэсліваючы сувязь Слова з Эўхарыстыяй, Сінод слушна нагадаў таксама пра некаторыя аспекты цэлебрацыі, цесна звязанай з паслугай слова. Хацеў бы найперш звярнуць увагу на тое, наколькі важным з'яўляецца Лекцыянарый. Рэформа, распачатая Другім Ватыканскім Саборам[201] прынесла плёны, даючы больш шырокі доступ да Святога Пісання, якое багата прапануецца, асабліва падчас нядзельнай Літургіі. Сённяшняя структура часта прадстаўляе найважнейшыя тэксты Пісання, а таксама спрыяе разуменню еднасці Божага плану, паказваючы сувязі паміж чытаннямі Старога і Новага Запавету, у цэнтры якіх «стаіць Хрыстус, які ўшаноўваецца ў сваёй Пасхальнай таямніцы»[202]. Некаторыя цяжкасці, што надалей існуюць у разуменні сувязяў паміж чытаннямі з абодвух Запаветаў, трэба разглядаць у святле кананічнага чытання, гэта значыць у святле ўнутранай еднасці ўсёй Бібліі. Там, дзе выступае такая патрэба, адпаведныя інстытуцыі павінны заняцца апублікаваннем дапаможных матэрыялаў, якія аблегчаць зразуменне сувязі паміж прапанаванымі ў Лекцыянарыі чытаннямі, якія цалкам павінны быць абвешчаныя на літургічным сходзе, як гэта прадбачыць літургія дня. Іншыя магчымыя праблемы і цяжкасці трэба прадстаўляць Кангрэгацыі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў.

Мы не павінны таксама забываць, што цяперашні Лекцыянарый лацінскага абраду мае таксама экуменічнае значэнне, бо карыстаюцца ім і цэняць яго таксама вызнанні, якія яшчэ не знаходзяцца у поўнай еднасці з каталіцкім Касцёлам. Інакш выглядае справа Лекцыянарыя ў Літургіі каталіцкіх Усходніх Касцёлаў, таму Сінод просіць аб яго «аўтарытатыўным аналізе»[203], згодна з традыцыяй і кампетэнцыямі Касцёлаў *sui iuris* і з улікам таксама і ў гэтым выпадку экуменічнага кантэксту.

*Абвяшчэнне Божага слова і паслуга лектараў*

58. Ужо падчас сінадальнага сходу, прысвечанага Эўхарыстыі, мы прасілі аб большай стараннасці ў чытанні Божага слова[204]. Як вядома, наколькі Евангелле чытаецца святаром або дыяканам, настолькі чытанне першага і другога фрагменту Святога Пісання ў лацінскай традыцыі рэкамендуецца здзяйсняць лектару, мужчыне або жанчыне. Наконт гэтага хачу выказаць пажаданне Айцоў Сіноду, якія таксама пры гэтай нагодзе падкрэслілі, што патрэбна падрыхтоўка – праз адпаведную фармацыю[205] – для выканання *абавязку* лектара падчас літургічнай цэлебрацыі[206], а асабліва да лектарату, які ў лацінскім абрадзе з'яўляецца *паслугаю* свецкіх. Неабходна, каб лектары, якія выконваюць гэтую паслугу, нават калі не былі ўстаноўленыя, мелі сапраўды адпаведную і старанную падрыхтоўку, як біблійную і

[201] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. de sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 107-108.
[202] *Ordo Lectionum Missae*, 66.
[203] *Propositio* 16.
[204] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 45
[205] Пар. *Propositio* 14.
[206] Пар. *Codex Iuris Canonici*, cann. 230 §2; 204 §1.

літургічную, так і тэхнічную: «біблійнае навучанне павінна быць накіравана на тое, каб лектары разумелі чытанні ў іх уласным кантэксце і праз святло веры спасцігалі сутнасць аб'яўленага слова. Літургічнае навучанне павінна даць лектарам пэўнае разуменне сэнсу і структуры літургіі слова, а таксама сувязі паміж літургіяй слова і эўхарыстычнай літургіяй. Тэхнічная падрыхтоўка павінна даць лектарам навыкі публічнага чытання як жывым голасам, так і пры дапамозе сучасных гукаўзмацняльных сродкаў»[207].

*Значэнне гаміліі*

59. «З волі самога Хрыста новы народ Божы цудоўным чынам складзены з розных членаў. Кожнаму з іх у дачыненні да Божага слова прызначаюцца розныя абавязкі і служэнні. Вернікі слухаюць само слова і разважаюць над ім, але тлумачаць яго толькі тыя, каму абавязак навучання належыць дзякуючы пасвячэнню, або тыя, каму даручана выконваць гэтае служэнне»[208], гэта значыць біскупам, прэзбітэрам і дыяканам. Таму зразумела, чаму Сінод прысвяціў тэме гаміліі столькі ўвагі. Ужо ў паслясінадальнай апостальскай адгартацыі *Sacramentum caritatis* я нагадаў, што «з увагі на значэнне Божага слова паўстае неабходнасць палепшыць якасць гаміліі. Яна з'яўляецца "часткай літургічнага дзеяння"; павінна спрыяць больш поўнаму разуменню Божага слова і яго эфектыўнасці ў жыцці вернікаў»[209]. Гамілія актуалізуе навіну Святога Пісання, каб вернікі маглі адкрыць прысутнасць і дзейснасць Божага слова у сваім штодзённым жыцці. Яна павінна аблегчыць разуменне цэлебраванай таямніцы, заахвоціць да місіі, рыхтуючы сход да вызнання веры, агульнай малітвы і эўхарыстычнай літургіі. Таму няхай гэтае заданне сапраўды прымуць блізка да сэрца тыя, спецыфічнай паслугай якіх з'яўляецца абвяшчэнне Слова. Трэба пазбягаць гаміліі агульных і абстрактных, якія закрываюць прастату Божага слова, а таксама непатрэбнага мнагаслоўя, што можа весці да засяроджвання ўвагі больш на казнадзеі, чым на сутнасці евангельскага паслання. Вернікам павінна быць зразумела, што казнадзей хоча паказаць Хрыста, які павінен быць у цэнтры кожнай гаміліі. Таму трэба, каб казнадзеі «заставаліся ў сяброўстве» і часта звярталіся да святога тэксту[210]; яны павінны рыхтавацца да гаміліі на медытацыі і малітве, каб прапаведавалі з перакананнем і запалам. Сінадальны Сход заахвочваў задаваць сабе наступнае пытанне: пра што гавораць прачытаныя тэксты? Што яны кажуць мне? Што я павінен сказаць супольнасці ў яе канкрэтнай сітуацыі?[211] Казнадзей павінен «першым аднесці да сябе Божае слова, якое абвяшчае[212], бо – як кажа св. Аўгустын – «несумненна безвыніковым будзе дзеянне таго, хто абвяшчае знешне Божае слова, а

[207] *Ordo Lectionum Missae*, 55.
[208] *Тамсама*, 8
[209] N. 46.
[210] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 25.
[211] Пар. *Propositio* 15.
[212] *Тамсама.*

не слухае яго ў сабе»[213]. Трэба з вялікай стараннасцю рыхтаваць нядзельную і святочную гамілію; але нельга таксама забываць пра тое, што на працягу тыдня падчас св. Імшы *з народам*, калі гэта магчыма, трэба падаваць кароткія разважанні, дастасаваныя да сітуацыі, каб вернікі маглі прыняць пачутае слова і каб яно прынесла плён.

*Неабходнасць Гамілітычнай дырэкторыі*

60. Прапаведаванне Божага слова з адпаведным аднясеннем да Лекцыянарыя – сапраўды мастацтва, якое трэба развіваць. Таму ў сувязі з тым, аб чым прасіў папярэдні Сінод[214] адносна эўхарыстычнага Кампендыя[215], звяртаюся з просьбай да кампетэнтных улад, каб падумалі таксама пра адпаведныя сродкі і матэрыялы, якія дапамогуць святарам як мага лепш выканаць сваё заданне, як напрыклад, Гамілітычная дырэкторыя, у якой казнадзеі змогуць знайсці дапамогу, карысную ў падрыхтоўцы да выканання сваёй паслугі. Як нагадаў нам св. Геранім, прапаведаванню павінна сапутнічаць сведчанне ўласнага жыцця: «Твае чыны няхай не аспрэчваюць твае словы, каб не здарылася так, што калі абвяшчаеш навучанне ў касцёле, хтосьці ў душы не сказаў: „Чаму ж ты сам так не паступаеш?” <...> У выпадку Хрыстовага святара розум і слова павінны згаджацца»[216].

*Божае слова, паяднанне і намашчэнне хворых*

61. Хоць у цэнтры адносін паміж Божым словам і сакрамэнтамі знаходзіцца несумненна Эўхарыстыя, трэба аднак падкрэсліць значэнне Святога Пісання таксама ў іншых сакрамэнтах, асабліва ў тых, якія звязаны з аздараўленнем, гэта значыць у сакрамэнце паяднання ці пакаяння, а таксама ў сакрамэнце намашчэння хворых. Часта пры цэлебрацыі гэтых сакрамэнтаў занядбоўваецца аднясенне да Святога Пісання. Трэба запэўніць яму належнае месца. Не трэба ніколі забываць, што «слова Божае ёсць словам паяднання, бо ў ім Бог паяднаў з сабою ўсё (пар. *2 Кар* 5, 18-20; *Эф* 1, 10). Міласэрнае Божае прабачэнне, уцелаўленнем якога ёсць Езус, паднімае грэшніка»[217]. «Божае слова асвятляе верніка, каб ён пазнаў свае грахі, яно заклікае яго да навяртання і да веры ў Божую міласэрнасць»[218]. Для паглыблення моцы паяднання Божага слова рэкамендуецца, каб кожны пэнітэнт падрыхтаваўся да споведзі, разважаючы адпаведныя фрагменты Святога Пісання, і меў магчымасць распачаць споведзь чытаннем або выслухоўваннем біблійнай перасцярогі, у залежнасці ад таго, што прадбачыць яго ўласны абрад. Пажадана таксама, каб выказваючы скруху, пэнітэнт выкарыстаў «малітву, складзеную са слоў Святога

[213] *Sermo* 179, 1: *PL* 38, 966.
[214] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 93.
[215] CONGREGATIO DE CULTU DIVINO ET DISCIPLINA SACRAMENTORUM, *Compendium eucharisticum* (25 Martii 2009), Citta del Vaticano 2009.
[216] *Epistula* 52, 7: *CSEL* 54, 426-427.
[217] *Propositio* 8.
[218] *Ritus Paenitentiae*, 17.

Пісання»[219], прадбачаную абрадамі. Калі гэта магчыма, пажадана, каб у асаблівыя моманты года або, калі гэта здаецца адпаведным, індывідуальная споведзь большай колькасці пэнітэнтаў адбывалася ў межах пакутнага набажэнства, як прадбачыць рытуал, з ушанаваннем розных літургічных традыцый, падчас якога можна прысвяціць больш часу на літургію слова з выкарыстаннем адпаведных чытанняў.

Таксама, калі маецца на ўвазе сакрамэнт намашчэння хворых, не трэба забываць, што «аздараўляльная моц Божага слова ёсць для таго, хто слухае, жывым заклікам да асабістага навяртання»[220]. Многія старонкі Святога Пісання апісваюць суцяшэнне, умацаванне і аздараўленне, якія з'яўляюцца плёнам дзейнасці Бога. Асабліва трэба памятаць, што Езусу былі блізкія церпячыя і што Ён сам, уцелаўлёнае Божае Слова, узяў на сябе нашыя пакуты і цярпеў з любові да чалавека, надаючы сэнс хваробе і смерці. Было б добра, калі б у парафіях, асабліва ў шпіталях, у залежнасці ад акалічнасцяў, сакрамэнт хворых удзялялі супольна. Пры гэтых нагодах трэба прысвяціць больш часу на цэлебрацыю слова і на дапамогу хворым вернікам у перажыванні з верай свайго цярпення ў еднасці з адкупленчай ахвярай Хрыста, які вызваляе нас ад зла.

*Божае слова і Літургія гадзінаў*

62. Адной з формаў малітвы, у якой Святое Пісанне адыгрывае галоўную ролю, з'яўляецца несумненна Літургія гадзінаў. Айцы Сіноду падкрэслілі, што яна з'яўляецца «прывілеяванай формай слухання Божага слова, бо у ёй вернікі сустракаюцца са Святым Пісаннем, а таксама з жывой Традыцыяй Касцёла»[221]. Найперш трэба нагадаць вялікую тэалагічную і эклезіяльную годнасць гэтай малітвы. Бо «падчас Літургіі гадзінаў Касцёл, здзяйсняючы святарскі абавязак сваёй Галавы, "няспынна" (*1 Тэс* 5,17) прыносіць Богу ахвяру хвалы, гэта значыць плён вуснаў, што вызнаюць Ягонае імя. Гэтая малітва – "голас самой абранніцы, якая звяртаецца да свайго Абранніка. Больш за тое, гэта малітва Хрыста і Ягонага цела, скіраваная да Айца"»[222]. На гэтую тэму Другі Ватыканскі Сабор сказаў: «Кожны, хто прысвячае сябе гэтай малітве, выконвае абавязак Касцёла і ў той жа час удзельнічае ў найвышэйшым гонары абранніцы Хрыста, паколькі, аддаючы Богу хвалу, стаіць перад Божым тронам у імя Маці-Касцёла»[223]. Літургія гадзінаў як публічная малітва Касцёла паказвае хрысціянскі ідэал асвячэння ўсяго дня ў рытме, вызначаным праз слуханне Божага слова і малітву псальмамі, каб мэтаю ўсялякай дзейнасці было праслаўленне Бога.

Няхай тыя, хто з увагі на свой стан жыцця абавязаны чытаць Літургію гадзінаў, верна выконваюць гэты абавязак для дабра ўсяго Касцёла. Біскупы, прэзбітэры і дыяканы, якія рыхтуюцца да святарства, якім Касцёл даручыў яе здзяйсняць, маюць

[219] *Тамсама*, 19.
[220] *Propositio* 8.
[221] *Propositio* 19.
[222] *Institutio generalis de Liturgia Horarum*, III,15.
[223] Const. de sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 85.

абавязак штодзённа чытаць усе гадзіны[224]. Калі маецца на ўвазе абавязак цэлебравання гэтай Літургіі ў каталіцкім Усходнім Касцёле *sui iuris*, трэба дастасавацца да таго, што прадпісвае іх права[225]. Акрамя гэтага заахвочваю супольнасці кансэкраванага жыцця, каб дакладна цэлебравалі Літургію гадзінаў, каб маглі быць прыкладам і натхненнем у духоўным і пастырскім жыцці для ўсяго Касцёла.

Сінод выказаў жаданне, каб больш распаўсюджваўся сярод Божага народу гэты тып малітвы, асабліва чытання Ютрані і Нешпараў. Гэтае пашырэнне напэўна паглыбіць знаёмасць Божага слова сярод вернікаў. Трэба падкрэсліць таксама значэнне Літургіі гадзінаў, прадугледжанай для I Нешпараў нядзелі і ўрачытсацяў, асабліва ў выпадках каталіцкіх Усходніх Касцёлаў. Таму рэкамендую, каб там, дзе гэта магчыма, у парафіях і супольнасцях кансэкраванага жыцця гэтая малітва чыталася з удзелам вернікаў.

*Божае слова і Бэнэдыкцыянал*

63. Таксама тады, калі выкарыстоўваецца Бэнэдыкцыянал, трэба памятаць аб прадбачаным абвяшчэнні, слуханні і тлумачэнні Божага слова пры дапамозе кароткіх заўваг. Жэсту благаслаўлення, у выпадках прадугледжаных Касцёлам і калі аб гэтым просяць вернікі, не трэба прапускаць, але трэба ўключаць яго ў адпаведнай ступені ў літургічнае жыццё Божага народу. У гэтым сэнсе благаслаўленне як сапраўдны святы знак, «набывае сэнс і плённасць праз абвяшчэнне Божага слова»[226]. Таму важна выкарыстоўваць гэтыя магчымасці, каб абуджаць у верніках голад і прагненне ўсялякага слова, якое выходзіць з вуснаў Божых (пар. *Мц* 4, 4).

*Меркаванні і канкрэтныя прапановы, якія датычаць літургічнай анімацыі*

64. Нагадаўшы некаторыя асноўныя элементы, якія характарызуюць адносіны паміж Літургіяй і Божым словам, хачу цяпер падсумаваць і пракаменціраваць некаторыя прапановы і меркаванні, прадстаўленыя Айцамі Сіноду, каб аблегчыць Божаму народу больш часты кантакт з Божым словам у межах літургічных дзеянняў або ў сувязі з імі.

*а) Цэлебрацыя Божага слова*

65. Айцы Сіноду заклікалі ўсіх пастыраў цэлебраваць у давераных ім супольнасцях *набажэнствы слова*[227]. Гэта прывілеяваныя нагоды для сустрэчы з Панам. Таму гэтая практыка прыносіць вернікам вялікую карысць і трэба яе лічыць важным элементам літургічнага пастырства. Гэтыя цэлебрацыі маюць істотнае значэнне ў падрыхтоўцы нядзельнай Эўхарыстыі, бо даюць вернікам магчымасць лепшага

[224] Пар. *Codex Iuris Canonici*, cann. 276 §3; 1174 §1.
[225] Пар. *Codex Canonum Ecclesiarum Orientalium*, cann. 377; 473 §§ 1 et 2,1°; 538 §1; 881 §1.
[226] RITUALE ROMANUM, *De Benedictionibus, Praenotanda Generalia*, 21.
[227] Пар. *Propositio* 18; CONC. OECUM. VAT. II, Const. de Sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 35.

пазнаёміцца з багаццем Лекцыянарыя, каб разважаць над Святым Пісаннем і маліцца ім, асабліва ў адмысловыя перыяды літургічнага года – падчас Адвэнту і Нараджэння Пана, Вялікага посту і Велікоднага перыяду. Цэлебрацыя Божага слова вельмі рэкамендуецца ў тых супольнасцях, у якіх з прычыны адсутнасці святара не можа цэлебравацца эўхарыстычная Ахвяра ў абавязковыя сяточныя дні. Беручы пад увагу ўказанні наконт нядзельных сходаў у чаканні на святара[228], сфармуліраваныя ўжо ў паслясінадальнай апостальскай адгартацыі *Sacramentum caritatis,* рэкамендую, каб кампетэнтныя ўлады апрацавалі абрадавыя дырэкторыі, улічваючы досвед мясцовых Касцёлаў. Гэта аблегчыць у такіх сітуацыях цэлебрацыю слова, якая ўмацоўвае веру вернікаў, а таксама дазволіць пазбегнуць блытаніны іх з эўхарыстычнымі цэлебрацыямі; яны «павінны быць прывілеяванымі нагодамі для малітвы, каб Бог паслаў святых святароў паводле свайго Сэрца»[229].

Акрамя таго, Айцы Сіноду заахвочвалі цэлебраваць Божае слова таксама з нагоды пілігрымак, асабліва святаў, місій для народу, дзён духоўных сустрэч і спецыяльных дзён пакаяння, перапрашэння і прабачэння. Што датычыць розных формаў народнай пабожнасці, то хоць яны не з’яўляюцца літургічнымі дзеяннямі і не трэба іх блытаць з літургічнымі цэлебрацыямі, аднак добра, каб з іх бралі прыклад, а асабліва каб яны ўключалі момант абвяшчэння і слухання Божага слова; сапраўды, «у біблійным слове пабожнасць народу мае невычарпальную крыніцу натхнення, недасягальныя прыклады малітвы, а таксама тэматычныя прапановы»[230].

*б) Слова і маўчанне*

66. Айцы Сіноду ў многіх выступленнях падкрэслівалі каштоўнасць маўчання ў аднясенні да Божага слова і яго прыняцця ў жыцці вернікаў[231]. Бо слова можа быць сказана і пачута толькі ў цішыні, знешняй і ўнутранай. Наш час не спрыяе засяроджанасці і часам здаецца, што адарванне ад сродкаў масавай камунікацыі хоць бы на хвіліну абуджае амаль страх. Таму сёння вельмі важна часта паўтараць Божаму народу, што маўчанне – гэта каштоўнасць. Адкрыццё нанова таго, што Божае слова адыгрывае галоўную ролю ў жыцці Касцёла, азначае таксама адкрыццё сэнсу засяроджанасці і ўнутранага спакою. Вялікая патрыстычная традыцыя вучыць нас, што таямніца Хрыста спалучана з маўчаннем[232], і толькі ў цішыні Слова можа загасціць у нас, як у выпадку Марыі, жанчыны, у якой Слова было непарыўна звязана з маўчаннем. Нашыя літургіі павінны спрыяць гэтаму сапраўднаму слуханню: *Verbo crescente, verba defi ciunt*[233].

---

[228] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 75.
[229] *Тамсама.*
[230] CONGREGATIO DE CULTU DIVINO ET DISCIPLINA SACRAMENTORUM, *Direttorio su pieta popolare e liturgia. Principi e orientamenti* (17 Decembris 2001), 87: *Ench. Vat.* 20, n. 2461.
[231] Пар. *Propositio* 14
[232] Пар. S. IGNATIUS ANTIOCHENUS, *Ad Ephesios*, XV, 2: *Patres Apostolici*, ed. F.X. FUNK, Tubingae 1901, I, 224.
[233] Пар. S. AUGUSTINUS, *Sermo* 288,5: *PL* 38, 1307; *Sermo* 120, 2: *PL* 38, 677.

Няхай гэтая каштоўнасць выяўляецца асабліва ў *літургіі слова*, якая «павінна цэлебравацца такім чынам, каб спрыяць разважанню (медытацыі)»[234]. Маўчанне, калі яно прадбачыцца, трэба лічыць «як частку літургічнага дзеяння»[235]. Таму заклікаю пастыраў, каб яны заахвочвалі знаходзіць час на засяроджанасць, дзякуючы якой з дапамогаю Духа Святога Божае слова прымаецца сэрцам.

*в) Урачыстае абвяшчэнне Божага слова*

67. Іншая прапанова Сіноду – надаваць, асабліва з нагоды важных літургічных цэлебрацый, урачыстую форму чытанню слова, асабліва Евангелля, праз выкарыстанне Евангеліярыя, які заносіцца ў працэсіі падчас уступных абрадаў, а затым прыносіцца на амбону дыяканам або святаром. Такім чынам аказваецца дапамога Божаму народу ў зразуменні таго, што «вяршыняй літургіі слова з'яўляецца чытанне Евангелля»[236]. Ідучы за ўказаннямі, змешчанымі ва *Уводзінах* да *Лекцыянарыя*, карысна ўзбагаціць абвяшчэнне Божага слова спевам, асабліва Евангелля, з нагоды пэўных урачыстасцяў. Добрая рэч – спяваць акламацыю, уступнае слова: «Чытанне святога Евангелля...», а таксама заключную акламацыю: «Гэта слова Пана», каб падкрэсліць значэнне таго, што чытаецца[237].

*г) Божае слова ў хрысціянскай святыні*

68. Каб аблегчыць слуханне Божага слова, трэба памятаць таксама пра тыя сродкі, якія могуць дапамагчы вернікам лепш засяродзіць сваю увагу. Таму неабходна паклапаціцца пра акустыку сакральных будынкаў, з захаваннем літургічных і архітэктурных нормаў. «Біскупы, адпаведна падтрыманыя, павінны паклапаціцца аб тым, каб будаваныя касцёлы былі адпаведнымі месцамі для абвяшчэння слова, разважання і эўхарыстычнай цэлебрацыі. Няхай таксама тады, калі не адбываюцца літургічныя дзеянні, сакральная прастора будзе вымоўнай, паказваючы хрысціянскую таямніцу ў адносінах да Божага слова»[238].

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на *амбону* як на літургічнае месца, з якога абвяшчаецца Божае слова. Яна павінна быць змешчана ў добра бачным месцы, натуральна прыцягваючы ўвагу вернікаў падчас літургіі слова. Важна, каб гэтае месца было пастаянным і, як скульптурны элемент, эстэтычна спалучаным з *алтаром* для бачнага падкрэслівання тэалагічнага сэнсу *падвойнага стала – слова і Эўхарыстыі.* Амбона служыць толькі чытанню імшальных тэкстаў, рэспансарыйнага псальму, а таксама Абвяшчэння Пасхі; можна таксама адтуль прамаўляць гаміліі і чытаць інтэнцыі малітвы вернікаў[239].

---

[234] *Institutio Generalis Missalis Romani*, 56.
[235] *Тамсама*, 45; пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. de sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 30.
[236] *Ordo lectionum Missae*, 13.
[237] Пар. *тамсама*, 17.
[238] *Propositio* 40.
[239] Пар. *Institutio Generalis Missalis Romani*, 309.

Айцы Сіноду прапануюць, каб у касцёлах было таксама адпаведнае месца для захоўвання Святога Пісання *паміж цэлебрацыямі*[240]. Слушна, каб кніга, якая змяшчае Божае слова, мела бачнае і годнае пашаны месца ў хрысціянскай святыні, аднак цэнтральнае месца павінен займаць табэрнакулюм, у якім захоўваецца Найсвяцейшы Сакрамэнт[241].

*е) Выкарыстанне ў літургіі выключна біблійных тэкстаў*

69. Сінод пацвердзіў тое, што зрэшты ўжо прадпісвае літургічная норма Касцёла[242], а менавіта, што *чытанне фрагментаў Святога Пісання ніколі нельга замяняць іншымі тэкстамі,* незалежна ад іх значэння з пункту гледжання пастырскага і духоўнага: «ніводзін тэкст з галіны духоўнасці ці літаратуры не можа прыраўноўвацца па каштоўнасці і багаццю са Святым Пісаннем, якое ёсць Божым словам»[243]. Гэта вельмі старое распараджэнне Касцёла, якое трэба захоўваць[244]. Ужо папа Ян Павел II у сувязі з некаторымі злоўжываннямі звярнуў увагу на тое, наколькі важна ніколі не замяняць Святога Пісання іншымі чытаннямі[245]. Нагадваем, што таксама *рэспансарыйны псальм* з’яўляецца Божым словам, якім мы адказваем на голас Пана, і таму не павінен замяняцца іншымі тэкстамі; пажадана, аднак, маліцца ім у форме спеву.

*ж) Літургічны спеў, натхнёны Бібліяй*

70. Калі кажам пра каштоўнасць Божага слова падчас літургічнай цэлебрацыі слова, трэба памятаць таксама пра спеў у моманты, прадугледжаныя дадзеным абрадам, і выбіраць тыя з іх, якія маюць выразна біблійнае натхненне і якія дзякуючы гарманічнай сугучнасці слоў і музыкі змогуць выразіць прыгажосць Божага слова. Таму слушным з’яўляецца выкарыстанне тых спеваў, якія перадала нам традыцыя Касцёла і якія адпавядаюць гэтаму крытэрыю. Маю на ўвазе перадусім грыгарыянскі спеў[246].

з) *Асаблівы клопат пра невідушчых і глуханямых*

71. У гэтым кантэксце хацеў бы таксама нагадаць пра асаблівы клопат аб тых, каму з прычын здароўя цяжка актыўна ўдзельнічаць у Літургіі, напрыклад, невідушчым і

[240] Пар. *Propositio* 14.
[241] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 69.
[242] Пар. *Institutio Generalis Missalis Romani*, 57.
[243] *Propositio* 14.
[244] Пар. canon 36 *Synodi Hipponensis anni* 393: *DS*, 186.
[245] Пар. IOANNES PAULUS II, Litt. ap. *Vicesimus quintus annus* (4 Decembris 1988), 13: *AAS* 81 (1989), 910; CONGREGATIO DE CULTU DIVINO ET DISCIPLINA SACRAMENTORUM, *Redemptionis sacramentum. Instructio de quibusdam observandis et vitandis circa sanctissimam Eucharistiam* (25 Martii 2004), 62: *Ench. Vat.* 22, n. 2248.
[246] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. de Sacra Liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 116; *Institutio Generalis Missalis Romani*, 41.

глуханямым. Заахвочваем хрысціянскія супольнасці, каб па меры магчымасці стараліся пры дапамозе адпаведных сродкаў выходзіць насустрач братам і сёстрам, якія маюць такія цяжкасці, каб таксама і яны мелі магчымасць жывога кантакту са словам Пана[247].

## БОЖАЕ СЛОВА Ў ЖЫЦЦІ КАСЦЁЛА

*Сустрэць Божае слова ў Святым Пісанні*

72. Калі праўда, што Літургія – прывілеяванае месца абвяшчэння, слухання і цэлебравання Божага слова, то праўда таксама, што гэтая сустрэча павінна быць падрыхтавана ў сэрцах вернікаў, а перадусім паглыблена і прынята імі. Хрысціянскае жыццё адзначана галоўным чынам сустрэчай з Езусам Хрыстом, які заклікае нас пайсці за Ім. Таму Сінод Біскупаў шматразова падкрэсліваў значэнне пастырства ў хрысціянскіх супольнасцях як уласцівага асяродку, у якім можна ісці шляхам – індывідуальна і ў супольнасці – пазнавання Божага слова, каб яно сталася сапраўды фундаментам духоўнага жыцця. Разам з Айцамі Сіноду выказваю жывое жаданне, каб настала «новая эпоха большага ўмілавання Святога Пісання ўсімі членамі Божага народу, каб дзякуючы іх малітвам і настойліваму чытанню паглыблялася сувязь з асобай Езуса»[248].

На працягу гісторыі Касцёла святыя неаднаразова казалі пра неабходнасць пазнання Святога Пісання, каб узрастаць у любові Хрыста. Гэта асабліва бачна ў Айцоў Касцёла. Св. Геранім, вялікі «шанавальнік» Божага слова пытаўся: «Ці можна жыць без ведання Святога Пісання, праз якое мы вучымся пазнаваць самога Хрыста, які з’яўляецца жыццём веруючых людзей?»[249] Св. Геранім цалкам усведамляў, што Біблія – гэта прылада, «пры дапамозе якой Бог штодзённа прамаўляе да вернікаў»[250]. І таму ён даваў рымскай матроне Леце наступную параду адносна выхавання дочкі: «Пераканайся, што яна штодзённа вучыць нейкі фрагмент Святога Пісання. <...> Пасля малітвы няхай займаецца чытаннем, а пасля чытання – малітвай. <...> Няхай замест упрыгожванняў і шаўковых шат палюбіць Божыя Кнігі»[251]. Нас датычыць тое, што св. Геранім пісаў святару Непацыяну: «Чытай часта боскае Пісанне; больш за тое, не выпускай ніколі святой Кнігі з тваіх рук. Навучыся з яе таму, чаму павінен навучыцца»[252]. Наследуючы вялікага святога, які прысвяціў жыццё вывучэнню Бібліі і даў Касцёлу яе лацінскі пераклад, званы *Вульгатай,* а таксама ўсіх святых, чыё духоўнае жыццё было сканцэнтравана вакол сустрэчы з Хрыстом, пастараемся нанова паглыбіцца ў Слова, якое Бог даў Касцёлу. Так мы зможам дасягнуць

[247] Пар. *Propositio* 14.
[248] *Propositio* 9.
[249] *Epistula* 30, 7: *CSEL* 54, p. 246.
[250] Ён жа, *Epistula* 133, 13: *CSEL* 56, p. 260.
[251] Ён жа, *Epistula* 107, 9, 12: *CSEL* 55, pp. 300. 302.
[252] Ён жа, *Epistula* 52, 7: *CSEL* 54, p. 426.

«высокай меры звычайнага хрысціянскага жыцця»[253], да чаго заахвочваў нас папа Ян Павел II на пачатку трэцяга тысячагоддзя хрысціянства, якое корміцца няспынна слуханнем Божага слова.

*Біблійная анімацыя пастырства*

73. У гэтым духу Сінод заахвочваў да асаблівага ўдзелу ў пастрыстве, каб паказваць цэнтральнае месца Божага слова ў жыцці Касцёла, рэкамендуючы «больш інтэнсіўнае „біблійнае пастрыства" не як адну з формаў пастырства, але як *біблійную анімацыю ўсяго пастырства*»[254]. Не маецца на ўвазе арганізаванне некалькіх дадатковых сустрэч у парафіі або дыяцэзіі, але праверка, ці звычайная дзейнасць нашых хрысціянскіх супольнасцяў, парафій, таварыстваў і рухаў, сапраўды мае на мэце асабістую сустрэчу з Хрыстом, які аб'яўляецца нам у сваім слове. У гэтым сэнсе, паколькі «няведанне Святога Пісання – гэта няведанне Хрыста»[255], біблійная анімацыя ўсяго звычайнага і надзвычайнага пастырства прычыніцца да лепшага пазнання асобы Хрыста, які аб'явіў Айца і стаў паўнатой Божага Аб'яўлення.

Таму заахвочваю пастыраў і вернікаў памятаць пра значэнне гэтай анімацыі: гэта будзе таксама найлепшым спосабам пераадолення некаторых пастырскіх праблем, пра якія гаварылася падчас сінадальнага Сходу і якія звязаны, напрыклад, з *памнажэннем сект*, што прапагандуюць памылковае і інструментальнае чытанне Святога Пісання. Там, дзе вернікаў не ўводзяць у пазнанне Біблii згодна з верай Касцёла, у плыні яго жывой Традыцыі, фактычна ствараецца пустка, у якой такія рэчаіснасці як секты могуць лёгка пускаць карані. Таму трэба таксама паклапаціцца пра адпаведную падрыхтоўку святароў і свецкіх, каб яны маглі вучыць народ Божы праўдзіваму кантакту са Святым Пісаннем.

Больш за тое, як падкрэслівалася падчас сінадальных прац, было б добра, каб пастырская дзейнасць спрыяла таксама ўзнікненню шматлікіх *малых супольнасцяў*, якія складаюцца з сем'яў, укаранёных у парафіях ці звязаных з рознымі касцёльнымі рухамі і новымі супольнасцямі[256], якія пашыралі б малітоўную фармацыю і пазнаванне Біблii паводле веры Касцёла.

*Біблійнае вымярэнне катэхезы*

74. Важная галіна пастырства Касцёла, якая дае магчымасць мудра адкрыць нанова цэнтральнае месца Божага слова, з'яўляецца катэхеза, якая ў сваіх розных формах і фазах заўсёды павінна сапутнічаць Божаму народу. Апісаная Евангелістам Лукой сустрэча вучняў з Эмаус з Езусам (пар. *Лк* 24, 13-35) паказвае ў нейкім сэнсе прыклад катэхезы, у цэнтры якой - «тлумачэнне Пісанняў», якое можа даць толькі Хрыстус (пар. *Лк* 24, 27-28), паказваючы ў самім сабе іх спаўненне[257]. І так

[253] Litt. ap. *Novo millennio ineunte* (6 Ianuarii 2001), 31: *AAS* 93 (2001), 287-288.
[254] *Propositio* 30; пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 24.
[255] S. HIERONYMUS, *Commentariorum in Isaiam libri*, *Prol.*: *PL* 24, 17 B.
[256] Пар. *Propositio* 21.
[257] Пар. *Propositio* 23.

нараджаецца зноў надзея, мацнейшая за ўсялякія няўдачы, якая чыніць з гэтых вучняў перакананых і верагодных сведкаў Уваскрослага.

У *Агульнай катэхетычнай дырэкторыі* знаходзім важнае ўказанне адносна біблійнай анімацыі катэхезы, да якой варта вяртацца[258]. Пры гэтай нагодзе хачу перадусім падкрэсліць, што катэхеза павінна быць «напоўнена і прасякнута думкаю, духам і біблійнымі і евангельскімі падставамі праз пастаянны кантакт з самімі тэкстамі, але таксама нагадаць, што катэхеза будзе настолькі багацейшай і больш плённай, наколькі будзе разумець словы паводле думкі і духа Касцёла; яна павінна натхняцца думкаю і жыццём дзвюх тысяч гадоў Касцёла»[259]. Таму трэба заахвочваць да пазнавання постацяў, падзей і асноўных выказванняў святога тэксту; у гэтым можа таксама дапамагчы разумнае *завучванне* некаторых асабліва вымоўных біблійных фрагментаў, якія датычаць хрысціянскіх таямніц. Катэхетычная дзейнасць прадугледжвае заўсёды пазнаванне Пісанняў у веры і Традыцыі Касцёла, каб гэтыя словы ўспрымаліся як жывыя, як жывым ёсць сёння Хрыстус там, дзе два або тры сабраліся ў Яго імя (пар. *Мц* 18, 20). Яна павінна жыццёва перадаваць гісторыю збаўлення і змест веры Касцёла, каб кожны вернік прызнаў, што таксама яго існаванне належыць да гэтай гісторыі.

У гэтай перспектыве важна звярнуць увагу на адносіны паміж Святым Пісаннем і *Катэхізісам Каталіцкага Касцёла,* што пацвердзіла *Агульная катэхетычная дырэкторыя*: «Святое Пісанне, як „Божае слова, запісана пад натхненнем Духа Святога” і Катэхізіс Каталіцкага Касцёла, як важнае актуальнае выражэнне жывой Традыцыі Касцёла і пэўная норма для навучання веры, маюць заданне, кожнае адпаведным сабе спосабам і адпаведна са сваім аўтарытэтам, ажывіць катэхезу ў сучасным Касцёле»[260].

*Біблійная фармацыя хрысціянаў*

75. Каб дасягнуць пастаўленай Сінодам мэты, якой з’яўляецца наданне больш біблійнага характару ўсяму пастырству Касцёла, неабходна адпаведная фармацыя хрысціянаў, а асабліва катэхетаў. У сувязі з гэтым трэба звярнуць увагу на *біблійны апасталат*, які з’яўляецца, як паказвае эклезіяльны досвед, эфектыўным метадам дасягнення гэтай мэты. Акрамя гэтага Айцы Сіноду рэкамендавалі, каб па меры магчымасці – выкарыстоўваючы існуючыя ўжо акадэмічныя структуры – ствараць асяродкі фармацыі для свецкіх і місіянераў, у якіх можна навучыцца разумець Божае слова, жыць ім і абвяшчаць яго, а там, дзе гэта здаецца неабходным, «адкрываць

[258] Пар. CONGREGATIO PRO CLERICIS, *Directorium generale pro catechesi* (15 Augusti 1997), 94-96; *Ench Vat.*, 16, n. 875-878; IOANNES PAULUS II, Adhort. ap. *Catechesi tradendae* (16 Octobris 1979), 27: *AAS* 71 (1979), 1298-1299.
[259] *Тамсама*, 127: *Ench. Vat.* 16, n. 935; пар. IOANNES PAULUS II, Adhort. ap. *Catechesi tradendae* (16 Octobris 1979), 27: *AAS* 71 (1979), 1299.
[260] *Тамсама*, 128: *Ench. Vat.*, 16, n. 936.

спецыялізаваныя інстытуты вывучэння Бібліі, каб экзэгеты маглі здабываць салідныя тэалагічныя веды і былі чулымі да кантэксту сваёй місіі»[261].

*Святое Пісанне падчас вялікіх касцёльных сустрэч*

76. Сярод многіх ініцыятыў, якія можна рэалізаваць, Сінод прапануе, каб падчас сходаў як на дыяцэзіяльным узроўні, так і нацыянальным ці міжнародным больш падкрэслівалася значэнне Божага слова, яго слуханне, а таксама чытанне Бібліі ў духу веры і малітвы. Таму падчас нацыянальных і міжнародных эўхарыстычных кангрэсаў, сусветных дзён моладзі і іншых сустрэч можна будзе з карысцю прызначыць большае месца на цэлебрацыю слова і біблійную фармацыю[262].

*Божае слова і пакліканні*

77. Падкрэсліваючы, што неад'емным патрабаваннем веры з'яўляецца паглыбленне сувязі з Хрыстом, Божым Словам сярод нас, Сінод хацеў таксама падкрэсліць тое, што гэтае Слова заклікае кожнага асабіста, паказваючы такім чынам, што *само жыццё – гэта пакліканне* адносна Бога. Гэта азначае, што чым больш мы паглыбляем нашую асабістую сувязь з Панам Езусам, тым больш разумеем, што Ён сам кліча нас да святасці, патрабуючы канчатковага выбару, якім нашае жыццё адказвае на Яго любоў, прысвячаючы сябе заданням і паслугам, якія маюць на мэце будаванне Касцёла. У гэтай перспектыве можна зразумець заклікі, якія Сінод скіроўвае да ўсіх хрысціянаў, каб яны паглыблялі сувязь з Божым словам як ахрышчаныя, але таксама як пакліканыя да жыцця згодна з рознымі станамі. Тут закранаем адзін з асноўных пунктаў вучэння Другога Ватыканскага Сабору, які падкрэсліў пакліканне да святасці ўсіх вернікаў, кожнага згодна з уласным станам жыцця[263]. Менавіта ў Святым Пісанні знаходзім аб'яўленне нашага паклікання да святасці: «Будзьце святымі, як святы Я, Пан Бог ваш» (*Лев* 11, 44; 19, 2; 20, 7). Св. Павел паказвае затым хрысталагічныя падставы гэтага паклікання: Айцец у Хрысце «выбраў нас <…> перад стварэннем свету, каб мы былі святымі і беззаганнымі перад Ім у любові» (*Эф* 1, 4). І так можам успрымаць, як скіраванае да кожнага з нас, яго прывітанне братоў і сясцёр з рымскай супольнасці: «Усім <...> умілаваным Бога, пакліканым святым: ласка вам і спакой ад Бога, Айца нашага, і Пана Езуса Хрыста» (*Рым* 1, 7).

*а) Божае слова і пасвячаныя распарадчыкі*

78. Звяртаючыся цяпер да распардчыкаў у Касцёле, якія атрымалі сакрамэнт пасвячэння, найперш нагадваю ім усім тое, што сказаў Сінод: «Божае слова з'яўляецца неад'емным у выхаванні сэрца добрага пастыра, распардчыка слова»[264].

---

[261] Пар. *Propositio* 33.
[262] Пар. *Propositio* 45.
[263] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 39-42.
[264] *Propositio* 31.

Біскупы, прэзбітэры і дыяканы не могуць цалкам думаць аб перажыванні свайго паклікання і місіі без рашучага і пастаянна новага імкнення да ўласнага асвячэння, адзіным слупом якога з'яўляецца кантакт з Бібліяй.

79. Пакліканым да *біскупства*, якія з'яўляюцца першымі і найбольш аўтарытатыўнымі вестунамі Слова, хачу нагадаць тое, што сцвердзіў папа Ян Павел II у паслясінадальнай адгартацыі *Pastores gregis*. Каб падтрымліваць і паглыбляць духоўнае жыццё, біскуп павінен заўсёды ставіць «на першым месцы чытанне Божага слова і разважанне над ім. Кожны біскуп павінен заўсёды давярацца і адчуваць сябе davераным „ Богу і слову Ягонай ласкі, які можа збудаваць і даць спадчыну між усіх асвячаных" (*Дз* 20, 32). Таму, перад тым як сам будзе перадаваць слова, біскуп разам са сваімі прэзбітэрамі і як кожны вернік, а менавіта як увесь Касцёл, павінен слухаць слова. Павінен быць нібы „занураным" у слове, каб яно сцерагло яго і карміла як мацярынскае ўлонне»[265]. Раю ўсім братам у біскупстве частае асабістае чытанне і стараннае вывучэнне Святога Пісання на ўзор Марыі, *Virgo audiens* і Каралевы Апосталаў.

80. Таксама ў дачыненні да *прэзбітэраў* хацеў бы прыгадаць словы папы Яна Паўла II, які ў паслясінадальнай апостальскай адгартацыі *Pastores dabo vobis* прыпомніў, што «прэзбітэр – гэта перадусім распарадчык Божага слова, ён кансэкраваны і пасланы абвяшчаць усім Евангелле пра Валадарства, заклікаючы кожнага чалавека да паслухмянасці веры і ведучы вернікаў да штораз глыбейшага пазнання і ўдзелу ў таямніцы Бога, аб'яўленай і перададзенай нам у Хрысце». Таму сам святар павінен часта кантактаваць з Божым словам. «Не можа спыніцца на пазнанні моўных аспектаў ці экзэгетычных, хоць гэта неабходна, з сэрцам паслухмяным і размоленым ён павінен набліжацца да Слова, каб яно пранікнула ў глыбіню яго думак і пачуццяў і нарадзіла ў ім новы менталітэт – „розум Хрыстовы" (*1 Кар* 2, 16)»[266]. У выніку яго словы, яго рашэнні і паставы павінны быць штораз больш выразным абвяшчэннем і сведчаннем пра Евангелле. «Толькі „трываючы" ў слове, святар стане дасканалым вучнем Езуса, пазнае праўду і будзе сапраўды свабодным»[267].

Канчаткова пакліканне да святарства патрабуе сапраўднага *асвячэння «ў праўдзе»*. Сам Езус выказвае гэтае патрабаванне да сваіх вучняў: «Асвяці іх у праўдзе. Слова Тваё – гэта праўда. Як Ты паслаў Мяне ў свет, так і Я паслаў іх у свет» (*Ян* 17, 17-18). Вучні ў пэўным сэнсе «ўведзены ў блізкі кантакт з Богам праз занурэнне ў Божым слове. Слова Бога, калі можна так сказаць, ёсць абмыццём, якое іх ачышчае, творчай моцаю, якая перамяняе іх у Божыя істоты»[268]. А паколькі сам Хрыстус – Слова Бога, якое сталася целам (*Ян* 1, 14), - ёсць «Праўдай» (*Ян* 14, 6), то

[265] N. 15: *AAS* 96 (2004), 846-847.
[266] N. 26: *AAS* 84 (1992), 698.
[267] *Тамсама*.
[268] BENEDICTUS XVI, *Homilia in Missa Chrismatis* (9 Aprilis 2009): *AAS* 101 (2009), 355.

малітва Езуса да Айца: «Асвяці іх у праўдзе», азначае ў больш глыбокім сэнсе: «учыні іх адным са Мною, з Хрыстом. З'яднай іх са Мною, Прыцягні да Мяне. Фактычна існуе толькі адзін Святар Новага Запавету - Езус Хрыстус»[269]. Таму трэба, каб святары абнаўлялі і паглыблялі ўсведамленне гэтай рэчаіснасці.

81. Хацеў бы згадаць пра ролю Божага слова таксама ў жыцці пакліканых да *дыяканату*, не толькі як ступені, якая папярэднічае прэзбітэрскаму пасвячэнню, але як сталай паслугі. *Дырэкторыя аб паслузе і жыцці сталых дыяканаў* сцвярджае, што «у тэалагічнай тоеснасці дыякана выразна бачны рысы яго спецыфічнай духоўнасці, якая з'яўляецца ў асноўным духоўнасцю служэння. Самым дасканалым прыкладам з'яўляецца Хрыстус-Слуга, які быў цалкам аддадзены служэнню Богу дзеля дабра людзей»[270]. У гэтай перспектыве зразумела, чаму ў розных вымярэннях дыяканскай паслугі «элементам, які характарызуе духоўнасць дыякана з'яўляецца Божае слова, якога ён павінен быць аўтарытатыўным вестуном, выказваючы веру ў тое, што абвяшчае, навучаючы таму, у што верыць, жывучы тым, чаму вучыць»[271]. Таму рэкамендую, каб дыяканы праз вучобу і малітву ўзбагачалі сваё жыццё поўным веры чытаннем Святога Пісання. Няхай будуць уведзеныя ў пазнанне Святога Пісання і яго правільную інтэрпрэтацыю; ва ўзаемныя сувязі паміж Пісаннем і Традыцыяй; асабліва ў карыстанне Святым Пісаннем у прапаведаванні, катэхезе і ўвогуле ў пастырскай дзейнасці[272].

*б) Божае слова і кандыдаты да пасвячэння*

82. Сінод асабліва падкрэсліў галоўную ролю Божага слова ў духоўным жыцці кандыдатаў да службовага святарства: «Кандыдаты да святарства павінны вучыцца любіць Божае слова. Няхай Святое Пісанне будзе душой іх тэалагічнай фармацыі, пры гэтым трэба звярнуць увагу на неад'емную ўзаемную сувязь паміж экзэгезай, тэалогіяй, духоўнасцю і місіяй»[273]. Той, хто рыхтуецца да службовага святарства павінен паглыбляць асабістую сувязь з Божым словам, асабліва праз *lectio divina*, бо праз такую сувязь умацоўваецца само пакліканне: у святле і ў моцы Божага слова можна адкрыць, зразумець і палюбіць уласнае пакліканне, пайсці за ім і выканаць сваю місію, абуджаючы ў сэрцы Божыя думкі, так каб вера, як адказ на Слова, стала новым крытэрыем суджэння і ацэнкі людзей і рэчаў, падзей і праблем[274].

Гэтае падтрыманне малітоўнага чытання Святога Пісання не павінна ніякім чынам аддзяляцца ад неабходнага ў часе фармацыі экзэгетычнага вывучэння. Сінод

---

[269] *Тамсама*, 356.

[270] CONGREGATIO DE INSTITUTIONE CATHOLICA, *Ratio fundamentalis institutionis diaconorum permanentium* (22 Februarii 1998), 11: *Ench. Vat.* 17, n. 174-175.

[271] *Тамсама*, 74: *Ench. Vat.*, 17, n. 263.

[272] Пар. *тамсама*, 81: *Ench. Vat.*, 17, n. 271.

[273] *Propositio* 32.

[274] Пар. IOANNES PAULUS II, Adhort. ap. postsynodalis *Pastores dabo vobis* (25 Martii 1992), 47: *AAS* 84 (1992), 740-742.

раіць, каб канкрэтна дапамагалі семінарыстам заўважыць *сувязь паміж вывучэннем Біблії і малітвай пры дапамозе Святога Пісання.* Вывучэнне Святога Пісання павінна паглыбляць разуменне таямніцы Божага Аб'яўлення і абуджаць да сведчання малітоўнага адказу Пану, які гаворыць. З другога боку, таксама праўдзівае малітоўнае жыццё чыніць, што ў душы кандыдата ўзрастае жаданне штораз глыбей пазнаваць Бога, які аб'яўляецца ў сваім слове як бясконцая любоў. Таму трэба прыкласці вялікія намаганні, каб у жыцці семінарыстаў развіваліся гэтыя *ўзаемныя адносіны паміж вывучэннем і малітвай.* Каб дасягнуць гэтай мэты, трэба ўводзіць кандыдатаў у вывучэнне Святога Пісання метадамі, якія спрыяюць інтэгральнаму падыходу.

*в) Божае слова і кансэкраванае жыццё*

83. Адносна кансэкраванага жыцця Сінод нагадаў перадусім, што «яно нараджаецца са слухання Божага слова і прымае Евангелле як сваю норму жыцця»[275]. Жыццё, якое з'яўляецца наследаваннем Хрыста беззаганнага, убогага і паслухмянага становіцца такім чынам «жывой экзэгезай Божага слова»[276]. Дух Святы, у моцы якога была напісана Біблія, ёсць тым самым, хто асвятляе «новым святлом Божага слова, скіраванага да заснавальнікаў і заснавальніц. З яго узяла пачатак кожная харызма, а кожная Рэгула хоча быць выразам гэтага»[277], даючы пачатак формам хрысціянскага жыцця, якое адзначаецца евангельскім радыкалізмам.

Хацеў бы нагадаць, што вялікая манаская традыцыя заўсёды лічыла галоўным элементам сваёй духоўнасці разважанне над Святым Пісаннем, асабліва ў форме *lectio divina*. Таксама сёння даўнейшыя і новыя формы спецыяльнай кансэкрацыі павінны быць сапраўднымі школамі духоўнага жыцця, у якіх чытаецца Святое Пісанне паводле Духа Святога ў Касцёле, каб увесь Божы народ мог мець з гэтага карысць. Таму Сінод рэкамендуе, каб у супольнасцях кансэкраванага жыцця заўсёды была салідная фармацыя да поўнага веры чытання Біբліі[278].

Хацеў бы таксама нагадаць пра клопат і ўдзячнасць, якую Сінод выказаў членам *кантэмпляцыйных законаў*, якія з увагі на сваю адмысловую харызму прысвячаюць на працягу дня шмат часу неследаванню Маці Божай, якая старанна разважала словы і чыны свайго Сына (пар. *Лк* 2, 19. 51), а таксама Марыі з Бэтаніі, якая, седзячы ля ног Пана, слухала Яго слова (пар. *Лк* 10, 39). Маю на ўвазе асабліва манахаў і манашак з кляўзуровых законаў, якія праз аддзяленне ад свету глыбей яднаюцца з Хрыстом, сэрцам свету. Сёння Касцёл, больш чым калі-небудзь, патрабуе сведчання

[275] *Propositio* 24.
[276] BENEDICTUS XVI, *Homilia in Die Internationali* Vitae Consecratae *dicato* (2 Februarii 2008): *AAS* 100 (2008), 133; пар. IOANNES PAULUS II, Adhort. ap. postsynodalis *Vita consecrata* (25 Martii 1996), 82; *AAS* 88 (1996), 458-460.
[277] CONGREGATIO PRO INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE ET SOCIETATIBUS VITAE APOSTOLICAE, Instr. *Contemplando il volto* (19 Maii 2002), 24: *Ench. Vat.* 21, n. 447.
[278] Пар. *Propositio* 24.

тых, хто дае абяцанне «нічога не ставіць вышэй за любоў Хрыста»[279]. Сучасны свет празмерна заняты знешняй дзейнасцю, і яму пагражае загубленасць у ёй. Браты і сёстры з кантэмпляцыйных законаў сваім малітоўным жыццём, слуханнем і разважаннем Божага слова нагадваюць нам, што не адным хлебам жыве чалавек, але кожным словам, якое паходзіць з вуснаў Божых (*Мц* 4, 4). Таму ўсе вернікі павінны памятаць, што гэтая форма жыцця «паказвае сучаснаму свету найважнейшую рэч, больш за тое, галоўную: існуе канчатковая праўда, для якой варта жыць, гэта значыць Бог і Яго невычарпальная любоў»[280].

*г) Божае слова і свецкія вернікі*

84. Сінод шматразова выказваўся на тэму свецкіх вернікаў, дзякуючы ім за велікадушны ўдзел у пашырэнні Евангелля ў розных асяроддзях штодзённага жыцця, у працы, у школе, у сям'і і ў сферы выхавання[281]. Гэтае заданне, якое вынікае з хросту, павінна выконвацца праз усё больш свядомае хрысціянскае жыццё, якое дазваляе «абгрунтаваць надзею», якая ёсць у нас (пар. *1 П* 3, 15). У Евангеллі паводле Мацвея Езус кажа, што «Поле – гэта свет, добрае насенне – гэта сыны Валадарства» (13, 38). Гэтыя словы адносяцца асабліва да свецкіх хрысціянаў, якія, «*далучаныя да часовай рэчаіснасці і праз удзел у зямной дзейнасці*»[282], рэалізуюць сваё пакліканне да святасці, жывучы паводле Духа. Яны павінны фарміравацца так, каб распазнаваць Божую волю праз цесны кантакт з Божым словам, якое чытаецца і вывучаецца ў Касцёле пад кіраўніцтвам правамоцных пастыраў. Няхай здабываюць гэтую фармацыю ў школах вялікай духоўнасці Касцёла, у падстаў якіх ёсць заўсёды Святое Пісанне. Няхай дыяцэзіі па меры магчымасці ствараюць нагоду фармацыі свецкіх, якія выконваюць асабліва адказную функцыю ў Касцёле[283].

*д) Божае слова, сужэнства і сям'я*

85. Сінод палічыў неабходным звярнуць увагу на сувязь паміж Божым словам, сужэнствам і хрысціянскай сям'ёй. Сапраўды, «абвяшчаючы Божае слова, Касцёл аб'яўляе хрысціянскай сям'і яе сапраўдную тоеснасць, тое, чым яна з'яўляецца і чым павінна быць паводле намеру Пана»[284]. Таму ніколі нельга забываць, што *Божае слова знаходзіцца ў пачатку сужэнства* (пар. *Быц* 2, 24) і што сам Езус уключыў сужэнства ў інстытуцыі свайго валадарства (пар. *Мц* 19, 4-8), узносячы да годнасці сакрамэнту тое, што першапачаткова было ўпісана ў чалавечую натуру. «У цэлебрацыі сакрамэнту мужчына і жанчына вымаўляюць прарочыя словы пра

---

[279] S. BENEDICTUS, *Regula*, IV, 21: *SC* 181, 456-458.

[280] BENEDICTUS XVI, *Allocutio in visitatione Abbatiae «Heiligenkreuz»* (9 Septembris 2007): *AAS* 99 (2007), 856.

[281] Пар. *Propositio* 30.

[282] IOANNES PAULUS II, Adhort. ap. postsynodalis *Christifideles laici* (30 Decembris 1988), 17.

[283] Пар. *Propositio* 33.

[284] IOANNES PAULUS II, Adhort. ap. *Familiaris consortio* (22 Novembris 1981), 49: *AAS* 74 (1982), 140-141.

ўзаемнае адданне сябе, каб быць „адным целам” на знак таямніцы еднасці Хрыста і Касцёла (пар. *Эф* 5, 31-32)»[285]. Верныя Божаму слову, мы павінны таксама падкрэсліць, што сёння ў многім гэтая інстытуцыя атакуецца сучасным менталітэтам. На распаўсюджанае бязладдзе ў сферы пачуццяў і ўзнікненне спосабаў мыслення, якія баналізуюць чалавечае цела і сэксуальныя адрозненні, Божае слова адказвае, пацвярджаючы першасную дабрыню чалавека, створанага мужчынам і жанчынай і пакліканага да вернай, узаемнай і плоднай любові.

З вялікай абранніцкай таямніцы вынікае *адказнасць бацькоў за сваіх дзяцей.* Да праўдзівага айцоўства і мацярынства належыць паказванне сэнсу жыцця ў Хрысце і сведчанне пра яго: праз вернасць і еднасць сямейнага жыцця сужэнцы з’яўляюцца для сваіх дзяцей першымі вестунамі Божага слова. Эклезіяльная супольнасць павінна іх падтрымліваць і дапамагаць ім умацоўваць малітву ў сям’і, слухаць слова і пазнаваць Біблію. Таму Сінод выказвае жаданне, каб у *кожным доме была Біблія* і каб яна захоўвалася ў годным месцы, каб можна было яе чытаць і карыстацца ёй падчас малітвы. Пры неабходнасці дапамогаю могуць быць святары, дыяканы або адпаведна падрыхтаваныя свецкія. Сінод раіць таксама стварыць малыя супольнасці, якія складаюцца з сем’яў, каб маліцца і разам разважаць адпаведныя фрагменты Пісання[286]. Сужэнцы няхай таксама памятаюць, што «Божае слова з’яўляецца каштоўнай падтрымкай таксама ў цяжкасцях сужэнскага і сямейнага жыцця»[287].

У гэтым кантэксце хачу прадставіць тое, што Сінод нагадаў на тэму *задання жанчын адносна Божага слова.* Уклад «жаноцкага генія» – як назваў яго папа Ян Павел II[288] – у пазнанне Святога Пісання і ва ўсё жыццё Касцёла сёння большы, чым у мінулым і датычыць таксама самога вывучэння Бібліі. Сінод прысвяціў асаблівую ўвагу неад’емнай ролі жанчыны ў сям’і, выхаванні, катэхезе і ў перадаванні каштоўнасцяў. Сапраўды, «яны змогуць абудзіць да слухання Слова, да асабістых адносін з Богам і змогуць паказаць сэнс прабачэння і евангельскага абмену»[289], а таксама несці любоў, быць настаўніцамі міласэрнасці і будаўнікамі спакою, уносячы цяпло і чалавечнасць у свет, які вельмі часта ацэньвае асобы, гледзячы на іх з халадком праз прызму карысці.

*Малітоўнае чытанне Святога Пісання і «lectio divina»*

86. Сінод шматразова падкрэсліваў неабходнасць малітоўнага падыходу да святога тэксту як асноўнага элементу духоўнага жыцця ўсіх веруючых у розных паслугах і жыццёвых станах, з асаблівым улікам *lectio divina*[290]. Божае слова знаходзіцца ў падставу кожнай праўдзівай хрысціянскай духоўнасці. У сувязі з гэтым Айцы Сіноду ўзгадалі словы з Дагматычнай канстытуцыі *Dei Verbum*: «Таму [рэд. вернікі] няхай з

[285] *Propositio* 20.
[286] Пар. *Propositio* 21.
[287] *Propositio* 20.
[288] Пар. Ep. ap. *Mulieris dignitatem* (15 Augusti 1988), 31: *AAS* 80 (1988), 1727-1729.
[289] *Propositio* 17.
[290] Пар. *Propositiones* 9. 22.

ахвотай падыходзяць да чытання святога тэксту ці праз святую Літургію, перапоўненую Божымі словамі, ці праз пабожнае чытанне, ці праз адпаведныя для гэтага ўстановы ці іншыя сродкі дапамогі, якія пры падтрымцы і пад апекай пастыраў Касцёла паўсюль слаўна пашыраюцца ў наш час. І няхай яны памятаюць, што чытанню Святога Пісання павінна спадарожнічаць малітва»[291]. Саборныя разважанні нагадваюць пра вялікую патрыстычную традыцыю, якая заўсёды заахвочвала да чытання Святога Пісання ў дыялогу з Богам. Як кажа св. Аўгустын: «Твая малітва – гэта твае слова, скіраванае да Бога. Калі чытаеш <…>, Бог прамаўляе да цябе; калі молішся, то ты гаворыш з Богам»[292]. Арыген, адзін з настаўнікаў такога чытання Бібліі, лічыць, «што разуменне Пісанняў, больш чым вывучэнне, патрабуе блізкасці з Хрыстом і малітвы». Ён перакананы, што «найлепшы шлях да пазнання Бога – любоў, а таксама, што няма праўдзівай *scientia Christi* без умілавання Яго». У *Пасланні да Грыгорыя*, вялікага александрыйскага тэолага, казаў: «Прысвяці сябе *lectio* Божых Пісанняў; вытрывала практыкуй гэта. Распачні *lectio* з намерам паверыць Богу і прыпадобніцца да Яго. Калі падчас *lectio* станеш перад закрытымі дзвярыма, пастукай, і адкрые табе вартаўнік, пра якога Езус сказаў: „Дазорца яму іх адкрые”. Прысвячаючы сябе такім чынам *lectio divina*, шукай старанна і з непарушнай надзеяй у Богу сэнс Божых Пісанняў, які ў іх багата прадстаўлены. Аднак ты не павінен спыняцца на стуканні і шуканні: каб зразумець Божыя справы табе абсалютна патрэбна *oratio*. Менавіта для таго, каб нас да яе заахвоціць, Збаўца сказаў не толькі: „Шукайце, і знойдзеце”, а таксама: „Стукайце, і адчыняць вам”, але дадаў: „Прасіце, і будзе вам дадзена”»[293].

Аднак у гэтай сферы трэба *асцерагацца небяспекі індывідуалістычнага падыходу*, маючы на ўвазе тое, што Божае слова было дадзена нам менавіта для таго, каб будаваць супольнасць, каб яднаць нас у Праўдзе на нашым шляху да Бога. Гэтае Слова скіравана да кожнага асабіста, але гэта таксама Слова, якое будуе супольнасць, будуе Касцёл. Таму мы павінны *чытаць святы тэкст заўсёды ў супольнасці Касцёла.* Сапраўды, «вельмі важным ёсць чытанне ў супольнасці, бо жывым суб’ектам Святога Пісання з’яўляецца Божы народ, Касцёл. <...> Пісанне не належыць да мінулага, бо яго суб’ект, народ Божы, натхнёны самім Богам, ёсць заўсёды той сам, а таму слова заўсёды жывое ў жывым суб’екце. Таму важна, каб чытаць Святое Пісанне і слухаць Святое Пісанне ў супольнасці Касцёла, гэта значыць з усімі вялікімі сведкамі гэтага слова, пачынаючы ад першых Айцоў аж да сённяшніх святых, аж да сённяшняга Настаўніцкага Інстытута Касцёла»[294].

Таму *прывілеяваным месцам* малітоўнага чытання Святога Пісання ёсць *Літургія*, а асабліва *Эўхарыстыя*, у якой, калі цэлебруецца Цела і Кроў Хрыста ў сакрамэнце, становіцца прысутным сярод нас само Слова. У пэўным сэнсе малітоўнае чытанне,

[291] N. 25.
[292] *Enarrationes in Psalmos* 85, 7: *PL* 37, 1086.
[293] ORIGENES, *Epistula ad Gregorium,* 3: *PG* 11, 92.
[294] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad sacrorum alumnos Seminarii Romani Maioris* (19 Februarii 2007): *AAS* 99 (2007), 253-254.

асабістае і супольнае, павінна заўсёды мець аднясенне да эўхарыстычнай цэлебрацыі. Так як эўхарыстычная адарацыя рыхтуе эўхарыстычную літургію, спадарожнічае ёй і яе паглыбляе[295], так і малітоўнае чытанне, асабістае і супольнае, рыхтуе да таго, што цэлебруе Касцёл, абвяшчаючы Божае слова падчас Літургіі, спадарожнічае гэтаму і гэта паглыбляе. Разглядаючы ў такой цеснай сувязі *lectio* і Літургію, можна лепш заўважыць крытэрыі, якімі трэба кіравацца падчас гэтага чытання ў кантэксце пастырства і духоўнага жыцця Божага народу.

87. У дакументах, якія рыхтавалі Сінод і якія спадарожнічалі яму, гаварылася пра розныя метады чытання Святога Пісання з карысцю і ў духу веры. Аднак найбольшая ўвага была прысвечана *lectio divina*, якая сапраўды «можа адкрыць перад вернікамі скарб Божага слова, а таксама прывесці да сустрэчы з Хрыстом, жывым Божым Словам»[296]. Хацеў бы коратка нагадаць тут яе асноўныя этапы: распачынаецца яна чытаннем (*lectio*) тэксту, якое абуджае жаданне праўдзівага пазнання яго зместу: *што кажа біблійны тэкст сам па сабе?* Без гэтага этапу існуе небяспека, што тэкст стане толькі прычынай, каб ніколі не выйсці па-за ўласныя думкі. Затым наступае разважанне (*meditatio*), у якім ставім сабе пытанне: *што кажа нам біблійны тэкст?* Тут кожны асабіста, і таксама супольнасць павінна адкрыцца на яго і супаставіць сябе з ім, паколькі не маецца на ўвазе разважанне над словамі, сказанымі ў мінулым, але ў дадзеную хвіліну. Затым падыходзім да этапу малітвы (*oratio*), якая прадбачыць пытанне: *што мы кажам Пану ў адказ на Яго?* Малітва ў якасці просьбы, заступніцтва, падзякі і праслаўлення – гэта першы спосаб, праз які Слова нас змяняе. Урэшце *lectio divina* заканчваецца кантэмпляцыяй (*contemplatio*), падчас якой прымаем – як дар Бога – Яго позірк пры ацэнцы рэчаіснасці і пытаемся: *якой змены мыслення, сэрца і жыцця патрабуе ад нас Пан?* Св. Павел піша ў *Пасланні да Рымлянаў*: «Не дастасоўвайцеся да гэтага веку, але перамяняйцеся праз абнаўленне розуму вашага, каб вы пазналі, якая воля Божая – добрая, прыемная і дасканалая» (12, 2). Кантэмпляцыя павінна сфарміраваць у нас мудрае бачанне рэчаіснасці паводле Бога, каб сфарміраваць у нас «розум Хрыста» (*1 Кар* 2, 16). Божае слова становіцца тут крытэрыем распазнання, яно «жывое і дзейснае, вастрэйшае за ўсялякі меч двусечны. Яно пранікае ажно да падзелу душы і духа, суставаў і шпіку і здольнае судзіць думкі і намеры сэрца» (*Гбр* 4, 12). Варта таксама нагадаць, што *lectio divina* у сваёй дынаміцы не заканчваецца, пакуль не прывядзе да дзеяння (*actio)*, якое чыніць, што жыццё веруючага становіцца дарам для іншых у любові.

Дасканалай формай спалучэння і прадстаўлення гэтых элементаў з'яўляецца Маці Божая, якая стала для кожнага верніка прыкладам паслухмянага прыняцця Божага слова. Яна «захоўвала ўсе гэтыя словы, разважаючы ў сэрцы сваім» (*Лк* 2, 19; пар. 2,

[295] Пар. *ён жа*, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 66.
[296] *Nuntius conclusivus*, III, 9.

51), «у вялікім Божым плане ўмела заўважыць глыбокую думку, якая яднае падзеі, чыны і рэчы, на выгляд з сабой не звязаныя»[297].

Хацеў бы таксама нагадаць тое, што сказана падчас Сіноду на тэму значэння *асабістага чытання Святога Пісання таксама як пакутнай практыкі*, з якой звязана магчымасць атрымання, згодна са звычайным распараджэннем Касцёла, адпусту для сябе або для памерлых[298]. Практыка адпусту[299] грунтуецца на вучэнні пра бясконцыя заслугі Хрыста, якія Касцёл размяркоўвае і выкарыстоўвае як распарадчык адкуплення, але прадугледжвае таксама вучэнне пра еднасць святых і кажа нам, «як вельмі ў Хрысце мы ўзаемна, унутрана з'яднаныя і як вельмі звышпрыроднае жыццё кожнага можа ўплываць на іншых»[300]. У гэтай перспектыве чытанне Божага слова падтрымлівае нас на шляху пакаяння і навяртання, дазваляе нам паглыбіць пачуццё прыналежнасці да Касцёла і ўтрымлівае нас у больш глыбокай еднасці з Богам. Як сцвярджаў св. Амброзій: калі чалавек бярэ ў рукі з вераю Святое Пісанне і чытае яго, зноў ходзіць з Богам у раі[301].

*Божае слова і Марыйная малітва*

88. Маючы на ўвазе непарушную сувязь паміж Божым словам і Марыяй з Назарэта, разам з Айцамі Сіноду заахвочваю прапагандаваць сярод вернікаў, асабліва ў сямейным жыцці, Марыйныя малітвы як дапамогу ў разважанні святых таямніц, пра якія апавядае Святое Пісанне. Вельмі карыснай прыладай ёсць, напрыклад, індывідуальны або супольны *Святы Ружанец*[302], у якім разважаецца разам з Марыяй таямніца жыцця Хрыста[303], і які дапоўнены папам Янам Паўлам II таямніцамі Святла[304]. Пажадана, каб абвяшчэнням паасобных таямніц спадарожнічалі кароткія фрагменты Бібліі, звязаныя з дадзенай таямніцай, што аблегчыць запамінанне некаторых значных фрагментаў Пісання адносна таямніцы жыцця Хрыста.

Больш за тое, Сінод параіў распаўсюджванне сярод усіх вернікаў чытання малітвы *Анёл Панскі*. Гэта простая і глыбокая малітва, якая дазваляе нам «штодзённа

---

[297] Пар. *тамсама.*

[298] «*Plenaria indulgentia* conceditur christifi deli qui Sacram Scripturam, iuxta textum a competenti auctoritate adprobatum, cum veneratione divino eloquio debita et ad modum lectionis spiritalis, per dimidiam saltem horam legerit; si per minus tempus id egerit *indulgentia* erit partialis»: PAENITENTIARIA APOSTOLICA, *Enchiridion Indulgentiarum. Normae et concessiones* (16 Iulii 1999), 30, § 1.

[299] Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1471-1479.

[300] PAULUS VI, Const. ap. *Indulgentiarum doctrina* (1 Ianuarii 1967): *AAS* 59 (1967), 18-19.

[301] Пар. *Epistula* 49, 3: *PL* 16, 1204 A.

[302] Пар. CONGREGATIO DE CULTU DIVINO ET DISCIPLINA SACRAMENTORUM, *Direttorio su pieta popolare e liturgia. Principi e orientamenti* (17 Decembris 2001), 197-202: *Ench. Vat.* 20, n. 2638-2643.

[303] Пар. *Propositio* 55.

[304] Пар. IOANNES PAULUS II, Ep. ap. *Rosarium Virginis Mariae* (6 Octobris 2002): *AAS* 95 (2003), 5-36.

успамінаць Уцелаўлёнае Слова»[305]. Было б добра, каб Божы народ, сем'і і супольнасці кансэкраваных асоб былі вернымі гэтай Марыйнай малітве, адмаўляць якую на світанні, апоўдні і на захадзе сонца заахвочвае нас традыцыя. У малітве *Анёл Панскі* просім Бога, каб праз заступніцтва Марыі нам таксама было дадзена выканаць, так як Яна, Божую волю і прыняць у сваё нутро Яго Слова. Гэтая практыка можа нам дапамагчы ва ўмацаванні сапраўднай любові да таямніцы ўцелаўлення.

Заслугоўваюць прызнання, ацэнкі і пашырэння таксама некаторыя старажытныя малітвы хрысціянскага Усходу, якія ў аднясенні да *Theotokos*, да Маці Божай, ахопліваюць усю гісторыю збаўлення. Маем на ўвазе асабліва *Акатыст*, а таксама *Параклезу.* Гэта пахвальныя гімны, якія спяваюцца ў форме літаніі. Прасякнутыя верай Касцёла і поўныя біблійных аднясенняў, яны дапамагаюць вернікам разважаць разам з Марыяй таямніцы Хрыста. Асабліва цудоўны гімн у гонар Маці Божай, званы *Акатыст,* што азначае - спеў стоячы, з'яўляецца адной з самых узнёслых формаў выяўлення Марыйнай пабожнасці ў бізантыйскай традыцыі[306]. Малітва гэтымі словамі шырока адкрывае душу і рыхтуе да прыняцця спакою, што паходзіць звыш, ад Бога, таго спакою, якім ёсць сам Хрыстус, народжаны з Марыі дзеля нашага збаўлення.

*Божае слова і Святая Зямля*

89. Калі разважаем над Божым Словам, якое сталася целам ва ўлонні Марыі з Назарэта, нашае сэрца скіроўваецца да той зямлі, на якой споўнілася таямніца нашага адкуплення і з якой Божае слова распаўсюдзілася аж да межаў зямлі. Праз Духа Святога Слова ўцелавілася ў канкрэтны момант і ў пэўным месцы, на акрайку зямлі, што знаходзілася на ўскраіне рымскай імперыі. Таму чым больш заўважаем паўсюднасць і выключнасць асобы Хрыста, з тым большай удзячнасцю глядзім на тую зямлю, на якой нарадзіўся, жыў і ахвяраваў сябе за нас усіх Езус. Камяні, па якіх ступаў наш Адкупіцель, поўныя ўспаміну, і надалей «уголас кажуць» нам пра Добрую Навіну. Таму Айцы Сіноду трапна нагадалі азначэнне Святой Зямлі як «пятага Евангелля»[307]. Як жа важна, каб у гэтых месцах існавала хрысціянская супольнасць, нягледзячы на столькі цяжкасцяў! Сінод Біскупаў запэўніў, што ён - з усімі хрысціянамі, якія жывуць на зямлі Езуса, даючы сведчанне веры ва Уваскрослага. Хрысціяне, якія жывуць у гэтым месцы павінны быць «для паўсюднага Касцёла не толькі святлом веры, але таксама рошчынай згоды, мудрасці і раўнавагі ў жыцці грамадства, якое традыцыйна было і надалей застаецца плюралістычным, шматнацыянальным і шматрэлігійным»[308].

---

[305] *Propositio* 55.

[306] Пар. CONGREGATIO DE CULTU DIVINO ET DISCIPLINA SACRAMENTORUM, *Direttorio su pieta popolare e liturgia. Principi e orientamenti* (17 Decembris 2001), 207: *Ench. Vat.* 20, n. 2656-2657.

[307] Пар. *Propositio* 51.

[308] BENEDICTUS XVI, *Homilia in eucharistica celebratione apud Vallem Iosaphat, Hierosolymae* (12 Maii 2009): *AAS* 101 (2009), 473.

Святая Зямля таксама сёння ёсць мэтаю пілігрымак хрысціянскага народу, якія з’яўляюцца актам малітвы і пакуты, пра што сведчылі аўтары ўжо ў старажытнасці, як напрыклад св. Геранім[309]. Чым больш мы скіроўваем позірк і сэрца да зямнога Ерузалема, тым больш разгараецца ў нас жаданне нябеснага Ерузалема, праўдзівай мэты ўсялякага пілігрымавання, а таксама шчыры клопат аб тым, каб імя Езус, у якім як адзіным ёсць надзея, было прызнана ўсімі (пар. *Дз* 4, 12).

## Частка трэцяя

## *VERBUM MUNDO*

*«Бога ніхто ніколі не бачыў.*
*Адзінародны Бог, які ва ўлонні Айца, Ён адкрыў» (Ян* 1, 18*)*

## МІСІЯ КАСЦЁЛА:
## АБВЯШЧЭННЕ БОЖАГА СЛОВА СВЕТУ

### *Слова ад Айца і да Айца*

90. Св. Ян выразна падкрэслівае галоўны парадокс хрысціянскай веры: з аднаго боку кажа, што «Бога ніхто ніколі не бачыў» (*Ян* 1, 18; пар. *1 Ян* 4, 12). Ніякім чынам нашае ўяўленне, паняцці або словы не могуць апісаць або змераць бясконцую рэчаіснасць Найвышэйшага. Ён застаецца *Deus semper maior*. З другога боку сцвярджае, што Слова сапраўды «сталася целам» (*Ян* 1, 14). Адзінародны Сын, углядаючыся ў Айца, аб’явіў Бога, якога «ніхто ніколі не бачыў» (*Ян* 1, 18). Езус Хрыстус прыходзіць да нас, «поўны ласкі і праўды» (*Ян* 1, 14), якія праз Яго дадзены нам (пар. *Ян* 1, 17); бо «бо з паўнаты Ягонай мы ўсе прынялі ласку замест ласкі» (*Ян* 1, 16). Такім чынам евангеліст Ян у Пралогу глядзіць на Слова, якое спачатку ёсць у Бога, потым становіцца целам, а затым вяртаецца да Айца, несучы з сабою нашую чалавечнасць, якую прыняў назаўсёды. Як той, хто выходзіць ад Айца і да Яго вяртаецца (пар. *Ян* 13, 3; 16, 28; 17, 8. 10), вучыць нас пра Бога (пар. *Ян* 1, 18). Сын, як сцвярджае св. Ірынэй з Ліёна, «ёсць тым, хто аб’яўляе Айца»[310]. Можна сказаць, што Езус з Назарэта ёсць «экзэгетам» Бога, якога «ніхто ніколі не бачыў». «Ён з’яўляецца вобразам нябачнага Бога» (*Клс* 1, 15). Тут спаўняецца прароцтва Ісаі аб плённасці слова Пана: як дождж і снег падае з неба, каб напаіць зямлю і даць ураджай, так Божае слова, «якое выходзіць з вуснаў Маіх, не вернецца да Мяне без плёну, пакуль не споўніць тое, што Я хацеў, і з поспехам не дасягне таго, дзеля чаго Я паслаў яго» (*Іс* 55, 10-11). Езус Хрыстус – тое канчатковае і плённае Слова, якое выйшла ад Айца і вярнулася да Яго, дасканала выконваючы ў свеце Яго волю.

---

[309] Пар. *Epistula* 108,14: *CSEL* 55, p. 324-325.
[310] *Adversus haereses*, IV, 20, 7: *SC* 100, 646.

*Абвяшчаць свету «Logos» надзеі*

91. Божае слова перадало нам Божае жыццё, якое перамяняе аблічча зямлі і чыніць усё новым (пар. *Ап* 21, 5). Яго слова робіць нас не толькі *адрасатамі* Божага Аб'яўлення, але таксама яго *вестунамі*. Гэта Ён, пасланы Айцом споўніць Яго волю (пар. *Ян* 5, 36-38; 6, 38-40; 7, 16-18), прыцягвае нас да сябе і ўключае ў саё жыццё і місію. Такім чынам Дух Уваскрослага робіць здольным нашае жыццё да плённага абвяшчэння Слова па ўсім свеце. Гэта досвед першай хрысціянскай супольнасці, якая пашырала Слова праз прапаведаванне і сведчанне (пар. *Дз* 6, 7). Я хацеў бы тут прыгадаць асабліва жыццё апостала Паўла, чалавека, якога цалкам здабыў Пан (пар. *Флп* 3, 12) – «ужо не я жыву, а жыве ўва мне Хрыстус» (*Гал* 2, 20), – і яго місію: «гора мне, калі я не абвяшчаю Евангелля» (*1 Кар* 9, 16). Ён разумеў, што аб'яўленае ў Хрысце сапраўды ёсць збаўленнем усіх народаў, вызваленнем з нявол граху, каб здабыць свабоду дзяцей Божых.

Той, каго Касцёл абвяшчае свету, - гэта *Logos надзеі* (пар. *1 П* 3, 15); чалавек патрабуе «вялікай надзеі», каб жыць у сваёй сучаснасці, вялікай надзеі, якой ёсць «той Бог, які мае чалавечае аблічча і які палюбіў нас дарэшты»[311]. Таму Касцёл па сваёй сутнасці місійны. Мы не можам затрымліваць для сябе слоў вечнага жыцця, якія дае нам Езус Хрыстус, калі Яго сустракаем: яны – для ўсіх, для кожнага чалавека. Кожны чалавек у наш час, ці ведае пра гэта, ці не, патрабуе гэтага паслання. Няхай Пан, як у часы прарока Амоса, абудзіць у людзях новы голад і новае прагненне слоў Пана (пар. *Ам* 8, 11). Мы ж адказваем за пераказ таго, што самі дзякуючы ласцы атрымалі.

*З Божага слова нараджаецца місія Касцёла*

92. Сінод Біскупаў пацвердзіў, што неабходна ажывіць у Касцёле місійную свядомасць, прысутную у Божым народзе з самага яго пачатку. Для першых хрысціянаў місійнае прапаведаванне было неабходнасцю, што вынікала з самой натуры веры: Бог, у якога яны верылі, ёсць Богам усіх, адзіным і праўдзівым, які аб'явіўся ў гісторыі Ізраэля і канчаткова ў сваім Сыне, даючы гэтым адказ, які ўсе людзі ў глыбіні свайго сэрца чакаюць. Першыя хрысціянскія супольнасці чулі, што іх вера не з'яўляецца часткай спецыяльнага культурнага звычаю, іншага ў кожным народзе, але належыць да сферы праўды, якая датычыць у аднолькавай ступені ўсіх людзей.

Таксама ў гэтым выпадку св. Павел паказвае нам сваім жыццём сэнс хрысціянскай місіі і яе першапачатковую паўсюднасць. Падумаем пра расказаны ў *Дзеях Апосталаў* эпізод, які меў месца на атэнскім Арэапагу (пар. 17, 16-34). Апостал Народаў устанаўлівае дыялог з людзьмі розных культур, усведамляючы, што таямніца Бога, Невядомага-Вядомага, пра якога кожны чалавек мае нейкае – хоць невыразнае – паняцце, сапраўды аб'явілася ў гісторыі: «Тое, чаму вы, не ведаючы, пакланяецеся, я абвяшчаю вам» (*Дз* 17, 23). Навізна хрысціянскага

[311] BENEDICTUS XVI, Litt. enc. *Spe salvi* (30 Novembris 2007), 31.

паслання заключаецца ў тым, што можна казаць усім народам: «Ён аб’явіўся, Ён сам. І сёння шлях да Яго адкрыты. Навізна хрысціянскага паслання не заключаецца ў думцы, але ў факце: Бог аб’явіўся нам»[312].

*Слова і Божае Валадарства*

93. Такім чынам місія Касцёла нельга лічыць неабавязковай або дадатковай часткай эклезіяльнага жыцця. Трэба дазволіць Духу Святому фарміраваць нас па прыкладзе самога Хрыста як удзельнікаў Яго місіі: «Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас» (*Ян* 20, 21), каб мы перадавалі Слова ўсім жыццём. Менавіта гэтае Слова чыніць, што мы ідзём да братоў: гэтае Слова асвячае, ачышчае і вядзе да навяртання; мы толькі слугі.

Таму трэба штораз больш адкрываць неабходнасць і прыгажосць абвяшчэння Слова, каб магло запанаваць Божае Валадарства, аб якім навучаў сам Хрыстус. У гэтым сэнсе абнаўляем разуменне, такое блізкае Айцам Касцёла, што калі абвяшчаецца Слова, гаворыцца пра Божае Валадарства (пар. *Мк* 1, 14-15), якім – як пераканаўча нагадвае Арыген[313] – *ёсць сама асоба Езуса* (*Autobasileia*). Пан дае збаўленне ўсім людзям у кожную эпоху. Усе заўважаем, як важна, каб святло Хрыста асвячала кожнае асяроддзе чалавека: сям’ю, школу, культуру, працу, вольны час і іншыя сферы грамадскага жыцця[314]. Трэба абвяшчаць не нейкае слова суцяшэння, але слова, якое ўзрушвае, заклікае да навяртання, дае магчымасць сустрэцца з Богам, дзякуючы якому квітнее новае чалавецтва.

*Усе ахрышчаныя адказваюць за прапаведаванне*

94. Паколькі ўвесь Божы народ ёсць народам «пасланым», то так як пацвердзіў Сінод, «місія абвяшчэння Божага слова ёсць заданнем усіх вучняў Езуса Хрыста, якое вынікае з іхняга хросту»[315]. Ніхто з веруючых у Хрыста не можа адчуваць сябе звольненым ад гэтага абавязку, які вынікае з сакрамэнтальнай прыналежнасці да цела Хрыста. Гэтая свядомасць павінна прысутнічаць у кожнай сям’і, парафіі, супольнасці, таварыстве і касцёльным руху. Увесь Касцёл як таямніца еднасці ёсць місійны, і кожны, згодна са сваім жыццёвым станам, пакліканы да таго, каб зрабіць значны ўклад у абвяшчэнне хрысціянскага паслання.

*Біскупы*, а таксама *прэзбітэры*, згодна са сваёй місіяй, першымі пакліканы да таго, каб іх жыццё было цалкам аддадзена служэнню Слову, абвячшэнню Евангелля, цэлебрацыі сакрамэнтаў і такой фармацыі вернікаў, каб яны маглі аўтэнтычна

---

[312] BENEDICTUS XVI, *Allocutio Lutetiae Parisiorum ad viros culturae deditos apud Collegium a Bernardinis* (12 Septembris 2008): *AAS* 100 (2008), 730.

[313] Пар. *In Evangelium secundum Matthaeum* 17, 7: *PG* 13, 1197 B; S. HIERONYMUS, *Translatio homiliarum Origenis in Lucam*, 36: *PL* 26, 324-325.

[314] Пар. BENEDICTUS XVI, *Homilia dum inauguratur XII Coetus Generalis Ordinarius Synodi Episcoporum* (5 Octobris 2008): *AAS* 100 (2008), 757.

[315] *Propositio* 38.

пазнаваць Пісанні. Няхай таксама *дыяканы* адчуваюць сябе пакліканымі да супрацоўніцтва, згодна са сваёй місіяй, з гэтым заданнем евангелізацыі.

*Кансэкраванае жыццё* ва ўсёй гісторыі Касцёла выразна паказала, што можа выконваць заданне абвяшчэння Божага слова і займацца прапаведаваннем у *missio ad gentes,* а таксама ў самых цяжкіх сітуацыях дастасавацца да новых умоў евангелізацыі, адважна і смела ўваходзячы на новыя шляхі, і адказваць на новыя выклікі, каб плённа абвяшчаць Божае слова[316].

*Свецкія* пакліканы выконваць сваё прароцкае заданне, якое вынікае непасрэдна з хросту, і сведчыць аб Евангеллі ў штодзённым жыцці, усюды дзе прысутнічаюць. У сувязі з гэтым Айцы Сіноду выказалі «самую глыбокую павагу і ўдзячнасць, а таксама заахвоцілі да евангельскай паслугі, якую многія свецкія, а асабліва жанчыны выконваюць велікадушна і з удзелам у супольнасцях, рассеяных па ўсім свеце, па прыкладзе Марыі з Магдаліі, першага сведкі пасхальнай радасці»[317]. Больш за тое, Сінод прызнае з удзячнасцю, што касцёльныя рухі, а таксама новыя супольнасці з'яўляюцца ў Касцёле вялікай дапамогай у справе евангелізацыі ў наш час і абуджаюць Касцёл шукаць новыя формы абвяшчэння Евангелля[318].

*Неабходнасць «missio ad gentes»*

95. Заклікаючы ўсіх вернікаў абвяшчаць Божае слова, Айцы Сіноду пацвердзілі, што таксама ў наш час неабходны рашучы удзел у *missio ad gentes*. У любым выпадку Касцёл не можа абмежавацца пастырствам «падтрымання», прызначаным для тых, хто ўжо ведае Евангелле Хрыста. Місійны запал – гэта выразны знак сталасці эклезіяльнай супольнасці. Айцы таксама моцна падкрэслілі, што Божае слова – гэта збаўчая праўда, якой патрабуе кожны чалавек ва ўсе часы. Таму пасланне павінна быць выразным. Касцёл павінен ісці да ўсіх у моцы Духа (пар. *1 Кар* 2, 5) і як прарок далей бараніць правы і свабоды чалавека ў слуханні Божага слова, шукаючы найбольш плённых сродкаў, каб яго абвяшчаць, нават нягледзячы на пераслед[319]. Касцёл адчувае абавязак абвяшчаць усім Слова, якое збаўляе (пар. *Рым* 1, 14).

*Прапаведаванне і новая евангелізацыя*

96. Папа Ян Павел II, звяртаючыся да таго, што сказаў ужо папа Павел VI у апостальскай адгартацыі *Evangelii nuntiandi*, розным чынам нагадваў, што неабходна новая місійная эпоха, якая б актывізавала ўвесь Божы народ[320]. На парозе трэцяга тысячагоддзя не толькі існуюць многія народы, якія яшчэ не пазналі Добрай Навіны, але шмат хрысціянаў патрабуе, каб нанова абвяшчалася ім з перакананнем Божае

---

[316] Пар. CONGREGATIO PRO INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE ET SOCIETATIBUS VITAE APOSTOLICAE, Instr. *Contemplando il volto* (19 Maii 2002), 36: *Ench. Vat*. 21, n. 488-491.

[317] *Propositio* 30.

[318] Пар. *Propositio* 38.

[319] Пар. *Propositio* 49.

[320] Пар. IOANNES PAULUS II, Litt. enc. *Redemptoris missio* (7 Decembris 1990): *AAS* 83 (1991), 294-340; ён жа, Litt. ap. *Novo millennio ineunte* (6 Ianuarii 2001), 40: *AAS* 93 (2001), 294-295.

слова, каб яны маглі канкрэтна адчуць моц Евангелля. Столькі ёсць братоў «ахрышчаных, але недастаткова евангелізаваных»[321]. Часта багатыя калісьці вераю і на пакліканні краіны губляюць сваю тоеснасць пад уплывам секулярызаванай культуры[322]. Пра патрэбу новай евангелізацыі, якую вельмі адчуваў мой паважаны папярэднік, пра плённасць Божага слова трэба гаварыць на нова без старху, з перакананнем. Касцёл, упэўнены ў вернасці свайго Пана, нястомна абвяшчае добрую навіну Евангелля і заахвочвае ўсіх хрысціянаў да паўторнага адкрыцця таго, якім захапляльным ёсць наследаванне Хрыста.

*Божае слова і хрысціянскае сведчанне*

97. З увагі на бязмежныя гарызонты місіі Касцёла і складаны характар дадзенай сітуацыі патрэбны новыя формы плённага пераказу Божага слова. Дух Святы, першы аўтар евангелізацыі, заўсёды будзе кіраваць дзейнасцю Хрыстовага Касцёла. Важным, аднак, з'яўляецца тое, каб у кожнай форме прапаведавання памяталася найперш пра ўнутраную сувязь паміж *пераказам Слова і хрысціянскім сведчаннем.* Ад гэтага залежыць верагоднасць таго, што абвяшчаецца. З аднаго боку, неабходна слова, якое перадае тое, што сам Пан нам сказаў. З другога боку, трэба надаць гэтаму слову верагоднасць, каб не было яно прыгожай філасофіяй або утопіяй, але рэчаіснасцю, якую можна жыць і дзякуючы якой можна жыць. Гэтая ўзаемная залежнасць слова і сведчання ўказвае на спосаб, якім Бог прамовіў праз уцелаўленне свайго Сына. Божае слова даходзіць да людзей «праз сустрэчу са сведкамі, дзякуючы якім становіцца прысутным і жывым»[323]. Кожнаму чалавеку, асабліва новым пакаленням, патрэбна ўвядзенне ў Божае слова «дзякуючы сустрэчы з дарослым і яго праўдзіваму сведчанню, станоўчаму ўплыву сяброў і спадарожнічанню вялікай касцёльнай супольнасці»[324].

Існуе цесная сувязь паміж сведчаннем Пісання як запісам таго, што Божае Слова кажа пра сябе, і сведчаннем жыцця вернікаў. Адно патрабуе другога і да яго вядзе. Хрысціянскае сведчанне перадае Слова, пра якое кажуць Пісанні. Пісанні ў сваю чаргу тлумачаць сведчанне, якое, дадзенае ўласным жыццём, з'яўляецца пакліканнем хрысціянаў. Такім чынам тыя, хто сустракае верагодных сведкаў Евангелля, пераконваюцца ў плённасці Божага слова ў тых, хто яго прымае.

98. Гэтая ўзаемная залежнасць сведчання і Слова дазваляе зразумець тое, што папа Павел VI кажа ў апостальскай адгартацыі *Evangelii nuntiandi*. Нашая адказнасць не абмяжоўваецца ў прапанаванні свету агульных каштоўнасцяў, трэба выразна абвяшчаць Божае слова. Толькі тады будзем верныя наказу Хрыста: «Добрая Навіна, абвешчаная сведчаннем жыцця, павінна быць раней ці пазней абвешчана таксама

[321] *Propositio* 38.
[322] Пар. BENEDICTUS XVI, *Homilia dum inauguratur XII Coetus Generalis Ordinarius Synodi Episcoporum* (5 Octobris 2008): *AAS* 100 (2008), 753-757.
[323] *Propositio* 38.
[324] *Nuntius conclusivus*, IV, 12.

словам жыцця. Няма праўдзівай евангелізацыі без абвяшчэння імя і вучэння, жыцця і абяцанняў, Валадарства і таямніцы Езуса Назараніна, Сына Божага»[325].

Перакананне, што абвяшчэнне Божага слова патрабуе сведчання ўласнага жыцця, вельмі выразнае ў хрысціянскай свядомасці з самага пачатку. Сам Хрыстус ёсць сведкам верным і праўдзівым (пар. *Ап* 1, 5; 3, 14), сведкам Праўды (пар. *Ян* 18, 37). У сувязі з гэтым хацеў бы нагадаць многія сведчанні, якія мы мелі магчымасць пачуць падчас сінадальнага Сходу. Глыбока ўзрушылі нас апавяданні асоб, якія змаглі жыць верай і даваць выразнае сведчанне Евангелля таксама ў варожых хрысціянству рэжымах або сярод праследу.

Усё гэта не павінна абуджаць у нас страх. Езус сказаў сваім вучням: «Слуга не большы за свайго гаспадара. Калі Мяне праследавалі, то і вас будуць праследаваць» (*Ян* 15, 20). Таму разам з усім Касцёлам хачу ўзнесці да Бога гімн падзякі за сведчанне такой вялікай колькасці братоў і сясцёр, якія таксама ў наш час аддалі жыццё, каб перадаць праўду пра Божую любоў, аб’яўленую нам ва ўкрыжаваным і ўваскрослым Хрысце. Больш за тое выказваю ўдзячнасць усяго Касцёла за хрысціянаў, якія не падаюць духам перад абліччам перашкод і праследу з прычыны Евангелля. Адначасова з глыбокай і салідарнай любоўю думаем пра ўсіх вернікаў з супольнасцяў, якія асабліва ў Азіі і Афрыцы ў гэты наш час рызыкуюць жыццём або адкінуты грамадствам з-за сваёй веры. Бачым тут ажыццяўленне духа евангельскіх благаслаўленняў, якія кажуць пра церпячых праслед з прычыны Пана Езуса (пар. *Мц* 5, 11). Адначасова не перастаём заклікаць урады дзяржаў, каб яны гарантавалі ўсім свабоду сумлення і рэлігіі, а таксама магчымасць публічна сведчыць аб сваёй веры[326].

## БОЖАЕ СЛОВА І ЎДЗЕЛ У СВЕЦЕ

*Служыць Езусу ў Яго «братах меншых» (Мц* 25, 40*)*

99. Божае слова кідае святло на чалавечую экзістэнцыю і мабілізуе сумленне да больш глыбокага роздуму над уласным жыццём, бо ўся гісторыя чалавецтва падлягае Божаму суду: «Калі прыйдзе Сын Чалавечы ў славе сваёй і ўсе анёлы з Ім, тады сядзе на троне славы сваёй. І сабраныя будуць перад Ім усе народы» (*Мц* 25, 31-32). У наш час мы часта павярхоўна ацэньваем каштоўнасць сённяшняй часовай хвіліны, як бы яна была мала значнай для будучыні. Евангелле ж нагадвае нам, што ўсе павінны даць рахунак са свайго жыцця. У 25 раздзеле Евангелля паводле Мацвея Сын Чалавечы кажа, што гэта Яму зрабілі або не тое, што зрабілі або чаго не зрабілі аднаму з Яго меншых братоў (пар. 25, 40. 45): «Бо Я быў галодны, і вы далі Мне есці; прагнуў, і вы напаілі Мяне; быў падарожным, і вы прынялі Мяне; быў голы, і вы апранулі Мяне; быў хворы, і вы адведалі Мяне; быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне» (25, 35-36). Таму само Божае слова нагадвае пра неабходнасць нашага ўдзелу

[325] PAULUS VI, Adhort. ap. *Evangelii nuntiandi* (8 Decembris 1975): *AAS* 68 (1976), 22.
[326] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Decl. de libertate religiosa *Dignitatis humanae*, 2. 7.

ў свеце і пра нашую адказнасць адносна Хрыста, Пана гісторыі. Абвяшчаючы Евангелле, заахвочваем узаемна сябе да чынення дабра і дзейнасці на карысць справядлівасці, паяднання і спакою.

*Божае слова і ўдзел у грамадстве на карысць справядлівасці*

100. Божае слова схіляе чалавека кіравацца ў адносінах праведнасцю і справядлівасцю, сведчыць пра вялікую каштоўнасць у вачах Бога усіх чалавечых намаганняў дзеля таго, каб учыніць свет больш справядлівым і больш прыдатным для жылля[327]. Божае слова выяўляе без двузначнасці несправядлівасць, а таксама прапагандуе салідарнасць і роўнасць[328]. Так у святле слоў Пана мы распазнаём «знакі часу», прысутныя ў гісторыі, не ўкрываемся ад удзелу на карысць церпячых і ахвяр эгаізму. Сінод нагадаў, што ўдзел на карысць справядлівасці і перамены свету з'яўляецца галоўным для евангелізацыі. Як казаў папа Павел VI, маецца на ўвазе тое, каб «моцаю Евангелля дасягаць і як бы перамяняць крытэрыі ацэнкі, іерархію дабротаў, паставы і навыкі мыслення, імпульсы паводзінаў і жыццёвыя мадэлі чалавечага роду, якія знаходзяцца ў супярэчнасці з Божым словам і планам збаўлення»[329].

Таму Айцы Сіноду прысвяцілі асаблівую ўвагу тым, хто ўдзельнічае ў палітычным і грамадскім жыцці. Евангелізацыя і пашырэнне Божага слова павінны натхняць іх дзейнасць у свеце, якая скіравана да праўдзівага дабра ўсіх, з шанаваннем і абвяшчэннем годнасці кожнай асобы. Зразумела, не з'яўляецца непасрэдным заданнем Касцёла будаванне больш справядлівага грамадства, хоць ён мае права і абавязак мець голас у этычных і маральных пытаннях, якія датычаць дабра асоб і народаў. Непасрэдны ўдзел у грамадскай і палітычнай дзейнасці – гэта перадусім заданне свецкіх вернікаў, выхаваных у школе Евангелля. Таму Сінод рэкамендуе адпаведную адукацыю ў сферы прынцыпаў сацыяльнага вучэння Касцёла[330].

101. Больш за тое, хацеў бы звярнуць увагу ўсіх на значэнне абароны і абвяшчэння *чалавечых правоў кожнай асобы*, якія самі па сабе «паўсюдныя, непарушныя і неад'емныя»[331]. Касцёл заўважае, што наш час стварае надзвычайную магчымасць, каб дзякуючы абвяшчэнню гэтых правоў годнасць чалавека больш плённа пазнавалася і паўсюдна прапагандавалася як рыса, якой Бог адзначыў сваё стварэнне[332], а Езус Хрыстус прыняў і адкупіў праз сваё ўцелаўленне, смерць і

---

[327] Пар. *Propositio* 39.
[328] Пар. BENEDICTUS XVI, *Nuntius de Die mundiali Pacis 2009* (8 Decembris 2008): *Insegnamenti* IV, 2 (2008), 792-802.
[329] Adhort. ap. *Evangelii nuntiandi* (8 Decembris 1975), 19: *AAS* 68 (1976), 18.
[330] Пар. *Propositio* 39.
[331] IOANNNES XXIII, Litt. enc. *Pacem in terris* (11 Aprilis 1963), I: *AAS* 55 (1963), 259.
[332] Пар. IOANNNES PAULUS II, Litt. enc. *Centesimus annus* (1 Maii 1991), 47: *AAS* 83 (1991), 851-852; ён жа, *Allocutio ad Nationum Unitarum Legatos* (2 Octobris 1979), 13: *AAS* 71 (1979), 1152-1153.

ўваскрасенне. Таму пашырэнне Божага слова служыць умацаванню прызнання і шанавання чалавечых правоў кожнай асобы[333].

*Абвяшчэнне Божага слова, паяднанне і спакой паміж народамі*

102. Сярод многіх сфер удзелу Сінод горача рэкамендуе пашырэнне паяднання і спакою. У сённяшняй сітуацыі больш чым калі-небудзь трэба нанова адкрыць Божае слова як крыніцу паяднання і спакою, бо ў ім Бог яднае з сабою ўсё (пар. *2 Кар* 5, 18-20; *Эф* 1, 10): Хрытус «мір наш» (*Эф* 2, 14), тым, хто разбурае муры падзелу. Падчас Сіноду шмат сведчанняў было пра сур'ёзныя і крывавыя канфлікты, а таксама напружанні, якія існуюць на нашай планеце. Часам здаецца, што гэтыя змаганні маюць характар міжрэлігійных канфліктаў. Яшчэ раз хачу паўтарыць, што рэлігія ніколі не можа апраўдаць нецярпімасці або войнаў. Нельга забіваць у імя Бога![334] Усе рэлігіі павінны схіляць да адпаведнага выкарыстання розуму і прапагандаваць этычныя каштоўнасці, якія фарміруюць грамадскае суіснаванне.

Верныя справе паяднання, здзейсненай Богам у Езусе Хрысце, укрыжаваным і уваскрослым, каталікі і ўсе людзі добрай волі павінны старацца даваць прыклад паяднання, каб будаваць грамадства справядлівасці і спакою[335]. Ніколі не забываем, што «там, дзе чалавечыя словы губляюць моц, бо пераважае драматычнае насілле і зброя, не слабне прарочая моц Божага слова, якое паўтарае нам, што спакой магчымы, і што мы павінны быць прыладамі паяднання і спакою»[336].

*Божае слова і дзейсная любоў*

103. Удзел на карысць справядлівасці, паяднання і спакою мае канчаткова сваю крыніцу і сваё спаўненне ў любові, аб'яўленай нам у Хрысце. Услухоўваючыся ў сведчанні, прадстаўленыя на Сінодзе, мы лепш зразумелі сувязь паміж поўным любові слуханнем Божага слова і бескарыслівым служэннем братам; каб усе вернікі зразумелі, што неабходным з'яўляецца «перанясенне пачутага слова на ўчынкі любові, бо толькі такім чынам абвяшчэнне Евангелля, акрамя тыповых для чалавека недасканаласцяў, становіцца верагодным»[337]. Езус прайшоў праз гэты свет, чынячы добра (пар. *Дз* 10, 38). Слуханне з адкрытасцю Божага слова ў Касцёле абуджае «любоў і справядлівасць адносна ўсіх, асабліва адносна ўбогіх»[338]. Нельга забываць, што «любоў – caritas – заўсёды будзе неабходнай, нават у самым справядлівым грамадстве. <...> Хто спрабуе вызваліцца ад любові, будзе гатовы вызваліцца і ад

[333] Пар. *Compendio della dottrina sociale della Chiesa*, 152-159.

[334] Пар. BENEDICTUS XVI, *Nuntius de XL Die mundiali Pacis 2007* (8 Decembris 2006), 10: *Insegnamenti* IV, 2 (2006), 780.

[335] Пар. *Propositio* 8.

[336] BENEDICTUS XVI, *Homilia* (25 Ianuarii 2009): *Insegnamenti* V, 1 (2009), 141.

[337] *Ён жа*, *Homilia in conclusione XII Coetus Generalis Ordinarii Synodi Episcoporum* (26 Octobris 2008): *AAS* 100 (2008), 779.

[338] *Propositio* 11.

самога чалавека»[339]. Таму заахвочваю ўсіх вернікаў да частага разважання над гімнам любові, напісаным апосталам Паўлам, і да таго, каб чэрпаць з яго натхненне: «Любоў доўгацярплівая, любоў ласкавая, не зайздросціць, любоў не пыхлівая, не ганарыцца, не бессаромная, не шукае свайго, не гневаецца, не памятае зла, не радуецца несправядлівасці, але радуецца разам з праўдай. Усё зносіць, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё церпіць. Любоў ніколі не мінае» (*1 Кар* 13, 4-8).

Такім чынам любоў бліжняга, укаранёная ў любові Бога, патрабуе ад нас нястомнага ўдзелу, кожнага індывідуальна і як эклезіяльнай супольнасці, мясцовай і паўсюднай.

Св. Аўгустын кажа, што прынцыповай рэччу з’яўляецца тое, «каб мы разумелі, што мэтаю і паўнатою Закону, як і ўсіх Святых Кніг, ёсць любоў. <...> Калі ж каму здаецца, што зразумеў Святое Пісанне або яго частку, але не развівае гэтай падвойнай любові Бога і бліжняга, той яшчэ нічога не зразумеў»[340].

*Абвяшчэнне Божага слова і моладзь*

104. Сінод прысвяціў асаблівую ўвагу абвяшчэнню Божага слова новым пакаленням. Маладыя людзі ўжо сёння з’яўляюцца актыўнымі членамі Касцёла і яго будучыняй. Мы часта бачым у іх спантаннае адкрыццё на слуханне Божага слова, а таксама *шчырае жаданне пазнаць Езуса.* У маладосці з’яўляецца неадхільнае і шчырае *пытанне* наконт сэнсу ўласнага жыцця і таго, які кірунак надаць сваёй экзістэнцыі. На гэтыя пытанні толькі Бог можа даць праўдзівы адказ. Гэтая ўражлівасць маладых на свет патрабуе адвагі яснага абвяшчэння; мы павінны дапамагчы маладым людзям у пазнаванні Святога Пісання і ў блізкім кантакце з ім, каб яно было быццам компас, які паказвае дарогу, якой трэба ісці[341]. Таму яны патрабуюць сведак і настаўнікаў, якія будуць ісці разам з імі і весці іх да любові, а таксама да таго, каб яны перадавалі Евангелле, асабліва сваім аднагодкам, становячыся такім чынам праўдзівымі і верагоднымі вестунамі Слова[342].

Трэба, каб Божае слова перадавалася таксама з думкаю пра пакліканні, каб дапамагчы маладым людзям і накіраваць іх у прыняцці жыццёвых рашэнняў, каб яны былі гатовыя на поўнае пасвячэнне[343]. Праўдзіваму пакліканню да кансэкраванага жыцця і да святарства спрыяе верны кантакт з Божым словам. Яшчэ раз сёння паўтараю заклік, з якім я звярнуўся на пачатку майго Пантыфікату, каб акрыць насцеж дзверы Хрысту: «Хто дазваляе ўвайсці Хрысту, нічога не губляе, нічога – абсалютна нічога з тых рэчаў, дзякуючы якім жыццё ёсць свабодным, прыгожым і вялікім. Не! – толькі дзякуючы гэтаму сяброўству вызваляецца сапраўды вялікі патэнцыял чалавечнасці. <...> маладыя сябры, не бойцеся Хрыста!

---

[339] BENEDICTUS XVI, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 28.

[340] *De doctrina christiana*, I, 35, 39 – 36, 40: *PL*, 34, 34.

[341] Пар. BENEDICTUS XVI, *Nuntius occasione XXI Diei Internationalis Iuventuti dicati 2006* (22 Februarii 2006), *AAS* 98 (2006), 282-286.

[342] Пар. *Propositio* 34.

[343] Пар. *тамсама.*

Ён нічога не адбірае, але дае ўсё. Хто Яму аддаецца, атрымлівае у сто разоў больш. Так, адкрыйце, насцеж адкрыйце дзверы Хрысту – і знойдзеце сапраўднае жыццё»[344].

*Абвяшчэнне Божага слова і эмігранты*

105. Божае слова робіць нас чулымі на гісторыю і на тое, што ў ёй з'яўляецца новага. Таму ў сувязі з евангелізацыйнай місіяй Касцёла Сінод прысвяціў увагу таксама складанай з'яве эміграцыі, якая набывае ў гэтыя гады нечуваныя памеры. Паўстае тут далікатнае пытанне, якое датычыць *бяспекі* народаў і неабходнасці *прыняць* тых, хто шукае прыстанішча, лепшых умоў жыцця, здароўя і працы. Вялікая лічба асоб, якія не ведаюць Хрыста або якія маюць Яго скажоны вобраз, пасяляецца ў краінах з хрысціянскай традыцыяй. Адначасова асобы, якія належаць да народаў, з глыбокай хрысціянскай верай, эмігрыруе ў краіны, у якія трэба несці пасланне Хрыста. Гэтыя новыя сітуацыі ствараюць новыя магчымасці пашырэння Божага слова. У сувязі з гэтым Айцы Сіноду сцвердзілі, што эмігранты маюць права слухаць *керыгму*, якая ім прапануецца, але не навязваецца. Калі яны хрысціяне, то патрабуюць адпаведнай пастырскай апекі, каб умацаваць веру і самім стаць вестунамі евангельскага паслання. Усе дыяцэзіі, разумеючы складанасць з'явы, павінны мабілізаваць свае сілы, каб міграцыйны рух стаў таксама нагодай для адкрыцця новых формаў прысутнасці і абвяшчэння, а таксама каб адпаведна сваім магчымасцям паклапаціцца пра належнае прыняцце і натхненне гэтых нашых братоў, каб пачуўшы Добрую Навіну, яны самі сталі вестунамі Божага слова і сведкамі ўваскрослага Езуса, надзеі свету[345].

*Абвяшчэнне Божага слова і церпячыя*

106. Падчас сінадальнай працы Айцы звярнулі таксама ўвагу на патрэбы абвяшчэння Божага слова ўсім церпячым фізічна, псіхічна або духоўна. У моманты болю больш выразна забіраюць голас у сэрцы чалавека *канчатковыя пытанні наконт сэнсу ўласнага жыцця*. Калі слова чалавека здаецца змаўкае перад таямніцай зла і цярпення, а нашае грамадства прызнае каштоўнасць жыцця толькі тады, калі яно адпавядае пэўнаму ўзроўню плённасці і дабрабыту, Божае слова аб'яўляе нам, што таксама гэтыя акалічнасці таямнічым чынам «ахоплены» Божай чуласцю. Вера, якая нараджаецца з сустрэчы з Божым словам, дапамагае нам прызнаць, што чалавечае жыццё годнае таго, каб у поўні яго пражыць, таксама тады, калі яно аслаблена цярпеннем. Бог стварыў чалавека для шчасця і жыцця, але ў выніку граху з'явіліся на свеце хвароба і смерць (пар. *Мдр* 2, 23-24). Аднак Айцец жыцця ёсць лекарам чалавека ў поўным значэнні гэтага слова і няспынна схіляецца з любоўю над чалавецтвам, якое церпіць. Найвышэйшае праяўленне блізкасці Бога ў цярпенні

[344] *Homilia* (24 Aprilis 2005): AAS 97 (2005), 712.
[345] Пар. *Propositio* 38.

чалавека бачым у Езусе, які ёсць «Уцелаўлёным Словам. Ён цярпеў з намі і памёр. Праз сваю муку і смерць узяў на сябе і глыбока перамяніў нашую слабасць»[346].

*Езус няспынна прабывае з церпячымі;* Яго блізкасць трывае ў часе дзякуючы дзеянню Духа Святога ў місіі Касцёла, у слове і сакрамэнтах, у людзях добрай волі, у справах апекі, якую здзяйсняюць супольнасці з братняй любоўю, што паказвае сапраўднае аблічча Бога і Яго любові. Сінод дзякуе Богу за выразныя, а часта ўкрытыя сведчанні многіх хрысціянаў – святароў, кансэкраваных асоб і свецкіх, – якія аддавалі свае рукі, вочы, а таксама сэрца і надалей аддаюць Хрысту, сапраўднаму лекару цела і душы! Заахвочваю таксама, каб яны надалей апекаваліся хворымі асобамі і давалі ім адчуць – у Слове і Эўхарыстыі – жыватворную прысутнасць Пана Езуса. Ім трэба дапамагаць чытаць Святое Пісанне і адкрываць, што менавіта іх стан дазваляе ім асаблівым чынам удзельнічаць у адкупленчым цярпенні Хрыста за збаўленне свету (пар. *2 Кар* 4, 8-11. 14)[347].

*Абвяшчэнне Божага слова і ўбогія*

107. Святое Пісанне паказвае асаблівую любоў Бога да ўбогіх і тых, хто знаходзіцца ў патрэбе (пар. *Мц* 25, 31-46). Айцы Сіноду часта падкрэслівалі, што евангельскае пасланне, дзейнасць пастыраў і супольнасцяў павінна быць скіравана да гэтых нашых братоў. Сапраўды, «у першую чаргу маюць права на евангельскае пасланне менавіта ўбогія, якія патрабуюць не толькі хлеба, але таксама слова жыцця»[348]. Паслуга любові, якой ніколі не можа не хапіць у нашых Касцёлах, павінна быць заўсёды звязана з абвяшчэннем слова і цэлебрацыяй святых таямніц[349]. Адначасова трэба прызнаць і ацаніць факт, што таксама ўбогія бяруць удзел у евангелізацыі. У Бібліі сапраўднымі ўбогімі з'яўляюцца тыя, хто цалкам даручае сябе Богу, а сам Езус называе іх у Евангеллі *шчаслівымі*, «бо іх ёсць Валадарства Нябеснае» (*Мц* 5, 3; пар. *Лк* 6, 20). Пан усхваляе прастату сэрца чалавека, які прызнае Бога праўдзівым багаццем, на Яго спадзяецца, а не на даброты гэтага свету. Касцёл не можа ашукаць убогіх: «пастыры павінны іх слухаць, вучыцца ад іх, весці іх у веры і накіроўваць да таго, каб яны былі актыўнымі творцамі ўласнай гісторыі»[350].

Касцёл разумее, што існуе таксама *убоства,* якое з'яўляецца цнотай, якую трэба развіваць і выбіраць добраахвотна, як рабіла гэта вельмі шмат святых, і існуе *беднасць,* якая часта з'яўляецца вынікам несправядлівасці і выклікана эгаізмам, якая вядзе да нястачы і голаду, а таксама правакуе канфлікты. Касцёл, абвяшчаючы Божае слова, разумее, што трэба «старацца знайсці „карысную раўнавагу” паміж убоствам, „якое трэба выбраць”, і убоствам, „якое трэба перамагаць” », адкрываючы

[346] BENEDICTUS XVI, *Homilia habita occasione XVII Diei Mundialis aegroti* (11 Februarii 2009): *Insegnamenti* V, 1 (2009), 232.

[347] Пар. *Propositio* 35.

[348] *Propositio* 11.

[349] Пар. BENEDICTUS XVI, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 28: *AAS* 98 (2006), 236-237.

[350] *Propositio* 11.

«нанова ўстрыманасць і салідарнасць як евангельскія каштоўнасці і адначасова універсальныя. <...> Гэта азначае неабходнасць выбару справядлівасці і ўстрыманасці»[351].

*Божае слова і ахова стварэння*

108. Удзел у свеце, якога патрабуе Божае слова, прымушае нас па-новаму паглядзець на ўвесь створаны Богам сусвет, які мае ўжо ў сабе сляды Слова, праз якое ўсё сталася (пар. *Ян* 1, 2). Бо як веруючыя і тыя, хто абвяшчае Евангелле, мы ў пэўным сэнсе адказваем таксама за стварэнне. Аб'яўленне, адкрываючы перад намі Божы план адносна сусвету, схіляе нас таксама да асуджэння неадпаведных пастаў чалавека, калі ён не прызнае таго, што ўсе рэчы з'яўляюцца адлюстраваннем Стварыцеля, звычайнай матэрыяй, якой можна маніпуляваць без усялякага сораму. Так чалавек не мае ў сабе гэтай істотнай пакоры, якая дазваляе яму прызнаць, што стварэнне – гэта Божы дар, які трэба прыняць і карыстацца ім згодна з Яго намерам. Наадварот, нахабства чалавека, які жыве «як бы Бог не існаваў», вядзе да выкарыстання і знявечання прыроды, непрызнання ў ёй спраў стваральнага Слова. У гэтым тэалагічным кантэксце хацеў бы згадаць выказванне Айцоў Сіноду, якія нагадалі, што «прыняцце Божага слова, засведчанага ў Святым Пісанні, а таксама ў жывой Традыцыі Касцёла, вядзе да новага позірку на рэчы і прычыняецца да стварэння праўдзівай экалогіі, якая мае свае найглыбейшыя карані ў паслухмянасці веры, развіваючы новыя тэалагічныя погляды на дабро ўсіх рэчаў, створаных у Хрысце»[352]. Чалавека зноў трэба навучыць захапляцца і заўважаць сапраўдную прыгажосць, што аб'яўляецца ў створаных рэчах[353].

## БОЖАЕ СЛОВА І КУЛЬТУРЫ

*Каштоўнасць культуры для жыцця чалавека*

109. Тое, што Ян кажа пра ўцелаўленне Слова, паказвае непарыўную сувязь паміж *Божым словам* і *людскімі словамі*, праз якія яно аб'яўляецца нам. Разважаючы менавіта над гэтымі пытаннямі, Сінод Біскупаў затрымаўся над адносінамі паміж Божым словам і культурай. Бог не аб'яўляецца чалавеку абстракцыйна, але карыстаецца мовамі, вобразамі і выразамі, звязанымі з рознымі культурамі. Гэта плённыя адносіны, пра што сведчыць гісторыя Касцёла. Сёння гэтыя адносіны ўваходзяць у новую фазу дзякуючы распаўсюджванню і ўкараненню евангелізацыі ў сферы розных культур, а таксама дзякуючы сучаснаму развіццю заходняй культуры. Гэта вядзе перадусім да прызнання ролі культуры самой па сабе ў жыцці кожнага чалавека. Культура са сваімі разнастайнымі аспектамі з'яўляецца асноўным элементам чалавечага вопыту: «Чалавек існуе заўсёды паводле нейкай культуры,

[351] BENEDICTUS XVI, *Homilia* (1 Ianuarii 2009): *Insegnamenti* V, 1 (2009), 5.
[352] *Propositio* 54.
[353] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 92.

уласцівай сабе, якая ў сваю чаргу стварае паміж людзьмі адпаведную ім сувязь, вызначаючы міжчалавечы і грамадскі характар чалавечага існавання»[354].

Божае слова на працягу стагоддзяў натхняла розныя культуры, плёнам чаго былі галоўныя маральныя каштоўнасці, славутыя формы мастацтва і прыкладныя стылі жыцця[355]. Таму ў перспектыве новай сустрэчы Бібліі з культурамі, хацеў бы паўтарыць усім дзеячам культуры, што яны не павінны нічога баяцца, адкрываючыся на Божае слова, якое ніколі не знішчае сапраўднай культуры, але з'яўляецца няспынным імпульсам для пошуку ўсё больш адпаведных і больш значных чалавечых формаў выражэння. Кожная сапраўдная культура для таго, каб быць сапраўды для чалавека, павінна быць адкрытай на трансцэндэнцыю, канчаткова на Бога.

*Біблія, як вялікі культурны код*

110. Айцы Сіноду звярнулі ўвагу на тое, як важна даць магчымасць асобам, працуючым у сферы культуры, атрымаць належнае веданне Бібліі, таксама ў секулярызаваных асяродках і сярод няверуючых[356]; у Святым Пісанні змешчаны антрапалагічныя і філасофскія каштоўнасці, якія мелі станоўчы ўплыў на ўсё чалавецтва[357]. Трэба ў поўні адшукаць сэнс Бібліі як вялікага культурнага коду.

*Пазнаванне Бібліі ў школах і ва універсітэтах*

111. Асаблівым месцам спаткання Божага слова і культур ёсць *школа* і *універсітэт*. Пастыры павінны асабліва паклапаціцца пра тыя асяродкі, якія прапагандуюць глыбокае пазнанне Бібліі, каб таксама ў сённяшнім свеце яна мела плённы уплыў на культуру. Каталіцкія навуковыя асяродкі робяць арыгінальны ўклад – што павінна быць прызнана – у распаўсюджванне культуры і асветы. Нельга таксама занядбоўваць *рэлігійнага навучання*. Трэба старанна вучыць выкладчыкаў гэтага прадмету. У многіх выпадках для вучняў гэта адзіная магчымасць кантакту з пасланнем веры. Такое навучанне павінна спрыяць пазнаванню Святога Пісання, перамагаючы даўнія і новыя прадузятасці і стараючыся пераказаць яго праўду[358].

*Святое Пісанне ў розных формах мастацтва*

112. Сувязь паміж Божым словам і культурай знайшла сваё адлюстраванне ў працах з розных галін, асабліва ў святле мастацтва. Таму вялікая традыцыя Усходу і Захаду заўсёды цаніла мастацкія формы выражэння, натхнёныя Святым Пісанне, як напрыклад сакральнае выяўленчае мастацтва і архітэктура, літаратура і музыка. Маю на ўвазе таксама старажытную мову *ікон*, якая нарадзілася ва ўсходняй традыцыі і пашыраецца паступова ва ўсім свеце. Увесь Касцёл разам з Айцамі Сіноду выражае

---

[354] IOANNES PAULUS II, *Allocutio in UNESCO habita* (2 Iunii 1980), 6: *AAS* 72 (1980), 738.
[355] Пар. *Propositio* 41.
[356] Пар. *тамсама*.
[357] Пар. IOANNES PAULUS II, Litt. enc. *Fides et ratio* (14 Septembris 1998), 80.
[358] Пар. *Lineamenta,* 23.

прызнанне, павагу і захапленне мастакамі, «закаханымі ў прыгажосць», якія чэрпаюць натхненне са святых тэкстаў; яны зрабілі ўклад у аздабленне нашых касцёлаў, у цэлебраванне нашай веры, яны ўзбагацілі нашую літургію, і адначасова дзякуючы многім з іх у часе і прасторы нейкім чынам сталі адчувальнымі нябачныя і спрадвечныя рэчаіснасці[359]. Заахвочваю кампетэнтныя інстытуцыі прапагандаваць у Касцёле салідную фармацыю мастакоў ў галіне Святога Пісання ў святле жывой традыцыі Касцёла і Настаўніцкага Інстытута Касцёла.

*Божае слова і сродкі масавай камунікацыі*

113. З адносін паміж Божым словам і культурамі звязана важнае пытанне ўважлівага і разумнага карыстання даўнейшымі і новымі сродкамі масавай камунікацыі. Айцы Сіноду парэкамендавалі належна пазнаёміцца з гэтымі прыладамі і звярнуць увагу на іх хуткае развіццё, а таксама на розныя ўзроўні ўзаемнага уплыву і на прыкладванне большых намаганняў у здабыванні кампетэнцыі ў розных сферах, асабліва ў сферы гэтак званых *новых медыяў*, як напрыклад *інтэрнэт*. Касцёл ужо ў значнай ступені прысутны ў свеце масавай камунікацыі, і Настаўніцкі Інстытут Касцёла таксама выказваўся шматразова на гэтую тэму, пачынаючы ад Другога Ватыканскага Сабору[360]. Выкарыстанне новых метадаў ў пераказе евангельскага паслання звязана з евангелізацыйным запалам веруючых, а сёння камунікацыя ахоплівае сваёй сеткай зямны шар і заклік Хрыста набывае новае значэнне: «Што кажу вам у цемры, гаварыце пры святле, і што на вуха чуеце, прапаведуйце на дахах» (*Мц* 10, 27). Божае слова, акрамя таго, што выступае ў друкаванай форме, павінна гучаць таксама праз іншыя формы пераказу[361]. Таму разам з Айцамі Сіноду хачу падзякаваць католікам, якія кампетэнтна ўдзельнічаюць у свеце медыяў, стараючыся, каб іх прысутнасць была значная, і заахвочваю да яшчэ больш шырокай і прафесійнай дзейнасці[362].

Трэба прызнаць, што сёння сярод новых формаў масавай камунікацыі ўзрасла роля *інтэрнэту*, які з’яўляецца новым *форумам*, на якім павінна абвяшчацца Евангелле, пры захаванні, аднак, разумення таго, што віртуальны свет ніколі не зможа замяніць рэальны свет, а таксама што евангелізацыя можа карыстацца *віртуальнымі* шляхамі, якія адкрываюць *новыя медыі,* для ўстанаўлення важных

---

[359] Пар. *Propositio* 40.

[360] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Decr. de instrumentis communicationis socialis *Inter mirifica*; PONTIFICIUM CONSILIUM COMMUNICATIONUM SOCIALIUM, Instr. *past.* Communio et progressio, *de instrumentis communicationis socialis, foras edita de mandato Concilii Oecumenici Vaticani II* (23 Maii 1971): *AAS* 63 (1971), 593-656; IOANNES PAULUS II, Ep. ap. *Il rapido sviluppo* (24 Ianuarii 2005): *AAS* 97 (2005), 265-274; PONTIFICIUM CONSILIUM COMMUNICATIONUM SOCIALIUM, *Instr. past. de communicationibus socialibus* Aetatis novae, *XX exeunte anno post editam instructionem pastoralem quae est* Communio et progressio (22 Februarii 1992): *AAS* 84 (1992), 447-468; тамсама, *La Chiesa e internet* (22 Februarii 2002): *Ench. Vat.* 21, nn. 66-95; тамсама, *Etica in internet* (22 Februarii 2002): *Ench. Vat.* 21, nn. 96-127.

[361] Пар. *Nuntius conclusivus,* IV, 11; BENEDICTUS XVI, *Nuntius ad XLIII Diem mundialem communicationum socialium* (24 Ianuarii 2009): *Insegnamenti* V, 1 (2009), 123-127.

[362] Пар. *Propositio* 44.

адносін толькі з умовою, што гэта прывядзе да *асабістага кантакту*, які з’яўляецца незаменным. Таксама ў свеце *інтэрнэту,* дзякуючы якому на мільёнах маніторaў могуць з’явіцца мільярды вобразаў ва ўсім свеце, павінна быць бачным *абліччa Хрыста* і павінен чуцца Яго голас, «бо там, дзе няма месца для Хрыста, няма яго таксама і для чалавека»[363].

*Біблія і інкультурацыя*

114. Таямніца ўцелаўлення ўсведамляе нам, што з аднаго боку Бог аб’яўляецца заўсёды ў канкрэтнай гісторыі, карыстаючыся запісанымі ў ёй культурнымі кодамі, але, з другога боку, Божае слова можа і павінна пераказвацца ў розных культурах, каб перамяняць яе знутры, на шляху *евангелізацыі культур*[364], як акрэсліў папа Павел VI. Так выяўляецца глыбокі *міжкультурны* характар Божага слова, падобна, дарэчы, і хрысціянскай веры, здольных да сустрэчы розных культур[365]. У гэтым кантэксце можна зразумець таксама каштоўнасць *інкультурацыі* Евангелля[366]. Касцёл глыбока перакананы, што Божае слова здольнае дайсці да ўсіх людзей у культурным кантэксце, у якім яны жывуць: «гэтае перакананне вынікае з самой Бібліі, якая, пачынаючы ад кнігі Быцця, набывае універсальную арыентацыю (пар. *Быц* 1, 27-28), падтрымлівае яе затым у благаслаўленні, абяцаным усім людзям дзякуючы Абрагаму і яго патомству (пар. *Быц* 12, 3; 18, 18), і канчаткова пацвярджае, ахопліваючы евангелізацыяй „усе народы”»[367]. Таму інкультурацыю не трэба блытаць з павярхоўным прыстасаваннем і з сінкрэтычным замяшаннем, якое размывае арыгінальны характар Евангелля, каб учыніць яго больш лёгкім для прыняцця[368]. Сапраўдным узорам інкультурацыі ёсць само ўцелаўленне Слова: «“Актуалізацыя” або “інкультурацыя”, <...> будзе сапраўдным адлюстраваннем уцелаўлення Слова, асабліва калі культура, перамененая і адроджаная Евангеллем, дасць уласнай жывой традыцыі арыгінальны выраз хрысціянскага жыцця, хрысціянскіх абрадаў і хрысціянскай думкі»[369], дзейнічаючы як бы рошчына ва ўлонні мясцовай культуры, ацэньваючы *semina Verbi* і тое, што ёсць у ёй станоўчым, а таксама, адкрываючы яе на евангельскія каштоўнасці[370].

---

[363] IOANNES PAULUS II, *Nuntius ad XXXVI Diem mundialem communicationum socialium* (24 Ianuarii 2002), 6: *Insegnamenti*, XXV, 1 (2002), 94-95.

[364] Пар. Adhort. ap. *Evangelii nuntiandi* (8 Decembris 1975), 20: *AAS* 68 (1976), 18-19.

[365] Пар. BENEDICTUS XVI, Adhort. ap. postsynodalis *Sacramentum caritatis* (22 Februarii 2007), 78: *AAS* 99 (2007), 165.

[366] Пар. *Propositio* 48.

[367] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L’interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), IV, B: *Ench. Vat.*, 13, n. 3112.

[368] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Decr. de activitate missionali Ecclesiae *Ad gentes*, 22; PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L’interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), IV, B: *Ench. Vat.*, 13, nn. 3111-3117.

[369] IOANNES PAULUS II, *Allocutio ad Episcopos Keniae* (7 Maii 1980), 6: *AAS* 72 (1980), 497.

[370] Пар. *Instrumentum laboris,* 56.

*Пераклад і распаўсюджванне Біблії*

115. Калі інкультурацыя Божага слова з'яўляецца неад'емнай часткай місіі Касцёла ў свеце, вырашальным элементам гэтага працэсу ёсць распаўсюджванне Біблії дзякуючы каштоўнаму ўдзелу перакладаў яе на розныя мовы. У сувязі з гэтым трэба заўсёды памятаць, што пачатак перакладу Пісанняў «сягае часоў Старога Запавету, калі габрэйскі тэкст Біблії быў перакладзены вусна на арамейскую мову (*Нм* 8, 8. 12), а пазней пісьмова на грэцкую. Тлумачэнне па сутнасці ёсць заўсёды чымсьці большым, чым звычайная транскрыпцыя арыгінальнага тэксту. Пераход ад адной мовы да другой цягне за сабой неабходнасць змены культурнага кантэксту: паняцці не з'яўляюцца ідэнтычнымі, match рознае пасланне заключаецца ў сімвалах, бо звяртаецца да іншых традыцый мыслення і іншых спосабаў жыцця»[371].

Падчас сінадальных прац было сцверджана, што многія мясцовыя Касцёлы не маюць яшчэ поўнага перакладу Біблії на сваю мову. Колькі ж народаў адчувае сёння голад і прагу Божага слова, але на жаль не можа мець яшчэ шырокага доступу да Святога Пісання[372], як было заўважана на Другім Ватыканскім Саборы! Таму Сінод «лічыць, што важнай найперш з'яўляецца фармацыя спецыялістаў, якія займаюцца рознымі перакладамі Біблії»[373]. Заахвочваю да інвестыцый сродкаў у гэтую сферу. Асабліва хацеў бы прасіць падтрымаць працу Каталіцкай Біблійнай Федэрацыі, каб расла колькасць перакладаў Святога Пісання, а таксама каб яны былі шырока распаўсюджанымі[374]. З увагі на характар гэтай працы пажадана, каб яна была выканана, наколькі гэта магчыма, у супрацоўніцтве з рознымі Біблійнымі Таварыствамі.

*Божае слова пераўзыходзіць культурныя межы*

116. У дыскусіі пра адносіны паміж Божым словам і культурамі, сінадальны Сход палічыў адпаведным нагадаць, што дасведчылі першыя хрысціяне ад дня Пяцідзесятніцы (пар. *Дз* 2, 1-13). Божае слова здольнае пранікнуць у розныя культуры і мовы і ў іх выразіцца, але тое самае слова змяняе межы паасобных культур, ствараючы супольнасць розных народаў. Слова Пана заахвочвае нас імкнуцца да больш шырокай еднасці. «Пераадолеем межы нашага досведу і ўвойдзем у сапраўды уневерсальную рэчаіснасць. Уваходзячы ў еднасць з Божым словам, мы ўваходзім у еднасць з Касцёлам, які жыве Божым словам. <...> Яна з'яўляецца пераадоленнем межаў паасобных культур, каб адшукаць сябе ва універсальным вымярэнні, якое лучыць усіх, яднае ўсіх, робіць нас усіх братамі»[375]. Таму абвяшчэнне Божага слова патрабуе заўсёды, каб мы першымі здзейснілі новы

[371] PONTIFICIA COMMISSIO BIBLICA, *L'interpretazione della Bibbia nella Chiesa* (15 Aprilis 1993), IV, B: *Ench. Vat.*, 13, n. 3113.
[372] Пар. CONC. OECUM. VAT. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 22.
[373] *Propositio* 42.
[374] Пар. *Propositio* 43.
[375] BENEDICTUS XVI, *Homilia ad celebrationem Horae Tertiae, prima ineunte Generali Congregatione Synodi Episcoporum* (6 Octobris 2008): *AAS* 100 (2008), 760.

*exodus*, адмовіліся ад нашых мерак і абмежаваных уяўленняў, каб адкрыцца на прысутнасць Хрыста.

## БОЖАЕ СЛОВА І МІЖРЭЛІГІЙНЫ ДЫЯЛОГ

*Каштоўнасць міжрэлігійнага дыялогу*

117. Разумеючы, што Бог Айцец, Сын і Дух Святы ўстанаўліваюць дыялог з чалавецтвам, Касцёл лічыць, што ў абвяшчэнне слова асноўным чынам уваходзіць сустрэча і дыялог з усімі людзьмі добрай волі, таму імкнецца сёння да дыялогу з асобамі, якія належаць да розных рэлігійных традыцый, пазбягаючы формаў сінкрэтызму і рэлятывізму, кіруючыся ўказаннямі дэкларацыі Другога Ватыканскага Сабору *Nostra aetate*, развітымі навучаннем наступных Папаў[376]. Хуткі працэс глабалізацыі вядзе да таго, што мы жывём у блізкім кантакце з асобамі розных культур і рэлігій. Гэта добрая нагода для таго, каб паказаць, што праўдзівае рэлігійнае пачуццё можа ўмацоўваць сярод людзей адносіны паўсюднага братэрства. Вельмі важна, каб рэлігіі ў нашых часта секулярызаваных грамадствах фарміравалі менталітэт, які заўважае ва ўсемагутным Богу фундамент усялякага дабра, невычэрпную крыніцу маральнага жыцця, умацаванне глыбокага пачуцця паўсюднага братэрства.

У юдэйска-хрысціянскай традыцыі, напрыклад, выступае яркае сведчанне любові Бога да ўсіх народаў, якой ужо ў запавеце, заключаным з Ноем, Ён ахоплівае адным вялікім абдымкам, сімвалізаваным у «вясёлцы на аблоках» (пар. *Быц* 9, 13. 14. 16), і якой – згодна са словамі прарокаў – хоча сабраць у адну паўсюдную сям'ю (пар. *Іс* 2, 2 і наст.; 42, 6; 66, 18-21; *Ер* 4, 2; *Пс* 47 [46]). Сапраўды, сведчанне пра існаванне цеснай сувязі паміж адносінамі з Богам і этыкай любові да кожнага чалавека сустракаемся ў многіх рэлігійных традыцыях.

*Дыялог паміж хрысціянамі і мусульманамі*

118. Сярод розных рэлігій Касцёл з пашанаю глядзіць на мусульман. Яны звяртаюцца да Абрагама і аддаюць пашану Богу асабліва праз малітву, міласціну і пост. Сапраўды, у традыцыі ісламу ёсць шмат біблійных постацяў, сімвалаў і тэм[377]. Працягваючы ўзнёслую справу шаноўнага Яна Паўла ІІ, вельмі хачу, каб адносіны паміж хрысціянамі і мусульманамі, якія развіваліся цягам многіх гадоў,

---

[376] Сярод многіх дакументаў рознага тыпу ўзгадаем: IOANNES PAULUS II, Litt. enc. *Dominum et vivificantem* (18 Maii 1986): *AAS* 78 (1986), 809-900; *ён жа*, Litt. enc. *Redemptoris missio* (7 Decembris 1990): *AAS* 83 (1991), 249-340; *ён жа*, *Allocutiones et homiliae Assisii habitae occasione data* Diei orationis *pro pace die 27 Octobris 1986*: *Insegnamenti* IX, 2, (1986), 1249-1273; *Dies Orationis pro Pace Mundi* (24 Ianuarii 2002): *Insegnamenti* XXV, 1 (2002), 97-108; CONGREGATIO PRO DOCTRINA FIDEI, Decl. de unicitate et universalitate salvifica Iesu Christi et Ecclesiae *Dominus Iesus* (6 Augusti 2000): *AAS* 92 (2000), 742-765.

[377] CONC. OECUM. VAT. II, Decl. de Ecclesiae habitudine ad religiones non christianas *Nostra aetate*, 3.

грунтуючыся на даверы, развіваліся ў духу шчырага і поўнага павагі дыялогу[378]. Сінод выказаў спадзяванне, што дзякуючы гэтаму дыялогу будзе паглыблена павага да жыцця як галоўнай каштоўнасці, умацаваныя неад'емныя правы мужчыны і жанчыны, а таксама іх роўная годнасць. Зважаючы на адрозненне грамадска-палітычнага і рэлігійнага парадку, рэлігіі павінны рабіць свой уклад у агульнае дабро. Сінод просіць Канферэнцыі Біскупаў, дзе гэта адпаведна і карысна, дапамагаць у арганізацыі сустрэч, якія маюць мэту ўзаемнага пазнання хрысціянаў і мусульман, каб распаўсюджваць каштоўнасці, патрэбныя грамадству для мірнага і станоўчага суіснавання[379].

*Дыялог з іншымі рэлігіямі*

119. У гэтым кантэксце хачу таксама выказаць павагу Касцёла да старажытных духоўных традыцый розных кантынентаў, якія маюць каштоўнасці пашаны і супрацоўніцтва і могуць спрыяць паразуменню паміж людзьмі і народамі[380]. Часта сцвярджаем, што раздзяляем каштоўнасці, выражаныя таксама ў іх рэлігійных кнігах, як напрыклад, павага да жыцця, кантэмпляцыя, маўчанне і прастата ў будызме; пачуццё *sacrum*, ахвяры і пасты ў індуізме; а таксама сямейныя і грамадскія каштоўнасці ў канфуцыянстве. З задавальненнем назіраем, што таксама ў іншых рэлігіях надаецца значэнне трансцэндэнцыі Бога, які прызнаецца Стварыцелем, шанаванню жыцця, сужэнства і сям'і, а таксама моцнаму пачуццю салідарнасці.

*Дыялог і рэлігійная свабода*

120. Аднак дыялог не быў бы плённым, калі б не прадугледжваў таксама сапраўднай павагі кожнай асобы, дазваляючы ёй свабодна вызнаваць сваю рэлігію. Таму Сінод, заахвочваючы да развіцця супрацоўніцтва паміж прадстаўнікамі розных рэлігій, нагадвае адначасова пра тое, што «ўсім веруючым павінна быць гарантавана плённая свабода ў вызнаванні сваёй рэлігіі прыватна або публічна, а таксама свабода сумлення»[381]: сапраўды, «павага і дыялог патрабуюць <…> узаемнасці ва ўсіх сферах, асабліва ў тым, што датычыць асноўнай свабоды, асабліва рэлігійнай. Яны спрыяюць спакою і згодзе паміж народамі»[382].

---

[378] Пар. BENEDICTUS XVI, *Allocutio ad Legatos Nationum plerumque Macometanae doctrinae apud Sedem Apostolicam receptos* (25 Septembris 2006): *AAS* 98 (2006), 704-706.
[379] Пар. *Propositio* 53.
[380] Пар. *Propositio* 50.
[381] *Тамсама*.
[382] IOANNES PAULUS II, *Allocutio Albae Domi, in Marochio ad iuvenes muslimos habita* (19 Augusti 1985), 5: *AAS* 78 (1986), 99.

## ЗАКАНЧЭННЕ

*Канчатковае слова Бога*

121. На заканчэнне гэтых разважанняў, у якіх хацеў выказаць і паглыбіць багацце XII Звычайнага Агульнага Сходу Сіноду Біскупаў, прысвечанага Божаму слову ў жыцці і місіі Касцёла, хачу яшчэ раз заахвоціць увесь Божы народ, пастыраў, членаў Інстытутаў кансэкраванага жыцця, а таксама свецкіх, каб яны стараліся штораз лепш пазнаваць Святое Пісанне. Мы ніколі не павінны забываць, што падставай усялякай аўтэнтычнай і жывой хрысціянскай духоўнасці ёсць Божае слова, абвешчанае, прынятае, цэлебраванае і разважанае ў Касцёле. Гэтае ўмацаванне сувязі з Божым словам будзе мець тым большы размах, чым больш мы будзем разумець, што таксама ў Святым Пісанні, як і ў жывой Традыцыі Касцёла мы маем кантакт з канчатковым словам Бога пра сусвет і гісторыю.

Як паказвае Пралог св. Яна, усё, што існуе, ёсць пад знакам Слова. Слова выходзіць ад Айца, прыходзіць пасяліцца паміж сваімі і вяртаецца на ўлонне Айца, каб занесці з сабою ўсё стварэнне, якое ў Ім і праз Яго было створана. Касцёл жыве цяпер сваёй місіяй у неспакойным чаканні эсхаталагічнага аб’яўлення Абранніка: «А Дух і Нявеста кажуць: “Прыйдзі”» (*Ап* 22, 17). Але гэта не пасіўнае чаканне, а місійная патрэба абвяшчэння Божага слова, якое аздараўляе і адкупляе кожнага чалавека: і сёння ўваскрослы Езус кажа нам: «Ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню» (*Мк* 16, 15).

*Новая евангелізацыя і новае слуханне*

122. Таму наш час павінен станавіцца штораз больш часам слухання нанова Божага слова, а таксама часам новай евангелізацыі. Паўторнае адкрыццё таго, што Божае слова мае цэнтральнае значэнне ў хрысціянскім жыцці, дапамагае нам зноў адшукаць найглыбейшы сэнс таго, што з моцаю нагадаў папа Ян Павел II: надалей весці *missio ad gentes* і аддаць усе сілы *новай евангелізацыі*, асабліва ў тых краінах, дзе евангелізацыя забытая або сустракаецца з распаўсюджанай абыякавасцю ў выніку пашырэння секулярызацыі. Няхай Дух Святы абудзіць у людзях голад і прагненне Божага слова, а таксама пакліча адданых вестуноў і сведак Евангелля.

Па прыкладзе вялікага Апостала Народаў, які быў адноўлены пасля пачутага голасу Пана (пар. *Дз* 9, 1-30), мы таксама слухаем Божае слова, якое прамаўляе заўсёды да кожнага з нас асабіста тут і цяпер. Дзеі Апосталаў расказваюць нам, што Дух Святы выбраў Паўла разам з Барнабай, каб яны абвяшчалі і пашыралі Добрую Навіну. Няхай таксама сёння Дух Святы не перастае клікаць пераканаўчых і пераконваючых слухачоў і вестуноў слова Пана (пар. 13, 2).

*Слова і радасць*

123. Чым больш мы будзем аддаваць сябе Божаму слову, тым больш зможам сцвердзіць, што таксама сёння трывае ў Божым Касцёле таямніца Пяцідзесятніцы. Дух Пана надалей спасылае свае дары на Касцёл, каб мы былі прыведзеныя да ўсёй

праўды, адкрываючы перад намі сэнс Пісанняў і робячы нас верагоднымі вестунамі збаўчага слова ў свеце. І так вяртаемся да Першага Паслання св. Яна. У Божым слове таксама і мы пачулі, убачылі і дакрануліся да Слова Жыцця. Дзякуючы ласцы мы прынялі пасланне, што аб'явілася вечнае жыццё, таму прызнаём цяпер, што мы з'яднаныя паміж сабою, з тымі, хто апярэдзіў нас у знаку веры і з усімі, хто ва ўсім свеце слухае Божае слова, цэлебруе Эўхарыстыю і жыве сведчаннем любові. Гэтае пасланне было нам парададзена – нагадвае апостал Ян – каб «нашая радасць была поўнай» (*1 Ян* 1, 4).

Сінадальны Сход дазволіў нам адчуць тое, пра што кажа Янава пасланне: абвяшчэнне Слова стварае *еднасць* і вядзе да *радасці.* Гэтая радасць глыбокая, вынікае з самога трынітарнага жыцця і перададзена нам у Сыне. Гэтая радасць – гэта невыказны дар, якога свет не можа даць. Можна арганізаваць святы, але не радасць. Паводле Святога Пісання радасць – гэта дар Духа Святога (пар. *Гал* 5, 22), які дазваляе нам паглыбіцца ў слова і ўчыніць, каб Слова ўвайшло ў нас, прыносячы плады на жыццё вечнае. Абвяшчаючы ў моцы Духа Святога Божае слова, хочам дзяліцца крыніцай праўдзівай радасці, не павярхоўнай і часовай, але той, якая нараджаецца з разумення таго, што Пан Езус мае словы вечнага жыцця (пар. *Ян* 6, 68).

*«Mater Verbi et Mater laetitiae»*

124. Гэтая глыбокая сувязь паміж Божым словам і радасцю бачная менавіта ў Маці Божай. Нагадаем словы св. Альжбеты: «Шчаслівая тая, якая паверыла, што споўніцца сказанае Ёй Панам» (*Лк* 1, 45). Марыя – благаслаўлёная, бо мае веру, паверыла, і ў гэтай веры прыняла ў сваё ўлонне Божае Слова, каб даць Яго свету. Гэтая радасць, народжаная са Слова, можа цяпер ахапіць усіх, хто ў веры дазваляе перамяняць сябе праз Божае слова. Евангелле паводле св. Лукі паказвае нам у двух фрагментах гэтую таямніцу слухання і радасці. Езус кажа: «Маці Мая і браты Мае – гэта тыя, хто слухае слова Божае і выконвае яго» (8, 21). Чуючы заклік нейкай жанчыны з натоўпу, якая праслаўляла ўлонне, якое Яго насіла, а таксама грудзі, якія ссаў, Езус выяўляе сакрэт сапраўднай радасці: «Больш за тое, шчаслівыя, хто слухае слова Божае і захоўвае яго!» (пар. *Лк* 11, 28). Езус паказвае сапраўдную веліч Марыі, адкрываючы таксама перад кожным з нас шлях да таго благаслаўлення, якое нараджаецца з Божага слова, прынятага і рэалізаванага на практыцы. Таму нагадваю ўсім хрысціянам, што нашая асабістая і супольнасная сувязь з Богам паглыбляецца праз веданне Божага слова. Напрыканцы звяртаюся да ўсіх людзей, таксама да тых, хто аддаліўся ад Касцёла, пакінуў веру або ніколі не чуў закліку збаўлення. Кожнаму Пан кажа: «Вось стаю каля дзвярэй і стукаюся. Калі хто пачуе Мой голас і адчыніць дзверы, увайду да яго і буду вячэраць з ім, а ён са Мною» (*Ап* 3, 20).

Таму няхай кожны наш дзень фарміруецца праз паўторную сустрэчу з Хрыстом, Словам Айца, якое сталася целам: «Ён ёсць раней за ўсё, і ўсё трывае ў Ім» (*Клс* 1, 17). Суцішымся, каб слухаць слова Пана і разважаць над ім, каб дзякуючы плённаму дзеянню Духа Святога надалей яно прабывала і жыло ў нас праз усе дні нашага

жыцця і прамаўляла да нас. Так менавіта Касцёл надалей абнаўляецца і адраджаецца дзякуючы слову Пана, якое трывае навекі (пар. *1 П* 1, 25; *Іс* 40, 8). Такім чынам і мы зможам удзельнічаць у вялікім абранніцкім дыялогу, які заканчвае Святое Пісанне: «А Дух і Нявеста кажуць: "Прыйдзі". І хто чуе, няхай скажа: "Прыйдзі". <...> Той, хто сведчыць пра гэта, кажа: "Так, хутка прыйду". Амэн. Прыйдзі, Пане Езу» (*Ап* 22, 17).

*Дадзена ў Рыме, у Святога Пятра, 30 верасня 2010 г., ва ўспамін св. Гераніма, у шосты год Нашага Пантыфікату.*

BENEDICTUS PP. XVI

ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ [1]
Каб радасць нашая была поўнай [2]
Ад «*Dei Verbum* » да Сіноду, прысвечанага Божаму слову [3]
Сінод Біскупаў, прысвечаны Божаму слову [4]
Пралог Евангелля св. Яна, як праваднік [5]

Частка першая
*VERBUM DEI*

БОГ, ЯКІ ПРАМАЎЛЯЕ
Бог у дыялогу [6]
Аналогія Божага слова [7]
Касмічнае вымярэнне слова [8]
Стварэнне чалавека [9]
Рэалізм Слова [10]
Хрысталогія Слова [11-13]
Эсхаталагічнае вымярэнне Божага слова [14]
Божае слова і Дух Святы [15-16]
Традыцыя і Пісанне [17-18]
Святое Пісанне, натхненне і праўда [19]
Бог Айцец, крыніца і пачатак Слова [20-21]

АДКАЗ ЧАЛАВЕКА БОГУ, ЯКІ ПРАМАЎЛЯЕ
Пакліканне да Запавету з Богам [22]
Бог слухае чалавека і адказвае на яго пытанні [23]
Дыялог з Богам Яго словамі [24]
Божае слова і вера [25]

Грэх, як няслуханне Божага слова [26]
Марыя «*Mater Verbi Dei*» і « *Mater fidei*» [27-28]

ГЕРМЕНЕЎТЫКА СВЯТОГА ПІСАННЯ Ў КАСЦЁЛЕ
Касцёл – адпаведнае месца біблійнай герменеўтыкі [29-30]
«Душа святой тэалогіі» [31]
Развіццё біблійных даследаванняў і Настаўніцкі Інстытут Касцёла [32-33]
Саборная біблійная герменеўтыка: указанне, якое трэба прыняць [34]
Небяспека дуалізму і секулярызаваная герменеўтыка [35]
Вера і розум у падыходзе да Святога Пісання [36]
Даслоўны і духоўны сэнс [37]
Неабходнасць узнясення над «літарай» [38]
Унутраная еднасць Бібліі [39]
Сувязь паміж Старым і Новым Запаветам [40-41]
«Змрочныя» старонкі Бібліі [42]
Хрысціяне і юдэі адносна святых Пісанняў [43]
Фундаментальная інтэрпрэтацыя Святога Пісання [44]
Дыялог паміж пастырамі, тэолагамі і экзэгетамі [45]
Біблія і экуменізм [46]
Наступствы для вывучэння тэалогіі [47]
Святыя і інтэрпрэтацыя Пісання [48-49]

Частка другая
*VERBUM IN ECCLESIA*

БОЖАЕ СЛОВА І КАСЦЁЛ
Касцёл прымае Слова [50]
Пастаянная прысутнасць Хрыста ў жыцці Касцёла [51]

ЛІТУРГІЯ – ПРЫВІЛЕЯВАНАЕ МЕСЦА БОЖАГА СЛОВА
Божае слова ў святой Літургіі [52]
Святое Пісанне і сакрамэнты [53]
Божае слова і Эўхарыстыя [54-55]
Сакрамэнтальнасць слова [56]
Святое Пісанне і Лекцыянарый [57]
Абвяшчэнне Божага слова і паслуга лектараў [58]
Значэнне гаміліі [59]
Неабходнасць Гамілетычнай дырэкторыі [60]
Божае слова, паяднанне і намашчэнне хворых [61]
Божае слова і Літургія гадзінаў [62]
Божае слова і Бэнэдыкцыянал [63]
Меркаванні і канкрэтныя прапановы, якія датычаць літургічнай анімацыі [64]

а) Цэлебрацыя Божага слова [65]
б) Слова і маўчанне [66]
в) Урачыстае абвяшчэнне Божага слова [67]
г) Божае слова ў хрысціянскай святыні [68]
д) Выкарыстанне ў літургіі выключна біблійных тэкстаў [69]
ж) Літургічны спеў, натхнёны Бібліяй [70]
з) Асаблівы клопат пра невідушчых і глуханямых [71]

БОЖАЕ СЛОВА Ў ЖЫЦЦІ КАСЦЁЛА
Сустрэць Божае слова ў Святым Пісанні [72] . 123
Біблійная анімацыя пастырства [73]
Біблійнае вымярэнне катэхезы [74]
Біблійная фармацыя хрысціянаў [75]
Святое Пісанне падчас вялікіх касцёльных сустрэч [76]
Божае слова і пакліканні [77]
*а*) Божае слова і пасвячаныя распарадчыкі [78-81]
*б*) Божае слова і кандыдаты да пасвячэння [82]
*в*) Божае слова і кансэкраванае жыццё [83]
*г*) Божае слова і свецкія вернікі [84]
*д*) Божае слова, сужэнства і сям'я [85]
Малітоўнае чытанне Святога Пісання і «*lectio divina*» [86-87]
Божае слова і Марыйная малітва [88]
Божае слова і Святая Зямля [89]

Частка трэцяя
*VERBUM MUNDO*

МІСІЯ КАСЦЁЛА: АБВЯШЧЭННЕ БОЖАГА СЛОВА СВЕТУ
Слова ад Айца і да Айца [90]
Абвяшчаць свету «*Logos*» надзеі [91]
З Божага слова нараджаецца місія Касцёла [92]
Слова і Божае Валадарства [93]
Усе ахрышчаныя адказваюць за прапаведаванне [94]
Неабходнасць «*missio ad gentes*» [95]
Прапаведаванне і новая евангелізацыя [96]
Божае слова і хрысціянскае сведчанне [97-98]

БОЖАЕ СЛОВА І ЎДЗЕЛ У СВЕЦЕ
Служыць Езусу ў Яго «братах меншых» (*Мц* 25, 40) [99]
Божае слова і ўдзел у грамадстве на карысць справядлівасці [100-101]
Абвяшчэнне Божага слова, паяднанне і спакой паміж народамі [102]
Божае слова і дзейсная любоў [103]

Абвяшчэнне Божага слова і моладзь [104]
Абвяшчэнне Божага слова і эмігранты [105]
Абвяшчэнне Божага слова і церпячыя [106]
Абвяшчэнне Божага слова і ўбогія [107]
Божае слова і ахова стварэння [108]

БОЖАЕ СЛОВА І КУЛЬТУРЫ
Каштоўнасць культуры для жыцця чалавека [109]
Біблія, як вялікі культурны код [110]
Пазнаванне Бібліі ў школах і ва універсітэтах [111]
Святое Пісанне ў розных формах мастацтва [112]
Божае слова і сродкі сацыяльнай камунікацыі [113]
Біблія і інкультурацыя [114]
Пераклад і распаўсюджванне Бібліі [115]
Божае слова пераўзыходзіць культурныя межы [116]

БОЖАЕ СЛОВА І МІЖРЭЛІГІЙНЫ ДЫЯЛОГ
Каштоўнасць міжрэлігійнага дыялогу [117]
Дыялог паміж хрысціянамі і мусульманамі [118]
Дыялог з іншымі рэлігіямі [119]
Дыялог і рэлігійная свабода [120]

ЗАКАНЧЭННЕ
Канчатковае слова Бога [121]
Новая евангелізацыя і новае слуханне [122]
Слова і радасць [123]
«*Mater Verbi et Mater laetitiae*» [124]

© Copyright 2010 – Libreria Editrice Vaticana
© Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, 2010